Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”

# З В О Д
# ПОМНІКАЎ ВОІНСКАЙ СЛАВЫ, ПАМЯТНЫХ МЕСЦАЎ, ВОІНСКІХ ПАХАВАННЯЎ І ПАХАВАННЯЎ АХВЯР ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2021*

УДК 94(476.5):726.8:725.94"1941/1945"(03)
ББК 63.3(4Бел-4Вит)622я22+79.03я22
З-43

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 4 ад 18.02.2021.

Складальнік: настаўнік гісторыі Віцебскага кадэцкага вучылішча, кандыдат гістарычных навук, дацэнт **М.В. Півавар**

Р э ц э н з е н т ы :
загадчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.І. Корсак;*
галоўны спецыяліст упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Д.В. Юрчак*

**З-43** **Звод помнікаў воінскай славы, памятных месцаў, воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр Вялікай Айчыннай вайны Віцебскага раёна** / склад. М.В. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. – 134 с.

ISBN 978-985-517-788-4.

Даведачнае выданне змяшчае інфармацыю пра помнікі, памятныя месцы, воінскія пахаванні і магілы мірнага насельніцтва часоў Вялікай Айчыннай вайны, выяўленыя на тэрыторыі Віцебскага раёна на 2020 год. Матэрыял пра кожны аб'ект суправаджаецца фотаздымкам, каардынатамі, спісам выкарыстаных крыніц. Усяго разгледжана 285 аб'ектаў, з якіх 115 воінскіх пахаванняў і магіл ахвяр вайны, што знаходзяцца пад дзяржаўнай аховай. Даведнік будзе каштоўнай крыніцай у справе ўвекавечання падзей мінулай вайны для дзяржаўных органаў (аддзелаў культуры, адукацыі, па справах моладзі, ідэалогіі, ваенкаматаў), настаўнікаў і навучэнцаў адукацыйных устаноў, краязнаўцаў, удзельнікаў пошукавага руху, усіх неабыякавых да гісторыі краіны.

**УДК 94(476.5):726.8:725.94"1941/1945"(03)**
**ББК 63.3(4Бел-4Вит)622я22+79.03я22**

**ISBN 978-985-517-788-4**

© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021

## УВОДЗІНЫ

На працягу 1941–1944 гадоў Віцебскі раён быў арэнай жорсткіх баёў. Асабліва цяжкімі яны былі зімой–вясной 1944 года. На тэрыторыі раёна маецца 115 пахаванняў, звязаных з трагічнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. З іх воінскіх могілак – 3, брацкіх магіл – 79, індывідуальных – 30, пахаванняў ахвяр вайны – 7. У іх пахаваны 61853 чалавек, з іх невядомы імёны 2113[1].

Заплацілі крывавую даніну і жыхары Віцебскага раёна. У час карных экспедыцый гітлераўцы расстралялі, спалілі жывымі і закатавалі 8408 жыхароў Віцебскага раёна (у межах 1941 года)[2]. На прымусовыя работы вывезлі 4362 чалавекі, загінулі на франтах 5236 чалавек, і ў партызанскіх атрадах і ў падполлі – 2260 чалавек. На тэрыторыі былога Суражскага раёна, які значнай часткай увайшоў у склад сучаснага Віцебскага за перыяд часовай акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі былі знішчаны 6937 мірных жыхароў, вывезены на прымусовыя работы 3215 чалавек[3].

Чым большыя страты, тым больш каштоўная памяць. За 75 гадоў мірнага жыцця ў раёне ўзведзены сотні помнікаў для ўшанавання памяці пра герояў мінулай вайны. Асноўнымі дакументамі, якія накіраваны на ўвекавечанне памяці пра падзеі вайны, з’яўляюцца Указ Прэзідэнта № 109, пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Закон аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Аднак так склалася, што ахове дзяржавы падлягаюць толькі 116 аб’ектаў (115 пахаванняў, з якіх 27 з іх маюць статус гісторыка-культурных каштоўнасцяў і помнік «Віцебскія вароты» ў в. Заполле). Дзясяткі помнікаў, узведзеныя ў савецкія і ўжо нашы часы, не маюць ахоўнага статусу.

Галоўная ідэя і задача гэтага выдання – зрабіць улік усіх месцаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, і ўзяць іх пад надзейную ахову. Такімі месцамі, на нашу думку, з’яўляюцца: а) Воінскія пахаванні і пахаванні ахвяр вайны (і тыя, што ўзяты пад ахову, і тыя, што выяўлены, але пакуль не ахоўваюцца); б) Помнікі, мемарыяльныя шыльды, звязаныя з вайной і ўсталяваныя на памятных месцах: значных і жорсткіх баёў, здзяйснення подзвігаў, дзеяння партызанскіх атрадаў, падпольных органаў савецкай улады і КПБ(б), радзіме герояў і іншых; в) Сведчанні вайны рэшткі фартыфікацыйных збудаванняў (ДОТы, бліндажы, бункеры), траншэі, акопы і іншыя аб’екты на месцах былых баёў.

У выданні апісаны 285 аб’ектаў, выяўленых на 2020 год. Яны змешчаны па алфавітна-геаграфічным прынцыпе. Матэрыял пра кожны аб’ект суправаджаецца кароткай даведкай, фотаздымкам, каардынатамі, спісам выкарыстаных крыніц. У якасці дадаткаў змяшчаецца інфармацыя пра страчаныя на тэрыторыі раёна помнікі; вядомыя, але па розных абставінах не выяўленыя пахаванні (спадзяёмся, што ў будучым яны ўсё ж такі будуць знойдзены); помнікі ў вёсках, якія ўвайшлі ў склад г. Віцебска. Для зручнасці карыстання ў канцы змяшчаецца “Алфавітны спіс помнікаў і пахаванняў” і “Спіс аб’ектаў па сельскіх саветах”.

Выданне не прэтэндуе на ўсеахопнасць матэрыялу. Лепш даследавана тэрыторыя Вымнянскага, Заронаўскага, Мазалаўскага, Суражскага сельсаветаў. Калі воінскія пахаванні ў асноўным выяўлены, то пахаванняў ахвяр вайны ўзята на ўлік толькі 7, у якіх пахаваны некалькі сотняў чалавек. Пры тым, што ў раёне больш за 15 тысяч ахвяр вайны, а ў кнізе “Памяць” змешчаны імёны не больш за 4 тысяч.

Праца па выяўленні і ўвекавечанні не завершана і будзе працягвaецца. Лічба выяўленых помнікаў, пахаванняў, памятных месцаў будзе павялічвацца, асабліва ахвяр вайны.

Выданне носіць навукова-папулярны характар і накіравана на перадачу памяці наступным пакаленням аб падзеях вайны, папулярызацыі ведаў пра яе, выхаванне патрыятызму, гістарычнай памяці, недапушчэння перагляду вынікаў Другой сусветнай вайны.

Вялікі дзякуй усім жыхарам раёна, старшыням сельскіх саветаў, якія дапамаглі звесткамі пры падрыхтоўцы выдання. Асаблівую падзяку выказваем за прадстаўленыя матэрыялы В.М. Марозаву, Л.К. Нікіцінай, Л.Н. Бруевай, А.А. Бурдо, З.Н. Касянок, Н.І. Шчукінай, Н.Л. Ларковай, У.П. Каханку, С.У. Нікалаенку, работнікам Віцебскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея (А. Астроўскаму, В. Васілеўскай, А. Пішчулавай), а таксама ўдзячны дырэктару Віцебскага кадэцкага вучылішча С.М. Лагвіненку, адміністрацыі, кадэтам установы і іншым.

[1] Сводная учетная ведомость воинских захоронений и захоронений жертв войн на территории Республики Беларусь по Витебскому району на 2019 г. [Электронный документ] // Витебский район, 2019. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

[2] НАРБ. – Ф. 4683. – Воп. 3. – Спр. 749. Арк. 134–135.

[3] ДАВВ. – Ф. 1778. – Воп. 3. – Спр. 2. – Арк. 5–6.




**ПОМНІКІ ВОІНСКАЙ СЛАВЫ, ВОІНСКІЯ ПАХАВАННІ І ПАХАВАННІ АХВЯР ВАЙНЫ, ПАМЯТНЫЯ МЕСЦЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**

## в. АКЦЯБРСКАЯ, цэнтр сельсавета

**Мемарыяльны знак у гонар 293-га артылерыйскага палка Рэзерва Галоўнага камандавання.** 14.07.1941 г. калона, якая складалася з 12 гармат калібра 152 мм, выходзячы з акружэння, абстраляла захоплены да таго часу нямецкімі фашыстамі аэрадром, нанёсшы значную шкоду ворагу. Мемарыяльны знак з граніту ўсталяваны каля будынка Акцябрскага сельсавета ў 2014 г.

**К.: 55°07’44.5”N 30°15’49.0”E.**




**Алея памяці імя Героя Савецкага Саюза Пятра Васільевіча Шысцерава.** Закладзена 17.04.2019 г. уздоўж шашы Віцебск – Масква. На пачатку ўсталяваны мемарыяльны камень.

**К.: 55°07’50.9”N 30°15’52.9”E.**



## в. АЛЬГОВА, Бабініцкі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4389).** У цэнтры вёскі, на перакрыжаванні вул. Цэнтральнай і Садовай. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 450 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Адпаведна СУВВЗ, тут пахаваны толькі 38 салдат, з іх вядомы імёны 37. У 1964 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам на вялікім пастаменце, абкладзеным дзікім каменем. У 2016 г. праведзена замена пліт. Маецца металічная агароджа. Пахаванне мае статус ГКК.

**К: 55°13'33.3"N 30°12'42.1"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 180; пашпарт ВП № 4389.*



## в. АРЭХІ, Суражскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4442).** На заходняй ускраіне вёскі. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 105 воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Па ўдакладненых дадзеных, у магіле пахаваны 132 савецкія салдаты (СУВВЗ). У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**К: 55°26'55.2"N 30°49'24.5"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 180; пашпарт ВП № 4442.*



## в. АРЭШАНКІ, Задуброўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4405).** На заходняй ускраіне вёскі, на грамадзянскіх могілках. Бетонны абеліск з металічнай зоркай быў пастаўлены ў 1957 г. У 2010-я гг. на сродкі аднаго са сваякоў была ўзведзена стэла з чорнага граніту з накладной зоркай з сярпом і молатам з чырвонага граніту. На ёй увекавечаны імёны 45 салдат, якія загінулі 17.11–26.12.1943 г. Насупраць помніка бетонны надмагільны помнік, накрыты гранітнай плітой. Маецца бетонная агароджа. Пахаваны 12 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

Па звестках Аскара Чапаевіча Шаймагамбетава з г. Паўладар (Казахстан), які прапрацаваў дадзеныя 334-й сд, у магіле пахаваны 32 савецкія салдаты.

**К: 55°23'18.3"N 30°42'39.9"E.**



*Абеліск. 1957*



*Сучасны выгляд помніка*

## в. АРЭШАНКІ, Задуброўскі сельсавет

**Магіла Таланава Мікалая Пятровіча (№ 4406).** На полі, за 0,3 км на паўднёвы захад ад вёскі. Металічны абеліск з нержавеючай сталі з зоркай наверсе. Маецца фотаздымак і шыльда з надпісам: "Таланов Николай Петрович 1902–12.XII.1943 г".

Па звестках АБД "Мемарыял", радавы 1122-га сп 334-й сд М.П. Таланаў загінуў 16.12. 1943 г. у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**К: 55°23'08.0"N 30°43'18.1"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 193; СУВВЗ; пашпарт ВП № 4406; Таланов Н.П. // ОБД "Мемориал" https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=54816368.*



## в. АСІНАЎКА, Шапечынскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4444).** У цэнтры вёскі, каля будынка сярэдняй школы. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 831 воін 5-га гв. стралковага корпуса 39-й арміі 3-га Беларускага фронту, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у чэрвені 1944 г. У 1961 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна, які трымае ў руках вянок. На пастаменце тэкст: "Вечная слава и память воинам, павшим в боях за Социалистическую Родину в Великой Отечественной войне 1941–1945 г.г. Сооружен в 1961 г.". У 2013 г. пастаўлены новыя пліты з імёнамі пахаваных. Пахаванне мае статус ГКК.

**К: 54°56'09.6"N 30°20'21.9"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 180; пашпарт ВП № 4444.*



## в. АСТРАЎСКІЯ, Курынскі сельсавет

**Месца базіравання штаба 1-й Беларускай партызанскай брыгады.** У лясных масівах каля вёскі з красавіка да кастрычніка 1943 г. базіравалася 1-я Беларуская партызанская брыгада. Камандзіры брыгады – М.П. Шмыроў, Я.З. Захараў, камісары – Р.У. Шкрэда, Ц.Р. Кавалеўскі. У в. Галевічы знаходзіўся партызанскі аэрадром, дзе прызямляліся самалёты 105-га гвардзейскага авіяпалка, які абслугоўваў партызан Суражскай зоны. У 1975 г. на ўшанаванне памяці народных мсціўцаў у цэнтры вёскі ўстаноўлены памятны знак.

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 180–181; пашпарт ВП № 4415.*



**Помнік партызанам Вялікай Айчыннай вайны.** Ва ўрочышчы Паўлавічы, 12 км на поўнач ад в. Астраўскія. Каля лясной дарогі Астраўскія – Селязні (Гарадоцкі раён). Бетонны абеліск на падмурку з барэльефам пяціканцавой зоркі. Маецца металічная агароджа з ланцугоў на 4-х металічных слупах. На металічнай шыльдачцы надпіс: “Здесь в урочище Павловичи партизаны 1-й Белорусской им. Ленинского комсомола и 1-й Витебской бригад с 1 по 6.III. 1943 года вели упорные бои с превосходящими силами немецко-фашистских оккупантов и нанесли им сокрушительный удар. Вечная слава партизанам, павшим в боях за Родину”. Узведзены ў 1976 г. 27.09. 1991 г. быў абвешчаны помнікам гісторыі і культуры.

**К: 55°31’51.4”N 30°34’33.2”E.**

*Літ. і К.: Памятник партизанам Великой Отечественной войны. 1976 г. Урочище “Павловичи” севернее д. Островские, Куринский сельсовет // Решение исполнительного комитета Витебского областного Совета народных депутатов от 27 сентября 1991 г. № 247 // О дополнении государственных списков недвижимых памятников истории и культуры местного значения // http://bii.by/tx.dll?d=49521.*



**Брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму (№ 4415).** Каля школы. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 195 воінаў, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У СУВВЗ на ўліку толькі 109 салдат, з іх вядомы імёны 90.

Гітлераўскае камандаванне ў красавіку – маі 1943 г. праводзіла карную аперацыю супраць партызанскіх атрадаў. Партызаны адбілі наступленне карнікаў, нанеслі ім значныя страты ў жывой сіле і тэхніцы, перайшлі ў контрнаступленне і адкінулі ворага за Заходнюю Дзвіну. Пры адступленні гітлераўцы палілі вёскі, забівалі мірных жыхароў, рабавалі маёмасць. У в. Астраўскія яны расстралялі жанчын, дзяцей, старых, вёску спалілі.

У 1965 г. у брацкую магілу ахвяр фашызму перанесены астанкі воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі пры вызваленні населеных пунктаў калгаса “XXI партз’езд”. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**К: 55°26’31.2”N 30°36’32.6”E.**

*Абеліск 1964 г.*








## в. БАБІНІЧЫ, цэнтр сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4388).** У цэнтры вёскі. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 2527 савецкіх салдат. У СУВВЗ на ўліку толькі 1662 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. З іх 1558 – ваеннаслужачыя, 4 – удзельнікі супраціўлення.

У 1964 г. на магіле пастаўлена трохмятровая стэла з невялікай зоркай наверсе і скульптурай воіна, які схіліўшы калена, апусціў сцяг да зямлі, аддаючы павагу загінуўшым. Па п'едэстале, абкладзеным дзікім каменем, мармуровая шыльда з прысвячэннем: “Они пали смертью храбрых за свободу и независимость великой Родины. 1941–1945”. У 2014 г. праведзены рамонт. Па баках ад асноўнага манумента ўсталяваны вертыкальныя пліты з чорнага граніту з імёнамі пахаваных воінаў. Далей па баках ляжаць металічныя пліты з імёнамі загінуўшых. Фасадная частка пахавання мае бетонную агароджу, абкладзеную чорным гранітам з надпісам: “Никто не забыт, ничто не забыто”. На ўваходзе на сімвалічных слупах лічбы “1941–1945”. Помнік і пахаванне маюць статус ГКК.

**К: 55°15'41.1”N 30°21'09.7”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 181; Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984; пашпарт ВП № 4388.*

**Індывідуальная магіла (№ 5716).** Прозвішча невядома. Па бетонным абеліску ўсталявана шыльда: “Месца гібелі партызана”. Па непацверджаных звестках, пахаваны салдат волга-татарскага батальёна, які перайшоў на бок партызан.

**К: 55°15'41.1”N 30°21'09.7”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 5716.*

*Помнік. 1964*



*Сучасны выгляд помнікаў*





**Радзіма Курыленкі Уладзіміра Цімафеевіча.** Герой Савецкага Саюза У.Ц. Курыленка нарадзіўся 25.12.1924 г. Член ВЛКСМ з 1938 г. У 1941 г. закончыў 9 класаў Веліжскай сярэдняй школы Смаленскай вобл. З першых дзён вайны актыўна ўключыўся ў барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў, збіраў зброю і перадаваў яе партызанам, арганізоўваў дыверсіі на дарогах. З лютага 1942 г. партызан атрада І.Р. Шлапакова, які дзейнічаў на тэрыторыі былога Каспалянскага р-на Смаленскай вобл., У.Ц. Курыленка знішчыў каля 1000 салдат і афіцэраў ворага, пусціў пад адхон 4 нямецкія эшалоны, узарваў чыгуначны мост. 14.05.1942 г. у няроўным баі з фашысцкімі карнікамі быў смяротна паранены. 01.09.1942 г. У.Ц. Курыленку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. На ўшанаванне яго памяці ў Смаленску пастаўлены помнік.

У 2020 г. на будынку Бабініцкай школы ўсталявана гранітная шыльда.

**К.: 55°15’42.3”N 30°21’10.8”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 181.*




**Помнік вучням і настаўнікам.** Каля школы. На ўшанаванне памяці 136 настаўнікаў і былых вучняў школы, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, ў 1968 г. насыпаны курган і пастаўлены высокі бетонны абеліск з металічнай зоркай на вялікім пастаменце. На абеліск накладзены барэльеф ордэна Айчыннай вайны. Насупраць помніка ў бетоннае ложа ўмуравана шыльда з прысвячэннем: “Люди! Покуда сердца стучатся, помните, какою ценою завоевано счастье, пожалуйста, помните!”.

**К: 55°15’50.1”N 30°21’15.5”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 181.*




**Мемарыяльная шыльда ў гонар Васілеўскага Ягора Васільевіча.** Шыльда з інфармацыяй пра славутага земляка змешчана на будынку школы. Ураджэнец в. Гарбачова Бабініцкага с/савета Я.В. Васілеўскі нарадзіўся ў сялянскай сям’і. Прызваны на службу ў РККА, быў накіраваны ў Адэскую ваенна-авіяцыйную школу. У 1940–1942 гг. з’яўляўся лётчыкам-інструктарам Сталінградскай ваенна-авіяцыйнай школы. З 1943 г. на фронце. З лістапада 1944 г. гв. капітан Я. Васілеўскі камандаваў эскадрылляй 151-га гв знішчальнага авіяпалка 2-га Украінскага фронту. За гады вайны здзейсніў 262 баявыя вылеты, браў удзел у 68 паветраных баях, у якіх збіў 25 самалётаў. 15.05.1946 г. за «образцовое выполнение заданий командования и проявленные мужество и героизм в боях с немецкими захватчиками» быў узнагароджаны званнем Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны працягваў службу ва Узброеных сілах СССР. У 1958 г. звольнены ў запас у званні падпалкоўніка. Узнагароджаны 4 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Аляксандра Неўскага, 2 ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі.

У 2020 г. Бабініцкай СШ Віцебскага раёна нададзена імя Героя Савецкага Саюза Я.В. Васілеўскага.

**К.: 55°15’42.3”N 30°21’10.8”E.**



## в. БАБІНІЧЫ, цэнтр сельсавета

**Памятны знак на месцы калодзежа, у які фашысты скідвалі закатаваных патрыётаў.**

У цэнтры вёскі, на тэрыторыі бабініцкай СШ. На месцы калодзежа ўтвораны сімвалічны зруб, выкладзены з сілікатнай цэглы і бетонны абеліск з мемарыяльнай шыльдай з тэкстам: “Колодец, в который фашисты сбрасывали замученных патриотов”.

**К: 55°15’50.1”N 30°21’15.5”E.**



**Сад Перамогі.** Каля школы. Пасаджаны ў 1965 г. у азнаменаванне 20-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У 1965 г. у садзе ўстаноўлены памятны знак: мармуровая шыльда на металічнай стойцы. На шыльдзе надпіс: “Сад Победы. Посажен коллективом школы в ознаменование 20-летия Победы Советского народа в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.”

**К: 55°15’50.1” 30°21’15.5”.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 181.*




## в. БАЛЬШУХІ, Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 4460).** У цэнтры вёскі, каля д. № 5 па вул. Партызанскай. У 1953 г. пастаўлены бетонны абеліск з металічнай зоркай і 9 сімвалічных надмагільных помнікаў і невялікіх абеліскаў на іх. У 2015 г. праведзена рэканструкцыя пахавання. Усталяваны невысокая стэла з чорнага граніту, якая заканчваецца абрысамі зоркі ўверсе і тэкстам. Насупраць 6 надмагільных помнікаў з плітамі з чорнага граніту з імёнамі пахаваных. Ёсць персанальны надмагільны помнік В.І. Віхрачову. Маецца металічная агароджа. Пахаванне мае статус ГКК.

На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 1071 савецкі воін і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ўліку ў СУВВЗ лічыцца толькі 613 воінаў і партызан, імёны ўсіх вядомы. Лічыцца, што тут пахаваны Герой Савецкага Саюза Пацёмкін Генадзь Фёдаравіч, які перапахаваны ў в. Веляшкавічы Лёзненскага раёна. У 2018 г. на могілкі перапахаваны 2 невядомыя салдаты.

**К: 55°12’11.5”N 30°38’13.6”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4460; СУВВЗ; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4460.html.*



**Магіла сям'і Кузьміных.** Пахаванне знаходзіцца між д. 9 і 11 па вул. Партызанскай, за агароджай участка. Зімой 1942 г. расстраляны паліцаямі муж і жонка: Кузьмін Васіль Канстанцінавіч, 1900 г.н. калгаснік калгаса імя Будзённага; жонка В.К. Кузьміна.

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 85, 86. Спіс загінуўшых жыхароў Котаўскага с/савета; https://kas954.blogspot.com/2017/10/blog-post_17.*



## в. БАРАЎЛЯНЫ, Мазалаўскі сельсавет

**Месца загубы савецкіх ваеннапалонных і месца былога фашысцкага канцлагера.** У 1941–1942 гг. каля в. Бараўляны, у комплексе будынкаў былой паштовай станцыі, які да вайны займала арганізацыя Учдор № 756 (зараз ГКК "Паштовая станцыя ўзору 1842 г."), фашысты размясцілі савецкіх ваеннапалонных. У лагеры ўтрымліваліся каля 250 чалавек. Зняволеныя займаліся рамонтам шашы Віцебск – Гарадок. Па аповядам мясцовых жыхароў, шмат ваеннапалонных памерла ад непасільнай працы, голаду, хваробаў. Іх целы выкідвалі на балота, якое знаходзілася за будынкамі паштовай станцыі. Пасля вайны ў выніку меліярацыі поле асушылі і выкарыстоўвалі для вырошчвання сельскагаспадарчых культур. Часта пры ўзворванні глебы траплялiся чалавечыя астанкі.

Варта ўвекавечыць месца былога канцлагера шляхам усталявання мемарыяльнай шыльды на будынку былой станцыі.

**К.: 55°18'57.1"N 30°06'05.8"E.**

*Літ. і К.: НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 33а. Спр. 154. Арк. 134; Ф. 378. Воп. 1. Спр. 95. Арк. 2; Лагеря советских военнопленных в Беларуси 1941–1944: справочник / авт.-сост. В.И. Адамушко [и др.]. – Мн.: НАРБ, 2004. – С. 99–101 [Лагеря военнопленных с неустановленными классификационными признаками]; успаміны мясцовых жыхароў.*



**Мемарыяльныя крыжы на месцы гібелі мірных жыхароў.** Драўляны крыж пастаўлены ў снежні 2015 г. на ўскраіне бараўлянскіх грамадзянскіх могілак актывістамі ГА "Хайсы" на месцы, дзе ў гады вайны фашысты расстралялі некалькі мірных жыхароў.

На драўляным крыжы шыльда з надпісам: "На гэтым месцы нямецка-фашысцкія захопнікі расстрэльвалі ваеннапалонных, партызан і мірных грамадзян пад час Другой сусветнай вайны ў 1942–1943 гадах. Вечная памяць і павага загінуўшым".

На металічным крыжы, які ўстаноўлены 22.06.2018 г., шыльда з тэкстам: "КРЫЖ усталяваны ў памяць аб ваеннапалонных лагера Учдор-756, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941–1944 гг. Вечная ім памяць!".

**К.: 55°18'53.2"N 30°06'24.8"E.**

*Літ. і К.: Сведчанні Ю.П. Ісачэнка, Л. Сухадольскай.*





## в. БАРАНАЎКА, Мазалаўскі сельсавет

**Магіла Багданава Аляксея Герасімавіча (№ 7873).** Знаходзіцца на полі, за 200 м на ўсход ад шашы Віцебск – Гарадок. Металічная піраміда з чырвонай зоркай. На металічнай шыльдзе надпіс “Богданов Алексей Герасимович 3.IV.1905–10.III.1942 г.”. Магіла мае металічную агароджу.

Па звестках мясцовых жыхароў, помнік пастаўлены на месцы расстрэлу і пахавання А.Г. Багданава, які быў настаўнікам (мірны жыхар, западозраны ў сувязях з партызанамі).

**К.: 55°19’40.7”N 30°05’43.6”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 7873; успаміны мясцовых жыхароў.*



## в. БАРОНІКІ, Ноўкінскі сельсавет, з 2011 г. у складзе Першамайскага раёна г. Віцебска

**Доўгачасовыя агнявыя кропкі.** Доўгачасовыя агнявыя кропкі (ДОТ), рабіліся з бетону і стальных рэек. Мелі вузкія амбразуры для вядзення агню з кулямётаў. Усталёўваліся на найбольш небяспечных участках фронту. Іх існавала некалькі тыпаў. Два нямецкія ДОТы знаходзяцца на верхняй пляцоўцы гарадзішча Баронікі (К.: 55°09’04.9”N 30°11’40.1”E). Яшчэ некалькі іншага варыянта – з бронекалпаком на рэйцы, які дазваляў весці абстрэл на 360º, знаходзяцца на левым беразе р. Лучоса каля садовага таварыства.

**К: 55°08’46.2”N 30°11’37.2”E.**



*ДОТ тыпу тобрук на беразе р. Лучоса. 2018*



*ДОТ на гарадзішчы. 2018*

## в. БАРЫШЫНА, Акцябрскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 5714).** Бетонны абеліск мае гранітную ўстаўку, на якую нанесены тэкст: “Их имена безымянные, но память о них будет вечна. Воинам Советской Армии от коллектива крестьянского хозяйства «Панакс». Места каля помніка выкладзена пліткай, на якой зроблены два сімвалічныя надмагіллі. Пахаваны 50 савецкіх салдат, якія загінулі пры вызваленні раёна. Імёны 8-мі з іх вядомыя.

**К: 55.09781966 30.30869365.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 5714.*



## в. БУДЗЯНКА, Суражскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4440).** На заходняй ускраіне вёскі. Каля былых яўрэйскіх могілак. У 1964 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна, які трымае вянок, ушаноўваючы памяць аб загінуўшых таварышах.

Пахаваны 91 воін і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

У гады вайны ў гэтым месцы фашысты знішчалі грамадзянскае насельніцтва і партызан. Побач з помнікам яшчэ некалькі пахаванняў партызан, мірных грамадзян, кенатаф сям'і Кац і іншых асоб (гл. арт. "Сураж. Магіла ахвяр гета". – С. 88).

**К.: 55°24'09.9"N 30°44'19.9"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 182.*



## в. БУЕВА, Бабініцкі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 2294).** На грамадзянскіх могілках. Пахаваны воіны асобнага атрада А.С. Пятрова і партызаны атрадаў М.П. Машкова, А.А. Пагарэлава 1-й Беларускай партызанскай брыгады (15 чалавек), якія загінулі 24.08.1943 г. у баі супраць гітлераўскіх карнікаў у Буеўскім лесе. Усяго пахавана 63 чалавекі, з іх 4 – ахвяры вайны. Вядомы імёны 14-ці асоб.

У 1970 г. узведзены бетонны абеліск з зоркай. У 1981 г. на магіле ўстаноўлены мемарыяльны знак – бетонная сцяна, падзеленая на дзве часткі з лічбамі 1941 і 1945 г. З правага боку сцяна з тэкстам: "Вечная память партизанам отрядов Погорелова А.А., Машкова М.М., Петрова А.С., павшим в кровопролитном бою с немецко-фашистскими карателями 24 августа 1943 года". Па абодвух баках створаны сімвалічныя надмагільныя помнікі. На двух з іх шыльды з імёнамі вядомых пахаваных. Побач некалькі абеліскаў на магілах з перапахаваннямі пазнейшых часоў.

**К: 55°20'35.6"N 30°24'37.5"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 182; пашпарт ВП № 2294.*




Каля брацкай магілы № 2294 знаходзяцца яшчэ некалькі пахаванняў.

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** У 1997 г. перапахаваны мірныя жыхары в. Кавалёва, забітыя фашыстамі.

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** 23.04.1997 г. перапахаваны 14 воінаў РККА, знойдзеныя ў выніку раскопак у Вымнянскім сельсавеце.

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** 11.10.1998 г. перапахаваны 8 воінаў РККА, якія загінулі каля в. Казанава і 23 жыхары в. Буёва, расстраляныя ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

*Абеліск у Буёва. 1970*



*Брацкія пахаванні ў Буёва. 1997–1998 гг.*



## в. БУДЗІСЛАВА, Курынскі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 6674).** На беразе р. Дзвіна, за 0,5 км ад дарогі Віцебск – Тарасенкі, паварот да воінскага пахавання каля д. № 36 па вул. Цэнтральнай. Абеліск з мармуровай крошкі з устаўкай з чорнага колеру і тэкстам: “Большакова Валентина; Большакова Матрена Михайловна, Большакова Татьяна, Большаков Николай, Большаков Михаил Афанасьевич, Большаков Петр Михайлович. Вечная память”. Побач бетонны надмагільны помнік з мармуровай плітой і тэкстам: “Здесь похоронена партизанская семья: Большаков Михаил Афанасьевич р. 1888 г., дочь Матрена р. 1917 г. с детьми Валей 3 г. и Николаем 7 м., дочь Татьяна 1927 г. и сын Петр 1930 г. Зверски убитые немцами 14 июня 1942 г. Память от сына и брата Николая”. Магіла мае металічную агароджу, выкаваную да рэвалюцыі. Побач з пахаваннем некалькі металічных крыжоў.

**К: 55°24’39.0”N 30°29’14.7”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ПАВ № 6674.*



## в. БУЯНЫ, Мазалаўскі сельсавет

**Магіла ахвяры вайны (1941 г.).** На левым беразе р. Храпаўлянка, за 400 м ад дарогі з Буяноў на Храпавічы (ад складоў і КЗС), за 15 м ад лясной дарогі.

По сведчаннях Марыі Каралько, па аповедах яе маці і старажылаў, у гэта месца на пачатку вайны немцы прывезлі тры машыны людзей і расстралялі. Расстрэльвалі паліцаі. В.Ф. Брыкава расказвала, што там у гады вайны пахавалі “вольных” (грамадзянскіх, не ваенных) людзей.

Пасля вайны на магілу прыязджалі дзве жанчыны. Там паставілі драўляны крыж, абгарадзілі. У 2010-я гг. паставілі металічны крыж, металічную агароджу.

У верасні 2020 г. салдаты 1-й роты 52 ПСРБ правялі тут раскопкі. У магіле быў знойдзены 1 шкілет чалавека. Ляжаў роўна, толькі левая рука падвернута. З адзення толькі штаны, быў босы. Знайшлі толькі ключык металічны, верагодна, ад куфара невялікага, пражку (як на салдацкім трэнчыку), гільзу ад пісталета ТТ са сцёртай тыльнай часткай, па якой вызначыць год не ўдалося. Кулі не знайшлі, чэрап пашкоджаны. Магчыма, стралялі ва ўпор. Вайскоўцы лічаць, што, магчыма, тут быў пахаваны савецкі ваеннапалонны, якога расстралялі немцы ў 1941 г.

**К.: 55°19’59.5”N 30°07’05.6”E.**



*Літ. і К.: Мельнікаў А. Каб не было безіменных магіл // Віцебскія весці. – 2018. – 24 ліст. – С. 13; успаміны Марыі Каралько; успаміны В.Ф. Брыкавай, успаміны М. Баранавай.*

**Магіла ахвяры вайны.** На паўночна-усходняй ускраіне вёскі. Жыхар вёскі Буяны Сцяпанаў Раман забіты немцамі каля ўласнага дома. Там і пахаваны. Магіла мае драўляную агароджу, помніка няма.

**К.: 55°20’17.9”N 30°06’03.8”E.**

*Літ. і К.: Інфармацыю прадставіла ўнучка – Ястрабава Людміла Сцяпанаўна са слоў цёткі Сцяпанава Ірыны Раманаўны, дачкі забітага, якая з’яўлялася сведкай падзей.*



**Магіла Вітвіцкага Сямёна Андрэевіча (№ 7875).** Знаходзіцца за 200 м ад чыгуначнай лініі, насупраць 5-га пікета 548 км на ўчастку Невель – Віцебск. Чырвонаармеец-падрыўнік 14-га вждб (восстановительного железнодорожного батальона) 6-й чыгуначнай брыгады загінуў пры правядзенні размініравання ўчастка работ 26.06. 1944 г.

**К.: 55°20’40.8”N 30°05’17.5”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 7875; успаміны мясцовых жыхароў; “Память народа”.*



# В



## в. ВАЛАСОВА, Ноўкінскі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 4438).** У цэнтры вёскі. Пахавана 100 савецкіх салдат. Вядомы імёны 4 з іх: П.К. Дземашчук, В.А. Жукаў, М. Рашатняк, М.Ц. Сычоў Асобныя шыльдачкі размешчаны на ст. л-т М.П. Блахіна. Асобная шыльда ёсць і на Андрэя Іванавіча Малініна, 1912 г.н., астанкі якога былі знойдзены на агародзе В.П. Вінаградавай і перапахаваны ў магілу.

У 1967 г. на пахаванні была ўзведзена стэла і помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На мармуровай шыльдзе тэкст: “Светлой памяти наших земляков, отдавших жизнь в боях за Родину. Вы будете вечно жить в памяти народной”. Ніжэй на шыльдзе з бляхі размешчаны прозвішчы 79 жыхароў вёсак Валасова, Перавоз, Паўлючонкі, Пароцькава, Старынкі, якія загінулі ў гады вайны.

**К: 55°04’34.6”N 30°13’04.5”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 182–183; сведчанні Н.Л. Ларковай.*



## в. ВАРАШЫЛЫ, Заронаўскі сельсавет

**Памятны знак на месцы гібелі экіпажа самалёта ІЛ-2.** За 0,5 км на захад ад вёскі, каля дарогі Віцебск – Заронава. На бетоннай аснове ўсталяваны абчэсаны з аднаго боку валун, да якога прымацавана металічная шыльда з надпісам: “Здесь, 5.01.1944 г. при штурме немецкой артиллерии погиб экипаж самолета ИЛ-2 949 ШАП 211 ШАД, совершивший огненный таран летчик л-т Быковский Д.Ф., воздушный стрелок Надымов И.Е.”. Вышэй размешчаны здымак экіпажа. Знак устаноўлены ў 1999 г. па ініцыятыве Б.Я. Леганькова.

6 студзеня 1944 года ў складзе групы экіпаж малодшага лейтэнанта Дзмітрыя Фаміча Быкоўскага і стралка малодшага сяржанта Івана Яфімавіча Надымава выляцеў на падаўленне артылерыйскіх і мінамётных батарэй. У час выхаду на цэль самалёт быў падбіты і загарэўся. Пілот накіраваў сваю машыну на пазіцыі варожых войск у раёне в. Варашылы.

**К: 55°16’39.0”N 29°57’41.7”E.**



## в. ВАРОНЫ, цэнтр сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4391).** У цэнтры вёскі, каля шашы Віцебск – Смаленск. У 1985 г. лічылася, што тут пахаваны 3582 воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Па звестках СУВВЗ, тут ляжаць 7889 байцоў, імёны ўсіх вядомы. Сярод пахаваных – воіны 158-й стралковай дывізіі 84-га стралковага корпуса 39-й арміі. У 1956 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура двух воінаў са сцягам, у 1964 г. устаноўлены мемарыяльныя дошкі з імёнамі загінуўшых. У 2014–2015, 2018 гг. праведзены рамонт, усталяваны новыя пліты з імёнамі пахаваных. Пахаванне мае статус ГКК.

**К: 55°09’03.1”N 30°23’37.2”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 183; пашпарт ВП № 4391.*



**Помнік землякам.** У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 167 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1966 г. насыпаны курган, на якім размешчана мемарыяльная дошка з надпісам-прысвячэннем: “Бессмертной памяти героев-земляков, погибших в Великой Отечественной войне. 1941–1945 гг.”.

**К: 55°09’03.1”N 30°23’37.2”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 183.*

*Выгляд помніка ў 2011 г.*



**Помнік савецкім лётчыкам.** За 1,5 км на захад ад вёскі, каля шашы Лёзна – Віцебск, на развязцы дарог на Віцебск, Смаленск, Сураж (тэрытарыяльна adносіцца да Тулаўскага с/с). Мемарыял, які ўяўляе сабой пастаўлены 2 стылізаваныя пілоны вышынёй 22 і 18 м злучаныя між сабой (сімвалізуюць два крылы, якія ўрэзаліся ў зямлю, і загінуўшы экіпаж – лётчыка і стралка). Да манумента вядзе трохмаршавая лесвіца, па баках якой утвораны тэрасы з каменю. На бетоннай сцяне злева ад уваходу прымацавана дошка з надпісам: “Данный мемориал установлен советским летчикам, погибшим в боях с немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны при освобождении г. Витебска”. Побач з абеліскам на пастаменце ўсталявана 6 пліт з чорнага граніту, на якія нанесены імёны 86 загінуўшых лётчыкаў. Аўтары праекта – студэнты Маскоўскага архітэктурнага інстытута: Р. Кажахметаў, Л. Берлін, У. Аўсяннікаў, А. Смурава пад кіраўніцтвам А.В. Сцяпанава, Д.Л. Меладзінскага.

З ініцыятывай узвядзення помніка звярнуліся ветэраны ў 1974 г. з мэтай ушанавання памяці лётчыкаў 953-га штурмавога авіяпалка, 311-й штурмавой авіядывізіі 1-й паветранай арміі, які ваяваў на віцебскім напрамку з кастрычніка 1943 г. У адзін толькі дзень 03.02.1944 г. полк страціў 7 экіпажаў. Вызначыўся ў баях за вызваленне Віцебска і вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Атрымаў ганаровую назву “Віцебскі”.

**К: 55°09’45.0”N 30°21’02.8”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 183.*



*Помнік савецкім лётчыкам. 1998*

## в. ВАЎЧКІ (не існуе), Вымнянскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Ваўчкі знаходзілася за 1,5 км на паўночны захад ад в. Фокіна. У лютым 1943 г. гітлераўскія карнікі спалілі вёску разам з жыхарамі (43 чалавекі). Пасля вайны не адрадзілася. У 1968 г. на месцы былой вёскі насыпаны курган. У 2011 г. усталяваны новы абеліск. На пліце з чорнага граніту надпіс: "Вечная память жителям деревни Волчки, расстрелянным в годы Великой Отечественной войны немецко-фашистскими захватчиками".

**К: 55°10'30.5"N 30°34'20.3".**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 183.*




## в. ВАЯВОДКІ, Ноўкінскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4434).** У цэнтры вёскі, каля школы. У 1965 г. устаноўлены 2 надмагіллі. У 1967 г. усталявана мураваная стэла з выявай чырвонай зоркі ў левым верхнім вуглу, георгіеўскай стужкай і шыльдай у цэнтры з надпісам: "Герой Советского Союза Жестков Александр Петрович". На 1985 г. лічылася, што тут пахаваны 12 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па ўдакладненых дадзеных, у магіле пахаваны 33 салдаты (СУВВЗ), імёны ўсіх вядомы. Помнік і пахаванне маюць статус ГКК. Сярод пахаваных – Герой Савецкага Саюза Аляксандр Пятровіч Жасткоў.

А.П. Жасткоў нарадзіўся 26.07.1922 г. у в. Слаўцава Меленкаўскага р-на Уладзімірскай вобл. Член КПСС з 1944 г. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў на Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім франтах. Камандаваў кулямётным узводам 279-га гв. сп 91-й гв. стралковай Духаўшчынскай дывізіі. Гв. лейтэнант А.П. Жасткоў вызначыўся ў час Віцебска-Аршанскай аперацыі. 23.06.1944 г. у час прарыву абароны ворага ўзвод у раёне в. Карпавічы падавіў 6 агнявых кропак і знішчыў каля 100 гітлераўцаў. Праследуючы праціўніка, фарсіраваў р. Лучосу і ўмацаваўся на яе левым беразе, чым забяспечыў пераправу палка. 24 чэрвеня каля в. Асінаўка ўзвод знішчыў 5 кулямётных кропак і 130 гітлераўцаў. 25 чэрвеня ў баі каля в. Камары на працягу дня адбіў 4 контратакі ворага, а потым перайшоў у атаку. У гэтым баі А.П. Жасткоў загінуў. 24.03.1945 г. А.П. Жасткову прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



■ ■ ■

**Помнік землякам.** У 1967 г. пастаўлена стэла на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**К: 55°06'32.7"N 29°58'29.3"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 183–184; пашпарт ВП № 4434; Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984.*




*Пахаванне А.П. Жасткова*

## в. ВОЙТАВА, Вымнянскі сельсавет

**Вайсковыя могілкі (№ 4461).** У цэнтры вёскі. Пахаваны 978 савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў (СУВВЗ). У 1964 г. на могілках пастаўлены 3 абеліскі. У 2013 г. праведзена рэканструкцыя пахавання. Невысокі абеліск з чорнага граніту з выявай ордэна Айчыннай вайны і вялікім надмагільным помнікам, на які нанесены імёны пахаваных салдат. Па абодвух баках яшчэ два абеліскі з невялікімі надмагільнымі помнікамі, адзін з імёнамі загінуўшых, якія не ўвайшлі ў асноўны спіс, на другім выява Героя Савецкага Саюза А.А. Томскага. У 2017–18 гг. па ініцыятыве сваякоў на могілках усталяваны персанальныя пліты А.М. Бялугіну, Р.К. Норыца і А.Д. Шастакову, імёнаў якіх на плітах няма.

Помнік і пахаванне мае статус ГКК.

Сярод пахаваных – Герой Савецкага Саюза Аляксей Арсенавіч Томскі. А.А. Томскі нарадзіўся 28.03.1924 г. у с. Савацьева Сельсавецкага р-на Сельсавецкай вобл. Член КПСС з 1943 г. У 1941 г. добрахвотна пайшоў на фронт. Сяржант, камандзір узвода роты аўтаматчыкаў 950-га стралковага палка 262-й стралковай Дзямідаўскай дывізіі. 03.03.1944 г. узвод на чале з А.А. Томскім з групай байцоў (9 чалавек) атакаваў варожыя пазіцыі і выбіў ворага з траншэй. Перагрупаваўшыся, фашысты пайшлі ў контратаку. Бой працягваўся 2 гадзіны. Паранены А.А. Томскі працягваў камандаваць боем, разам з байцамі ўварваўся ў другую лінію траншэй. А.А. Томскі па-геройску загінуў у гэтым баі ў рукапашнай схватцы. 24.03.1945 г. А.А. Томскаму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**К: 55°12’59.2”N 30°30’41.2”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 184; пашпарт ВП № 4461; Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4461.html.*



*Магіла А.А. Томскага ў воінскім пахаванні № 4461.*




## в. ВОСТРАЎ, Янавіцкі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4448).** У цэнтры вёскі. Пахаваны 131 воіны і партызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну пры вызваленні раёна. Імёны ўсіх вядомы. У 1959 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з металічнай зоркай і тэкстам “Памяти павших будьте достойны”. Пазней абеліск замянілі на больш масіўны. Да яго прымацаваны 4 металічныя шыльды з імёнамі пахаваных салдат і словамі: “Вечная слава героям, павшим в боях за Родину”.

**К: 55°15’41.9”N 30°39’08.1”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 184; пашпарт ВП № 4448.*



## в. ВЫМНА, цэнтр сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4451).** У цэнтры вёскі, перад будынкам, у якім раней знаходзіўся Вымнянскі сельскі Дом культуры. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 996 воінаў, якія загінулі пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных – Герой Савецкага Саюза Анатоль Яфімавіч Углоўскі.

А.Я. Углоўскі нарадзіўся 24.07.1923 г. у в. Лужавіца Вялікаўсцюгскага раёна Валагодскай вобл. у сялянскай сям’і. Член ВЛКСМ. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на Калінінскім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Вызначыўся пры вызваленні Суражскага раёна Віцебскай вобл. У ноч на 20.12.1943 г. пры адбіцці варожай танкавай атакі бранябойшчык гв. радавы 306-й гв. сд А.Я. Углоўскі кінуўся з процітанкавай гранатай пад “тыгр” і падарваў яго. Натхнёныя прыкладам А.Я. Углоўскага, байцы падбілі яшчэ некалькі фашысцкіх танкаў. Контратака ворага была адбіта. 04.06.1944 г. А.Я. Углоўскаму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. За 6 км на паўночны захад ад в. Вымна, каля шашы Віцебск – Сураж і ў с. Вялікі Усцюг яму пастаўлены помнікі.



У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна. У 2013 г. праведзена рэканструкцыя воінскага пахавання, усталяваны новыя пліты з імёнамі пахаваных воінаў. Пахаванне мае статус ГКК.

**К:55°15’29.6”N 30°36’26.9”E.**

■ ■ ■

**Помнік Углоўскаму Анатолю Яфімавічу.** За 6 км на паўночны захад ад в. Вымна, каля шашы Віцебск – Сураж. У 1978 г. пастаўлены помнік-фігура воіна (жалезабетон; агульная вышыня 4,5 м). Баец, не зважаючы на небяспеку, устаў, каб кінуць звязку гранат. Рэзкі рух наперад, адкінутая назад рука, разарваная лента гусеніцы перадаюць напружанасць і драматызм моманту. Дынаміка ўнутранага стану воіна, яго імклівы парыў знішчыць ворага падкрэслены экспрэсіяй пластычных форм. Адкрыты з усіх бакоў помнік ярка і эмацыянальна ўслаўляе гераізм савецкага воіна. На помніку гранітная шыльда з надпісам-прысвячэннем: “Герою Советского Союза Анатолию Ефимовичу Угловскому комсомольцу гвардии рядовому 306 Рибшевской стрелковой дивизии. 20 декабря 1943 года, отражая яростный натиск фашистских бронированных машин у бывшей дер. Холудные А.Е. Угловский, проявив мужество и героизм, уничтожил головной танк “Тигр”. В 1978 г. построен на общественных началах за средства рабочих и служащих совхоза. Автор А. Гвоздиков”.

**К: 55°16’35.1”N 30°30’48.4E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 184; пашпарт ВП № 4451; Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bmсв 4451.html.*



■ ■ ■

**Магіла Дзятлавай Вольгі Андрэеўны (1918–1942).** У 1942 г. каля в. Рыбакі расстраляна жонка партызана і яшчэ 2 невядомыя мужчыны, верагодна партызаны. Пахавана на могілках Юр’е ў в. Вымна.

*Літ. і К.: Інфармацыя прадастаўлена В.М. Марозавым; https://kas954.blogspot.com/2017/10/blog-post_17.html.*



## в. ВЫМНА, цэнтр сельсавета

**Магіла сям'і Салаўёвых.** На грамадзянскіх могілках "Юр'е". На металічным крыжы памятная шыльда з надпісам: "Здесь покоится партизанская семья, погибшая в годы войны от фашистских карателей: Соловьев Николай Стефанович, Соловьева Степанида Карповна, Соловьева Дина Николаевна". М.С. Салаўёў (1889), С.К. Салаўёва (1899), іх дачка Д.М. Салаўёва (1919) пражывалі ў в. Хамутоўка (калгас "Новае Жыццё"). Забіты паліцэйскімі вымнянскай валасной управы каля былой в. Кляцішча.

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 256. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 86. Список погибших по Котовскому с/с; Вымнянский край. Виртуальная книга памяти. https://kas954.blogspot.com/2016/06/blog-post_25.html и https://kas954.blogspot.com/2017/10/blog-post_17.html*



**Магіла партызана.** На могілках "Юр'е". 20.01.1943 г. паліцаямі Вымнянскай валасной управы быў расстраляны цяжка паранены партызан-разведчык атрада "Марак" брыгады Аляксея Коцікаў Прохар Філіпавіч 1913 г.н., які пражываў у в. Хамутоўка калгаса "Новае Жыццё".

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 256. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 86. Список погибших по Котовскому с/с; http://kas954.blogspot.com/2016/08/blog-post_25.html.*





*Абеліск у в. Вял. Любшчына. 1964*

## в. ВЯЛІКАЯ ЛЮБШЧЫНА, Задуброўскі сельсавет

**Вайсковыя могілкі (№ 4403).** На паўночнай ускраіне вёскі, каля грамадзянскіх могілак. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 221 воін, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па ўдакладненых дадзеных, у магіле пахаваны 375 савецкіх салдат і афіцэраў (СУВВЗ). У 1980 г. на магіле пастаўлены абеліск, у 2019 г. заменены на гранітную пліту з надпісам-прысвячэннем: "Слава Героям, павшим в боях за свободу и независимость нашей Родины. 1941–1945". Металічная шыльда з такім жа надпісам ад старога помніка змешчана каля падмурка помніка. На зямлі 8 металічных пліт з імёнамі пахаваных воінаў. Злева ад помніка ўсталявана на стойках яшчэ адна шыльда з прозвішчамі салдат, імёны якіх удалося высветліць. На пахаванні маецца яшчэ некалькі персанальных шыльд і адзін помнік, узведзеныя і ўсталяваныя сваякамі загінуўшых.

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 185; пашпарт ВП № 4403.*

*Сучасны выгляд помніка ў в. Вял. Любшчыне*



**Магіла сям'і Цяцёркіных.** На грамадзянскіх могілках. Каменны помнік з надпісам: "Здесь похоронена семья Тетеркиных, погибшая в 1942 г.".

*Літ. і К.: Матэрыялы палявых даследаванняў 2020 г. // захоўваюцца ў асабістым архіве аўтара.*



**Магіла сям'і Краўчынскіх.** На грамадзянскіх могілках. Каменны помнік з металічнай зоркай наверсе. На помніку надпіс: "Кравчинская Дарья Федосовна, ее дети Татьяна, Ольга, Лидия и внуки Лина и Геня. Погибли в 1942 г. От вечно скорбящего сына и брата Александра".

*Літ. і К.: Матэрыялы палявых даследаванняў 2020 г. // захоўваюцца ў асабістым архіве аўтара.*




**Магіла А.Р. Лазарава.** На грамадзянскіх могілках. Каменны помнік з металічнай чырвонай зоркай наверсе. На помніку фотаздымак і надпіс: "Анатолий Григорьевич Лазарев 5.12. 1923–1.12. 1943. Дорогому сыну от родных".

*Літ. і К.: Матэрыялы палявых даследаванняў 2020 г. // захоўваюцца ў асабістым архіве аўтара.*



**Магіла Асташэнка Галіны.** На грамадзянскіх могілках. Каменны помнік з металічным крыжам наверсе. Агароджы няма. На помніку надпіс: "Асташенко Галина Александровна. 1927. Погибла 1942 10.V. От отца".

*Літ. і К.: Матэрыялы палявых даследаванняў 2020 г. // захоўваюцца ў асабістым архіве аўтара.*



**Магіла Казловай Ганны.** Каменная пліта з надпісам: "Козлова Анна ...ентьевна 1920(8?) – 1942".

*Літ. і К.: Матэрыялы палявых даследаванняў 2020 г. // захоўваюцца ў асабістым архіве аўтара.*



**Магіла Хейфец Еўдакіі.** На грамадзянскіх могілках. Каменны помнік у металічнай агароджы з надпісам: "Хейфец Евдокия Са...иловна Умерла ... От роду 48 лет. От детей". Пахавана яўрэйка, якая ўчыніла самагубства, каб не быць забітай немцамі. Дзеці засталіся жывыя таму, што іх схавалі мясцовыя жыхары.

*Літ. і К.: Матэрыялы палявых даследаванняў 2020 г. // захоўваюцца ў асабістым архіве аўтара.*



**Месца гібелі яўрэяў г. Суража.** У рве р. Гарадзішча, на ўскраіне вёскі 02.08.1941 г. была расстраляна значная частка яўрэйскага насельніцтва г. Суража. У 1996 г. перапахаваны на былыя яўрэйскія могілкі г. Суража, дзе пастаўлены помнік (гл. арт. "Магіла ахвяр гета г.п. Суража. На былых яўрэйскіх могілках, каля в. Шапурова. Пахаванне ахвяр вайны (№ 7986)". – С. 88).

*Месца ніяк не абазначана*






## в. ГАРАДНЯНСКІ МОХ, Ноўкінскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 2298).** На грамадзянскіх могілках. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 1497 воінаў, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па ўдакладненых дадзеных, у магіле пахаваны 2759 салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі (СУВВЗ). Вядомы імёны ўсіх пахаваных. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск. У 2019 г. усталяваны новыя пліты з імёнамі пахаваных. Помнік і пахаванне маюць статус ГКК.

**К: 55°05'04.5"N 30°08'53.7"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ.Вв. – С. 185.*




## в. ГАРАДНЯНЫ, Ноўкінскі сельсавет

**Магіла ахвяр фашызму (№ 6678).** За 1,5 км ад в. Гарадняны, за 3 км на поўнач ад вёскі Ноўка, за 150 м ад дарогі Ноўка – Сасноўка, на ўскраіне лесу,ва ўрочышчы Пяскі. У гады Вялікай Айчыннай вайны нямецкія фашысты зрабілі на гэтым месцы канцлагер, у які змяшчалі мясцовае насельніцтва, западозранае ў сувязях з партызанамі. Шмат хто быў забіты ці памёр ад невыносных умоў утрымання. Тут праводзіліся масавыя расстрэлы мірных жыхароў г. Віцебска і падпольшчыкаў. Колькасць пахаваных невядома. У 1965 г. на магіле насыпаны курган і пастаўлены абеліск з надпісам: “Здесь погребены тысячи расстреляных и замученных жертв фашистской оккупации. Родина-мать вечно будет помнить героев, отдавших свою жизнь за счастье и мир на земле”.

**К: 55°06'40.1"N 30°08'47.1"E.**

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 571. Воп. 4. Спр. 185. Арк. 7 Пастанова Віцебскага райкама “О предложенниях районной комиссии по увековечению подвигов советских людей на территории района в годы Великой Отечественной войны от 15 июня 1966 г.; ЗПГіКБ. Вв. – С. 185; пашпарт ВП № 6678.*



## в. ГАРКАВА, Шапечынскі сельсавет

**Магіла ахвяр фашызму (№ 6677).** У цэнтры вёскі, між дамамі № 12, 14 па вул. Цэнтральнай. Пахаваны 19 мірных жыхароў, якіх расстралялі ў жніўні 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі. На прамавугольнай стэле прымацавана мармуровая шыльда з інфармацыяй: "В августе 1942 года немецко-фашистские захватчики за связь с партизанами расстреляли и зверски замучили многих мирных жителей Горьково и окрестных деревень. Здесь захоронены: Е.У. Гончаров, Ф.В. Гончаров, И.Ф. Гончаров, В.Ф. Гончаров, Т.А. Гончаров, А.А. Комленкова, Н.Ф. Вильчиков, В.А. Сущенко, Д.П. Рябцева и другие. Всего 19 человек. От колхозников колхоза «Советская Белоруссия» 19 августа 1967 года.". Імёны 10-ці невядомыя.

**К.: 54°55'29.4"N 30°15'00.9"E.**

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 571. Воп. 4. Спр. 185. Арк. 35–44; ЗПГіКБ. Вв. – С. 185; пашпарт ВП № 6677.*



## в. ГЕРАСІМАВА, Мазалаўскі сельсавет

**Магіла разведчыкаў (№ 7874).** На паўночнай ўскраіне грамадзянскіх могілкаў. У адпаведнасці з аповядамі мясцовых жыхароў, летам 1942 г. савецкія разведчыкі, якія з самалёта спускаліся на парашутах, трапілі ў возера Сосна, заблыталіся ў стропах і патанулі. Немцы выцягнулі целы. Паліцай прапанаваў іх проста закапаць: "Сабакам сабачая смерць". Але нямецкі афіцэр адказаў: "Яны такія ж салдаты, як і мы, і заслугоўваюць павагі". Пахавалі на краю могілак у Герасімава. Пасля вайны сюды прыязджаў Северын Дзімітроў, які служыў разам з імі ў штабе фронту і загадваў адпраўкай дыверсантаў. Даведаўшыся, што тут пахаваныя раней падначаленыя яму маладыя хлопец і дзяўчына, С. Дзімітраў напісаў ліст у мясцовую газету, потым, верагодна, звярнуўся ў райкам, пасля чаго на месцы магілы герояў паставілі помнік ад камсамольцаў Віцебшчыны. Значную ролю ва ўшанаванні памяці адыграла Залесская Тамара Васільеўна.

Матэрыяламі АБД "Мемарыял" пацвярджаецца, што ў магіле пахаваны Важнова Ганна Мікалаеўна (1922), радавая, разведчыца, в/ч ДКА п.п.с. 1485, аддзел 3 (1485 ППС падпарадкоўвалася штабу Калінінскага фронту, потым 1-га Прыбалтыйскага). Дата перапынення пісьмовай сувязі 24.04.1942 г. Па загаду ваенкама лічыцца загінуўшай з 1943 г. Другі пахаваны – Ашчаўлаў Анатоль Фёдаравіч (1921–6.06.1942). На магіле пастаўлены помнік з надпісам: "В памяти народной вы будете вечно живыми. Важновой А.Н., Ащеулову А.Ф. военным разведчикам Великой Отечественной войны от комсомольцев Витебщины".

**К: 55°21'37.8"N 30°03'57.7"E.**

*Літ. і К.: Список сотрудников разведотделов штабов фронтов, погибших или пропавших без вести во время Великой Отечественной войны. Важнова А.М. // https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=69245277&p=30; https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=70666163; Ащеулов А.Ф. // https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=69245277&p=10; Успаміны Сіманенцы Раісы Іванаўны, 1931 г.*



## в. ГЕРАСІМАВА, Мазалаўскі сельсавет, пахаванне на беразе воз. Лосвіда

**Брацкая магіла (№ 4431).** За 3 км ад в. Герасімава, ва ўрочышчы Магучова, на беразе возера Лосвіда.

На мяжы 1943–1944 гг., пасля правядзення ўдалай Гарадоцкай аперацыі і вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, савецкае камандаванне імкнулася захапіць важны стратэгічны цэнтр Беларусі – Віцебск. Гэта задача ставілася перад войскамі 11-й гвардзейскай і 4-й Ударнай армій. Але немцы ўмела выкарыстоўвалі складаны рэльеф мясцовасці, манеўрыравалі рэзервамі і прарваць абарону не ўдавалася. Адным з кіраўнікоў савецкіх войскаў было прынята рашэнне наступаць па лёдзе праз возера Лосвіда, спадзяючыся, што раптоўная атака будзе нечаканай для фашыстаў. Аднак выкарыстоўваючы ўсю моц агнявой зброі, немцы практычна расстралялі на адкрытай мясцовасці возера амаль цэлую дывізію. Колькі савецкіх салдат было забіта ці пайшло пад лёд, дакладна невядома, але верагодна колькасць блізкая да 5 тысяч.

Вясной 1944 г. ва ўрочышчы Магучова адбылося пахаванне больш за 1 тысячу савецкіх салдат, якія загінулі ў час няўдалага наступлення праз возера Лосвіда ў студзені 1944 г. Пазней, пасля сімвалічнага перапахавання на могілкі ў в. Герасімова, могілкі ў Магучова былі разбураны. Пасля шматлікіх заяў і патрабаванняў сваякоў і мясцовых жыхароў, ва ўрочышчы Магучова быў збудаваны помнік, месца добраўпарадкавана.

Помнік узведзены ў 1971 г. архітэктарам А. Бельскім, скульптарам А. Паўлючуком. Ён уяўляе сабой чатырохгранны абеліск вышынёй 11,5 м, устаноўлены ў цэнтры ступеньчатага стылабата. Абеліск складаецца з 7 блокаў, сіметрычна скампанаваных адносна вертыкалі. На плоскасці аднаго з блокаў – выява гвардзейскага значка, другога – надпіс-прысвячэнне. Справа каля абеліска размешчаны масіўны куб са скульптурным партрэтам воіна Савецкай Арміі. Помнік пастаўлены ва ўшанаванне салдат 235-й сд, 16-й і 18-й гв. сд 11-й гв. Арміі і 4-й Ударнай Арміі, якія загінулі на лёдзе воз. Лосвіда пры няўдалым наступленні 7–9 студзеня 1944 года.

У ЗПГіКБ згадваецца 76 савецкіх воінаў. У СУВВЗ улічаны 107 імёнаў савецкіх салдат. Па сведчаннях мясцовых жыхароў, пахаванні больш за тысячу савецкіх салдат знаходзяцца ў забалочанай нізіне злева ад помніка.

**К: 55°21'56.2"N 30°01'12.5"E.**

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 571. Воп. 4. Спр. 185. Арк. 40. Пастанова Віцебскага райкама "О предложенниях районной комиссии по увековечению подвигов советских людей на территории района в годы Великой Отечественной войны от 15 июня 1966 г.; Галицкий К.Н. Годы суровых испытний. 1941–1944: Записки командарма. – М., 1973; ЗПГіКБ. Вв. – С. 185; Легоньков, Б.Я. Озера кровавые берега [няўдалае наступленне на воз. Лосвіда 6, 7 студзеня 1944 г., дакументы] // ЖП. – 1999. – № 26. – С. 2.*



## в. ГЛАЗАМІЧЫ, Янавіцкі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4450).** На могілках. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 55 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У СУВВЗ змешчана інфармацыя толькі пра 21 салдата. У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**К: 55°18′40.4″N 30°42′24.1″E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 185; пашпарт ВП № 4450.*



*Абеліск у Глазамічах. 1959*



*Абеліск ў Глазамічах. Сучасны выгляд*

## в. ГРАБЯНІЦА, Мазалаўскі сельсавет

**Брацкая магіла партызан (№ 4428).** На грамадзянскіх могілках, у лесе за некалькі кіламетраў на ўсход ад вёскі. Пахавана больш за 100 партызан 1-й Віцебскай партызанскай брыгады, якія загінулі ў 1941–1943 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў (99 па СУВВЗ, вядомы імёны 2 асоб). Па звестках М.Ф. Біруліна, імёны ўсіх пахаваных вядомы. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

*Былыя партызаны каля помніка. 1974*




**Месца сходаў падпольшчыкаў.** За 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, каля воз. Валконка, у Грабнеўскім лесе.

У жніўні 1941 г. у Віцебскім р-не была створана падпольная група І. Дз. Буцьянава, у якую ўваходзілі А.П. Абраменка, М.Ф. Бірулін і інш. Сходы падпольшчыкаў праводзіліся ў лесе ў зямлянцы каля вёскі. 05.11.1941 г. фашысты выкрылі месца сходаў. У баі загінулі І.Дз. Буцьянаў і А.П. Абраменка. Пасля гібелі І.Дз. Буцьянава групу ўзначаліў М.Ф. Бірулін, пад кіраўніцтвам якога ў лютым 1942 г. быў створаны

*Сучасны выгляд пахавання*



партызанскі атрад (камісар – У.А. Хабараў, начальнік штаба – І.А. Крыцкі). З красавіка 1942 г. атрад дзейнічаў у складзе 1-й Беларускай партызанская брыгады. У лютым 1943 г. на яго базе створана 1-я Віцебская партызанская брыгада.

У 1967 г. была адноўлена зямлянка, дзе праходзілі сходы, устаноўлена мемарыяльная дошка. Да нашага часу зямлянка і шыльда не дайшлі. Захаваліся некаторыя элементы дэкарацый і месца зямлянкі.

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 185.*

*Указальнікі. 2004*



## в. ГРАДА, Запольскага сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4396).** За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі Тарасенкі, у лесе. У 1965 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск складанай формы з металічнай зоркай наверсе і тэкстам: “Вечная слава героям, павшим в боях за свободу и независимость нашей Родины. 1941–1945”. У 2014 г. усталяваны новыя пліты з імёнамі загінуўшых. Маецца драўляная агароджа. Пахаваны 267 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**К.: 55°25’52.0”N 30°39’12.7”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 193; Пашпарт ВП № 4396.*

*Зямлянка. 1984*



*Узведзены абеліск. 1965*



*Сучасны выгляд пахавання*



# Д



## в. ДЗЯТЛЫ, Суражскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4441).** У 1975 г. на магіле пастаўлена стэла з надпісам: “Вечная слава героям, павшим в борьбе за свободу и независимость нашей Родины. 1941–1945 гг.”. Да стэлы прыстаўлены пліта з імёнамі 19-ці савецкіх салдат. Побач металічная шыльда з імёнамі яшчэ 5-ці салдат. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 25 воінаў, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адпаведна СУВВЗ, тут пахаваны 21 салдат і 1 партызан.

**К: 55°20’48.9”N 30°50’38.7”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 186; Пашпарт ВП № 4441.*

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** На грамадзянскіх могілках. На магіле ўсталяваны помнік з мармуровай крошкі з металічнай чырвонай зоркай наверсе. На помніку змешчаны тэкст: “Игнатьев И.Д., Игнатьев И.И., Игнатьев Н.И., Моисеев С.Е., Васильев ?.О., Горланов М.В. погибли ____ 1941 г.”.

**К: 55°20’48.9”N 30°50’38.7”E.**




*Абеліск. 1957*



*Сучасны помнік*



## в. ДОЎЖА, Мазалаўскі сельсавет

**Магіла невядомага савецкага салдата (№ 7843).** Знаходзіцца каля чыгункі Віцебск – Гарадок, за 15 м ад палатна дарогі, на беразе воз. Бутыкі. Помнік мае выгляд піраміды (цэмент, арматура) з металічнай зоркай. На помніку спецыяльна зроблена шыльда, аднак імя не ўказана. Пахаванне абгароджана металічнай агароджай. Па сведчаннях мясцовых жыхароў, у магіле пахаваны партызан, які загінуў пры падрыве маста праз р. Зачарнаўская ў гады вайны. Па сведчаннях іншых, пахаваны савецкі салдат, які загінуў у чэрвені 1944 г. пры аднаўленні чыгуначнага маста. Ёсць звесткі пра тое, што пахаваны чырвонаармеец, забіты кулямётнай чаргой пры руху калоны ў чэрвені 1944 г.

**К.: 55°21’39.3”N 30°05’16.0”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 7843.*



## в. ДРАЖНА, Курынскі сельсавет

**Брацкая магіла партызан (№ 4416).** На могілках. Пахаваны 4 партызаны, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць гітлераўцаў: палітрук Г.Н. Бычкоў (1915–1943), медсястра А.І Кухтова (1922–1943), кулямётчык Е.А. Шаркоў, Бабенка Сафія. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**К: 55°23’05.5”N 30°22’06.5”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 186; пашпарт ВП № 4416.*




**Магіла Гарунова Пятра Кузьміча.** На могілках. Старшы лейтэнант П.К. Гаруноў загінуў у 1943 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск. Магіла па СУВВЗ аднесена на брацкай магілы № 4416.

**К: 55°23’05.5”N 30°22’06.5”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 186; пашпарт ВП № 4416.*



## в. ДРАЖНА, Курынскі сельсавет

**Магіла І.К. Паліўкіна.** На грамадзянскіх могілках. Абеліск з мармуровай крошкі з металічным крыжам наверсе. На помніку маецца фотаздымак чалавека ў будзёнаўцы і надпіс: ”Поливкин Иван Кириллович 1912–1942. Дорогому брату от сестер”. Магіла мае металічную агароджу.

**К: 55°23’05.5”N 30°22’06.5”E.**

*Літ. і К.: Свод памятников Великой Отечественной войны – Куринский сельсовет vk.com/topic-29914100_40791278717.*




**Магіла А.В. Шаўчэнка.** На грамадзянскіх магілках. Бетонны абеліск з металічным крыжом наверсе. На помніку надпіс: “Шевченко Анатолий Васильевич 1936–1943. Дорогому сыночку от мамы”. Маецца металічная агароджа.

**К: 55°23’05.5”N 30°22’06.5”E.**



**Магіла М.В. Мельячэнкі** Бетонны абеліск з металічным крыжом наверсе. На помніку надпіс: “Мельяченко Мария Васильевна 1901–1942. Дорогой тети от сестры и племянниц”. Магіла мае металічную агароджу.

**К: 55°23’05.5”N 30°22’06.5”E.**



**Магіла Л. Капусціна і В. Паліўкіна.** На грамадзянскіх могілках. Металічны абеліск трапецыявіднай формы з накладной металічнай зоркай у правым верхнім вуглу. На шыльдачцы надпіс: “Капустин Леша, Поливкин Ваня, 1928–1943 г. Расстреляны немцами”. Пахаванне мае металічную агароджу.

**К: 55°23’06.5”N 30°22’06.3”E.**




**Магіла А.М. Паліўкіна.** На грамадзянскіх могілках. Металічны абеліск трапецыявіднай формы з накладной металічнай зоркай у правым верхнім вуглу, фотаздымкам і шыльдай з тэкстам: “Поливкин А.М. 1892–1943. Погиб за Родину”. Пахаванне мае металічную агароджу.

**К: 55°23’05.5”N 30°22’06.5”E.**



**Магіла Г.М. Шувалавай і В.М. Старавойтавай.** На грамадзянскіх могілках. Абеліск з мармуровай крошкі з выявамі праваслаўнага васьміканечнага крыжа ў лаўровым вянку ў цэнтры і праваслаўнага распяцця ў левым верхнім вуглу. На ўстаўцы чорнага колеру размешчаны тэкст: “Вечная память Вам, дорогие мамочки, зверски замученные фашистами 1943 г. Шупувалова Анна Николаевна, Старовойтова Ольга Николаевна”. Пахаванне мае металічную агароджу.

**К: 55°23’05.5”N 30°22’06.5”E.**



## в. ДРУЖНАЯ (да 1964 г. БАЛТУХІ), Янавіцкі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4447).** За 0,5 км на захад ад вёскі. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 166 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1962 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з металічнай зоркай наверсе. На шыльдзе тэкст: “Вечная слава героям, павшим в боях за Родину”. На металічных шыльдах у надмагіллях змешчаны імёны пахаваных. Пахаванне мае статус ГКК.

**К: 55°16’01.5”N 30°41’52.4”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 186; пашпарт ВП № 4447.*



## в. ДРУКАВА, Варонаўскі сельсавет

**Месца подзвігу савецкіх воінаў** (Помнік “Віцебскім панфілаўцам”). На ўскраіне вёскі, каля шашы Віцебск – Смаленск. У 1969 г. на ўшанаванне памяці воінаў-герояў пастаўлена стэла, абкладзеная плітамі з гранітнай крошкі. На металічнай шыльдзе змешчаны тэкст з апісаннем подзвігу: “Никто не забыт и ничто не забыто. Здесь, в районе деревень Дрюково и Ковширы, 25 декабря 1943 года 27 воинов-героев 4-й роты 875-го полка 158-й стрелковой дивизии под командованием лейтенанта Бесхлебного И.Е. совершили бессмертный подвиг, защищая родную землю от фашистских орд. Вечная слава героям! Июль 1969 г.”. Да ўзвышша, на якім размешчана стэла, вядуць бетонныя прыступкі, маюцца парэнчы.

Раніцай 25 снежня 1943 г. узвод лейтэнанта І.Я. Бясхлебнага, які складаўся з 27 воінаў 4-й роты 875-га палка 158-й сд захапіў вышыню каля в. Друкава, якая займала важнае стратэгічнае становішча, і на працягу дня ўтрымліваў яе. Калі падышла дапамога, ўжо не было жывых на вышыні.

За праяўленую мужнасць 27 воінаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені.

**К: 55°08’39.2” N 30°24’56.5”E.**



## в. ДУБАВІЦЫ (не існуе), Запольскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Дубавіцы знаходзілася за 3 км на ўсход ад в. Кавалёва. Да вайны жылі 193 чалавекі. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 28 жыхароў в. Дубавіцы, вёску спалілі (42 двары). Пасля Вялікай Айчыннай вайны не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”.

Да абеліска няма дарогі.

**К.: 55°33’22.0”N 30°42’38.1”E.**

*Літ. і К.: Памяць: Віцебскі раён: ГДХГіРБ, 2004. – С. 227; ЗПГіКБ. Вв. – С. 186.*

*Абеліск Дубровіцы ў м/к “Хатынь”*






## в. ДУБРАВА (не існуе), Вымнянскі сельсавет (знаходзілася за 1 км на поўдзень ад в. Прывольная (да 1964 г. в. Сапуны).

**Абеліск на месцы расстрэлу фашыстамі мірных жыхароў.** Знаходзіцца за 150 м на захад ад вёскі, на ім надпіс: “Здесь 14 января 1943 г. палачи расстреляли родных и близких Гавриленко Е.Г. 3 сестры и брата Мартюковых, Шалковских, Семеновых, Белинских”.

**К: 55°11’29.5”N 30°36’09.5”E.**

*Літ. і К.: Інфармацыя Марозава В.М.; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/sozh-derevny.html.*



## в. ДУБРАВА (не існуе), Вымнянскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Дубрава знаходзілася за 1 км на поўдзень ад в. Прывольная (да 1964 г. в. Сапуны). Перад вайной у ёй жылі 144 чалавекі. 14.01.1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты зажыва спалілі 99 жыхароў, у т.л. 40 дзяцей, і знішчылі вёску (32 двары). Людзям была загадана сабрацца каля хлева. Некаторыя прыйшлі, іншыя паспрабавалі ратавацца ўцёкамі і пабеглі да яра. Тых, хто прыйшлі да будынка, акружылі і расстралялі. Дамы падпалілі. З аднаго боку вёскі людзей сагнаць не атрымалася, іх расстрэльвалі ў дамах.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска не адрадзілася. У 1958 г. на месцы былой вёскі пастаўлены абеліск. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”. У 2010-я гг. абеліск заменены на пліту з чорнага граніту з надпісам: “Здесь была д. Дуброво. Ее жителей в количестве 89 человек, в т.ч. 40 детей сожгли заживо немецко-фашистские палачи 14 января 1943 года”.

**К: 55°11’31.8”N 30°36’14.8”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 186; Памяць: Віцебскі раён. – С. 227.*






*Абеліск Дубрава ў м/к “Хатынь”*



# Ж



## в. ЖАБАНЦЯІ, Бабініцкі сельсавет

**Магіла Логвінава Івана Аляксеевіча (№ 4390).** На грамадзянскіх могілках на ўездзе ў вёску па вул. Цэнтральнай. Абеліск з бетоннай крошкі з шыльдай: “Майор Логвинов Иван Александрович 1918–1941. Вечная память. Исполком Бабиничского с/с”.

**К: 55°17’42.1”N 30°28’57.2”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4390.*




## в. ЖЫГАЛАВА, Заронаўскі сельсавет

**Магіла Мухіна Аляксандра Аляксеевіча (№ 2297) на вуліцы Азёрная.** Камандзір 2-га бат. 64-й гв. ап 31-й гв. сд 11-й гв. арміі, гвардыі старшы лейтэнант А.А. Мухін загінуў 5 студзеня 1944 г. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск бацькамі воіна. На ім фотаздымак і надпіс: “Гв. ст. лейтенат Мухин А.А. род. 1922 году, погиб в боях за Родину в январе 1944 г. Спи спокойно любимый, никем не заменимый милый сыночек”.

**К: 55°18’59.4”N 29°50’26.7”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 186; пашпарт ВП № 2297.*





3

## в. ЗАДЗВІННЕ (былая в. Пялёнкі), Курынскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4419).** На ўсходняй ускраіне вёскі, на правым беразе р. Дзвіна. Пахаваны 641 воін і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, з іх вядомы імёны 589. У 1966 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна. У 2014 г. абноўлены 40 пліт з імёнамі загінуўшых. Пахаванне мае статус ГКК.

Сярод пахаваных – Герой Савецкага Саюза Андрэй Самуілавіч Гайко. А.С. Гайко нарадзіўся ў 1920 г. у пас. Карасай Акбулацкага р-на Арэнбургскай вобл. Працаваў у калгасе на радзіме трактарыстам. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гг. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 г. камандзір узвода 2-й стралковай роты 1126-га сп 334-й сд 43-й арміі лейтэнант А.С. Гайко вызначыўся 26.12. 1943 г. у баі каля в. Пялёнкі. На працягу 4 гадзін на чале групы з 7 чалавек адбіў 10 контратак праціўніка. Застаўшыся адзін, адстрэльваўся да апошняга патрона. Калі скончыліся боепрыпасы, падпусціў гітлераўцаў і 2 процітанкавымі гранатамі падарваў іх і загінуў сам.



04.06.1944 г. А.С. Гайко прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**К: 55°20’52.9”N 30°24’21.2”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 186; пашпарт ВП № 4419; Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984.*

## в. ЗАДЗЕБРА Вымнянскі сельсавет, (не існуе), за 1 км на ўсход ад в. Котава

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4458).** Пахаваны 453 воіны, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з металічнай зоркай наверсе. У 2017 г. была праведзена рэканструкцыя помніка. Ён быў абкладзены чорным гранітам, нанесены ўдакладненыя і дапоўненыя спісы загінуўшых.

**К: 55°13’23.6”N 30°38’40.9”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 186; пашпарт ВП № 4458; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4458.html.*



## в. ЗАДУБРОЎЕ, цэнтр сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4400).** У цэнтры вёскі, на вул. Маладзёжнай, каля сельскага Дома культуры. Пахаваны 42 воіны, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Невядомы імёны дзвюх асоб. У 1963 г. на магіле пастаўлены бетонны фігурны абеліск з металічнай зоркай і агароджа з металічных слупоў з навершамі ў выглядзе шароў. Пазней абеліск быў заменены на стэлу з барэльефам галавы воіна ў касцы і лічбамі 1941–1945. Побач 2 металічныя шыльды з імёнамі пахаваных. Насупраць помніка пліта з зоркай і сімвалічным вечным агнём. Агароджа з металічных ланцугоў і цагляных слупкоў. На ўваходзе інфармацыйная шыльда з кантактнымі тэлефонамі сельсавета.

**К: 55°20’55.3”N 30°39’32.8”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 186; пашпарт ВП № 4400.*

## в. ЗАМАСТОЧЧА, Шапечынскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4397).** У цэнтры вёскі, насупраць школы. У 1953 і 1957 г. на магілках пастаўлены абеліскі. Пазней заменены на мемарыял. Да бетоннай пліты прымацаваны рэльефныя выявы зоркі і двух салдат са сцягам. Па баках на пастаментах аб’ёмныя кубы з бетону з лічбамі 1941 і 1945. На надмагільным помніку змешчаны пліта з тэкстам: “Перед подвигом Вашим бессмертным вечно склоняет знамена народ благодарный”. Злева шыльда з імёнамі пахаваных салдат. Справа пліта І.А. Самахвалаву (гл. арт. “Магіла Самахвалава І.А.” – С. 36). Маецца агароджа.

Пахаваны 126 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

**К: 55°00’54.8”N 30°10’48.8”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 187; пашпарт ВП № 4397.*

**Магіла Самахвалава Івана Ананьевіча.** Знаходзіцца ў межах воінскага пахавання № 4397. Камандзір 172-га знішчальнага авіяцыйнага палка падпалкоўнік І.А. Самахвалаў загінуў у раёне в. Ляхі ў паветраным баі. На манументе надпіс: “Здесь похоронен подполковник Иван Ананьевич Самохвалов – командир 172-го истрибительного авиационного полка. 25 июня 1944 года в районе деревни Ляхи в бою с фашистскими стервятниками пал смертью храбрых”. У адпаведнасці са звесткамі АБД “Мемарыял”, ён загінуў 06.01.1944 г.

**К: 55°00’54.8”N 30°10’48.8”E.**

*Літ. і К.: Имена из солдатских медальонов. сост.: Коноплев А.Ю., Салахиев Р.Р. Казань: «Отечество», 2005; https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=1153504719.*







**Магіла Пядзько Андрэя Дзям'янавіча (№ 4399).** За 60 м ад чыгуначнай станцыі, каля д. 14 па вул. Школьнай. Старшы лейтэнант А.Дз. Пядзько загінуў у 1944 г. У 1955 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з металічнай зоркай наверсе. Пазней заменены.

**К: 55°00'46.9"N 30°10'38.7"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 187; Пашпарт ВП № 4399.*



**Мемарыяльная дошка Канаваленку Уладзіміру Ануфрыевічу.** На будынку школы. Устаноўлена ў 1964 г. на ўшанаванне памяці Героя Савецкага Саюза У.А. Канаваленкі, які ў 1926–1930 гг. вучыўся ў Замастоцкай сярэдняй школе (школе прысвоена яго імя). На металічнай шыльдзе тэкст: "В этой школе с 1926 г. по 1930 г. учился Коноваленко Владимир Ануфриевич. За мужество и отвагу, проявленные в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками, ему присвоено звание Героя Советского Союза".

**К: 55°00'52.9"N 30°10'51.3"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 187.*




**Помнік Дружыніну Міхаілу Іванавічу.** Каля школы. Гв. ст. лейтэнант М.І. Дружынін з групай салдат 61-га гв палка 19-й гв. сд 23.06.1944 г. захапіў мост цераз р. Лучоса каля в. Замасточча і забяспечыў хуткую пераправу войск 5-га гв. ск. За гэты подзвіг 24.03.1945 г. яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У 1969 г. у гонар подзвігу пастаўлены абеліск з цэглы з выявай медаля Залатая Зорка і металічнай шыльдай з тэкстам: "Подвигу вечная слава! 22 июня 1944 года лейтенант Дружинин М.И. с группой солдат 61-га гв. полка сп 19-й гв сд захватил мост через реку Лучеса, чем обеспечил быструю переправу войск 5 гвардейского стр. корпуса. За этот подвиг Дружинину М.И. присвоено звание Героя Советского Союза. Июль 1969 г.".

**К: 55°00'55.1"N 30°10'52.0"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 187–188.*



## в. ЗАПОЛЛЕ, цэнтр сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму (№ 4395).** Каля дарогі Сураж – Веліж. Пахаваны 262 воіны, партызаны і мірныя жыхары, якія загінулі ў 1941–1944 гг. З іх невядомы імёны 12 асоб. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам на высокім пастаменце. Да яго прымацавана шыльда са словамі-прысвячэннямі і шыльда з імёнамі пахаваных. Злева ад помніка – гармата на пастаменце. Пахаванне мае драўляную агароджу.

**К: 55°30’25.5”N 30°46’37.1”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 187; пашпарт ВП № 4395.*



**Месца базіравання штаба 1-й Беларускай партызанскай брыгады.** У Вялікую Айчынную вайну тут размяшчаўся штаб 1-й Беларускай партызанскай брыгады.

Брыгада створана паводле ўказання ЦК КП(б)Б 08.04.1942 г. на нарадзе ў в. Шыцікі Віцебскага р-на; прысутнічалі камандзіры атрадаў і груп М.П. Шмыроў, Р.У. Шкрэда, Я.З. Захараў, Д.Ф. Райцаў, А.П. Дзік, П.А. Буруноў і інш., а таксама прадстаўнікі Паўночна-Заходняй аператыўнай групы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, Віцебскага абкама КП(б)Б і аблвыканкама, 4-й Ударнай арміі Калінінскага фронту. Спачатку брыгада налічвала каля 300 партызан і аб’ядноўвала асобна дзейныя атрады М.П. Шмырова (“Бацькі Міная”), А.П. Дзіка (пазней А.Дз. Гурко), Д.Ф. Райцава і М.Ф. Біруліна. Камандзіры брыгады – М.П. Шмыроў (красавік – кастрычнік 1942 г.), Я.З. Захараў (лістапад 1942 г. – лістапад 1943 г.); камісары – Р.У. Шкрэда (красавік – жнівень 1942 г., лістапад 1942 – жнівень 1943 г.), Ц.Р. Кавалеўскі (жнівень – кастрычнік 1942 г., жнівень – кастрычнік 1943 г.); начальнікі штаба Я.З. Захараў (красавік – кастрычнік 1942 г.), І.І. Панчошны (кастрычнік 1942 г. – сакавік 1943 г.), М.С. Емяльянаў (сакавік – верасень 1943 г.), М.А. Золін (верасень – кастрычнік 1943 г.).

На працягу 1942 г. партызаны брыгады сумесна з часцямі 4-й Ударнай арміі вызвалілі ад гітлераўцаў тэрыторыю ўздоўж лініі Сураж–Віцебск–Усвяты, якая ўвайшла ў Суражскую партызанскую зону, ахоўвалі і абаранялі “Віцебскія вароты”. Наносілі ўдары на чыгунках Віцебск – Гарадок, Віцебск – Полацк, на шашэйных дарогах Віцебск – Гарадок, Віцебск – Полацк, Віцебск – Сураж – Веліж, па воднай камунікацыі на р. Заходняя Дзвіна ад Веліжа да Віцебска. Каля в. Галевічы знаходзіўся партызанскі аэрадром, дзе базіраваліся самалёты 105-га гвардзейскага авіяпалка, які абслугоўваў Суражскую партызанскую зону. 26.10.1943 г. брыгада ў складзе 5 атрадаў (756 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй. Камандзіру брыгады М.П. Шмырову ў 1944 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У 1960 г. у гонар партызан на будынку камбіната бытавога абслугоўвання ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Зараз шыльда прымацавана да валуна і знаходзіцца каля будынка сельскага савета.

**К: 55°30’25.2”N 30°46’36.8”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 187; Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Документы и материалы. Т. 1. – Мн., 1967; Жилянин Я., Позняков И., Лузгин В. Без линии фронта. – Мн., 1975; Погорелов А.А. У “Суражских ворот”. – Мн., 1980.*



**Мемарыяльная дошка ў гонар аднаўлення савецкай улады.** На будынку выканкама сельсавета. Устаноўлена ў 1976 г. у гонар аднаўлення ў красавіку – верасні 1942 г. Савецкай улады, дзейнасці Запольскага сельскага савета (старшыня А.І. Жыльцоў), і калгасаў імя І.В. Сталіна, імя С.М. Кірава, “Герой працы” і “Чалюскін”.

**К: 55°30’25.2”N 30°46’36.8”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 187.*






**Помнік “Віцебскія вароты”.** У цэнтры вёскі. У выніку наступлення Чырвонай Арміі зімой 1941–1942 гг. часці 4-й Ударнай арміі ў баях супраць гітлераўцаў падышлі да Суражскага і Механаўскага р-наў Віцебскай вобл. На дапамогу Чырвонай Арміі прыбылі партызанскія атрады М.Ф. Біруліна, М.І. Дзьячкова, М.П. Шмырова, Я.З. Захарава, С.Т. Воранава. Сумеснымі баявымі дзеяннямі савецкіх воінаў і партызан была ачышчана ад ворага дарога Усвяты – Сураж ад раённага цэнтра Усвяты Смаленскай вобл. да в. Тарасенкі Віцебскага р-на. У лютым – сакавіку 1942 г. у гітлераўскай абароне ўтварыўся 40-кіламетровы пралом, які назвалі “Віцебскімі (Суражскімі) варотамі”. Іх утрымлівалі воіны 4-й Ударнай арміі і партызаны 1-й і 2-й Беларускіх брыгад. Яны адыгралі значную ролю ў разгортванні партызанскага руху на Віцебшчыне, дастаўцы боепрыпасаў, медыкаментаў для партызан. Праз «вароты» было эвакуіравана ў савецкі тыл каля 200 тыс. чалавек (жанчын, старых і дзяцей), адпраўляліся абозы з прадуктамі ў фонд Чырвонай Арміі. У маі – чэрвені 1942 г. байцамі 1-й Беларускай партызанскай брыгады было сабрана і перапраўлена ў Савецкі фонд абароны каштоўнасцяў на 7 млн рублёў. Паміж атрадамі, штабамі 1-й Беларускай партызанскай брыгады і часцямі Чырвонай Арміі, а таксама Віцебскім абкамам і аблвыканкамам, якія размяшчаліся на тэрыторыі Усвяцкага і Веліжскага р-наў Смаленскай вобл., была ўстаноўлена тэлефонная сувязь.



25.09.1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі значнымі вайсковымі сіламі пачалі наступленне з Віцебска, Суража і гарнізонаў в. Краслевічы Суражскага р-на, каб ліквідаваць “Віцебскія вароты”. Пасля цяжкіх баёў супраць карнікаў партызаны вымушаны былі адступіць. 28.09.1942 г. “Віцебскія вароты” былі закрыты.

У 1977 г. у памяць аб гэтых падзеях пастаўлены помнік (скульптар В. Ягадніцкі; бетон; вышыня пілонаў 11 і 9 м) – 2 расшыраныя ўнізе пілоны і стэла. Паміж пілонамі праходзіць вузкая, выкладзеная бетоннымі плітамі дарога, што сімвалізуе “Віцебскія вароты”. Пілоны ў цэнтры апяразвае разарваны фрыз з рэльефнымі выявамі твараў воіна і партызана. Над імі – контурная выява пяціканцовай зоркі. Стрыманую эмацыянальнасць помніка падкрэсліваюць касы зрэз верхавіны пілонаў і суровая фактура бетону са слядамі апалубкі. Замыкае кампазіцыю стэла на 2 апорах, размешчаная па цэнтральнай восі ансамбля. Уздоўж дарогі – газоны.

**К: 55°29’59.0”N 30°46’28.1”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 187–188; Погорелов А.А. У “Суражских ворот”. – Мн., 1980; Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941–1944 годы). – Мн., 1961.*

## в. ЗАРОНАВА, Заронаўскі сельсавет

**Воінскія могілкі (№ 4407).** У цэнтры вёскі. На 2020 г. на воінскіх могілках пахаваны астанкі 10400 савецкіх салдат, партызан (СУВВЗ), якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі сельсавета ў 1941–1944 гг. Пазней на могілкі былі перасены парэшткі салдат 43-й арміі з 14 пахаванняў навакольных вёсак, што загінулі зімой–летам 1944 г. пры вызваленні вёсак Варанова, Бліны, Іванова, Палойнікі, Тапорына.

У 1958 г. на пахаванні пастаўлены бетонны абеліск. У 1979 г. па ініцыятыве кіраўніцтва мясцовага саўгаса У.В. Маладзечкіна, В.С. Ламаносава на вайсковых могілках быў збудаваны мемарыял. Аўтары помніка: В. Шаронаў, В. Данілаў, Р. Кавалёў, В Вішнякоў.

*Абеліск у Заронава. 1953*
*Фота. 1973*



На магіле пастаўлены 3 пілоны, злучаныя між сабой з барэльефамі танкіста, пехацінца, лётчыка. На невысокай сцяне выява ордэна Айчыннай вайны і словы-прысвячэнні: “Вечная слава героям, павшим в борьбе за свободу и независимость нашей Родины”. Перад манументам размешчаны металічныя дошкі з імёнамі пахаваных байцоў. У 1980–2010-я гг. адбылося яшчэ 8 перапахаванняў. На могілках праводзяцца перапахаванні астанкаў салдат, якія выяўляюцца на тэрыторыі сельсавета ў выніку даследаванняў 52-га асобнага пошукавага спецыялізаванага батальёна разам з грамадскімі пошукавымі арганізацыямі.

**К: 55°18’11.4”N 29°53’17.2”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 189; Вспомним всех поименно / сост. О.В. Молодечкин. – Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2009. – 132 с.; Заронаўшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: невядомыя і малавядомыя старонкі // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: матэрыялы рэспуб. навук.-практ. канф., 24 чэрв. 2004 г. – Віцебск: ВДУ. – С. 36–39; пашпарт ВП № 4407.*

*Асноўны элемент мемарыяла ў Заронава. 2020*



**Мемарыяльны знак ветэранам і загінуўшым жыхарам сельсавета.** Бетонны абеліск у выглядзе разгорнутай кнігі, на старонках якой адбіты імёны 129 ветэранаў-землякоў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія былі прызваны з Заронаўскага сельсавета ці пражывалі на яго тэрыторыі пасля вайны. На другой сімвалічнай старонцы адбіты імёны 237 жыхароў сельсавета, якія загінулі пад час ваенных дзеянняў. Усталяваны летам 2020 г. на тэрыторыі мемарыяльнага комплекса вайсковых могілак (№ 4407).

**К: 55°18’11.4”N 29°53’17.2”E.**



**Мемарыяльная дошка ў гонар лётчыкаў 3-й паветранай арміі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Заронаўскага і Лятчанскага сельскіх саветаў.** На воінскіх магілках. У памяць 99 лётчыкаў, якія загінулі ў гады вайны. На шыльдзе з чорнага граніту размешчаны прозвішчы лётчыкаў і выява самалёта.

Урачыста ўстаноўлена ў 2015 г. па рашэнні Віцебскага райвыканкама пры фінансавай падтрымцы Фонду міру.

**К: 55°18'11.4"N 29°53'17.2"E.**

**Мемарыяльная дошка ў памяць пра камандны пункт 43-й арміі.** На будынку Народнага музея "Гісторыя Заронаўскага краю". Надпіс: "В д. Белянки находился командный пункт командующего 43-й армией генерала Белобородова А.П. В период проведения операции «Багратион» в июне 1944 года КП посещали генерал Баграмян И.Х., маршал СССР Василевский А.М., маршал артиллерии Чистяков М.Н. От администрации Шелеховского муниципального образования Иркутской области".

**К: 55°18'05.3"N 29°53'18.6"E.**

*Літ. і К.: Нікіціна Л.К. Устанавілі мемарыяльную дошку А. Белабародаву, перазахавалі астанкі загінуўшых // ЖП. – 2004. – ліпень.*





# I



## в. ІВАНОВА, Заронаўскі сельсавет

**Курган у гонар сям’і Залескіх.** Знаходзіцца на месцы былой вёскі, цяпер урочышча Варанова. У гады Вялікай Айчыннай вайны дом  Залескіх выкарыстоўваўся ў якасці “паштовай” скрыні для партызан. У 1990 г. на месцы, дзе стаяў дом Залескіх па ініцыятыве ветэранаў г. Віцебска, райкама камсамола быў насыпаны курган і ўстаўлена мемарыяльная шыльда з надпісам: ”Тут стаяў дом сям’і Залескіх, якія служылі у 1941–1944 гадах паштовай скрыняй для партызан”.

**К.: 55°21’16.7”N 29°53’53.7”E.**

*Літ. і К.: Нікіціна Л.К. Любоў і боль майго Заронава. – С. 43.*



## в. ІЛЫЧОЎКА, Шапечанскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4464).** На грамадзянскіх магілках, за 300 м на поўдзень ад вёскі. Металічны абеліск у выглядзе піраміды з зоркай наверсе. На шыльдачцы надпіс: “Братское захоронение воинов 277-й сд 5-й армии 3-го Белорусского фронта погибших при освобождении д. Ильичевка (Старобобылье) 23 июня 1944 года. Имена Ваши неизвестны. Подвиг – Бессмертен”. Пахаваны 6 салдат. Імёны невядомы.

**К: 54°57’49.5” 30°20’36.8”.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4464.*



# К



## в. КАВАЛЬКІ, Заронаўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4412).** За 2,5 км ад вёскі, на грамадзянскіх могілках. На магіле пастаўлены металічны помнік у выглядзе стэлы з надпісам: “Летчики-истребители 976 ИАП 259 ИАД Чуваткин Федор 1922 – погиб 20 марта 1944, Смирнов Дмитрий 1923 – погиб 20 марта 1944 г. Вечная память вам, храбрые соколы”. Пахаваны лётчыкі-знішчальнікі экіпажа самалёта Як-7 976 ЗАП 259 ЗАД Фёдар Чуваткін (1922–22.03.1944) і Дзмітрый Смірноў (1923–22.03.1944). Ушанаванне памяці адбылося дзякуючы працы краязнаўцы Барыса Якаўлевіча Леганькова.

**К: 55°16’26.1”N 30°00’54.3”.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4412; Легоньков Б.Я. А доля іх невядома... [Гібель самалёта Як-7 20.04. 1944 г.] // Герой працы. – 1993. – № 23. – С. 2.*



## в. КАЗАКОВА, Запольскі сельсавет

**Месца баёў 1942 г.** На ўскраіне вёскі, каля дарогі Сураж – Веліж. У пачатку верасня 1942 г. гітлераўцы пачалі карныя аперацыі супраць партызан Віцебскай вобл. з мэтай ліквідацыі прарыву лініі фронту, так званых “Віцебскіх (Суражскіх) варот”. У ноч з 24 на 25 верасня з Суража пачалося наступленне карнікаў у раёне дзеяння 1-й Беларускай партызанскай брыгады. У раёне вёсак Пунішча і Казакова, дзе займаў абарону атрад імя Р.С. Курмялёва, разгарэліся ўпартыя баі. Партызаны знішчылі каля 300 гітлераўцаў і 2 танкі.

У 1972 г. на месцы баёў пастаўлены помнік, устаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам: “Здесь на рубеже деревень Пунище–Казакова–Пуховичи–Березовка с апреля по октябрь 1942 г. в активной обороне стоял отряд Г.С. Курмелева 1-й Белорусской партизанской бригады и удерживал со стороны Сурожского вражеского гарнизона разрыв в линии фронта, идущий до Усвят, получивший название «Витебские ворота»”.

**К: 55°28’14.1” 30°44’10.5”.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 189.*



## в. КАЗАНАВА, Бабініцкі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 2295).** За 400 м на паўночны ўсход ад вёскі. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 59 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па ўдакладненых звестках, у магіле пахаваны 159 савецкіх салдат (СУВВЗ). У 1956 г. на могілках пастаўлены бетонны абеліск з зоркай. Пазней заменены на высокую стэлу. На шыльдзе надпіс: “Они пали смертью храбрых за свободу и независимость нашей великой Родины. 1941–1945”. Перад помнікам на масіўным бетонным надмагільным помніку металічныя пліты з імёнамі пахаваных салдат. Пахаванне мае металічную агароджу.



**К: 55°17’57.6” 30°32’17.5”.**

*Літ. і К.: ЗП-ГіКБ. Вв. – С. 190; пашпарт ВП № 2295.*

## в. КАМАРЫ, Ноўкінскі сельсавет

**Магіла невядомага салдата (№ 2300).** Знаходзіцца насупраць малочна-таварнай фермы “Камары”, насупраць д. 22 па вул. Цэнтральнай, за ручаём. Абеліск з мармуровай крошкі з надпісам: “Имя твое неизвестно, подвиг твой не забыт”. Вакол пахавання маецца металічная агароджа, тэрыторыя выкладзена пліткай. Пахаваны невядомы савецкі салдат, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны. На магіле ўсталяваны абеліск.

**К: 55°08’58.5” 30°02’55.3”**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 2300.*



*Стары абеліск*



*Сучасны помнік*

## в. КАМЕНКА, Задуброўскі сельсавет

**Індывідуальнае пахаванне (№ 4071).** У цэнтры вёскі, каля д. 9 па вул. Міра. Металічны абеліск з зоркай. Маецца драўляная агароджа. Пахаваны невядомы салдат.

**К: 55.33369104 30.70819258.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4071.*



## в. КАНЬКІ, Запольскі сельсавет

**Брацкая магіла ахвяр вайны.** Вёска Канькі знаходзілася за 4 км ад в. Сібякі. На грамадзянскіх могілках за 0,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на выспе правага берага р. Дзвіна. На магіле ўсталявана металічная піраміда з невялікім крыжом наверсе. Да крыжа прымацаваны маленькі абраз Георгія Пераможцы. На помніку металічная шыльда з нержавеючай сталі з надпісам: “Вечная память. Погибли 1942 г. Бабуров К.Ф., Кузьменко Ф.Т., Авчинников И.Н.”.

**К: 55°20’01.3”N 30°42’29.5”E.**

*Літ. і К.: Vk.com/topic-29914100_40767185.*






## в. КАСАЧЫ, Шапечынскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 2299).** На грамадзянскіх могілках, за 1 км на поўнач ад вёскі. Металічны абеліск складанай формы з зоркай наверсе. Маецца металічная агароджа. Да абеліска прымацаваны некалькі металічных шыльдачак з імёнамі пахаваных: Радавы Данілін Астап Васільевіч (1899–1944), радавы 215-й сд Боўт Сяргей Паўлавіч (1908–24.03. 1944); радавы 11-га сп 215-й сд Гусейнаў Абдул Гусейнавіч (1916–22.03. 1944), радавы 444-й осб 371-й сд Квашнін Акім Трафімавіч (1901–21.04.1944), чырвонаармеец Калеснікаў Васіль Мітрафанавіч (1921–1941), чырвонаармеец Леанцёнак Андрэй Пятровіч (1920–1941).

**К: 55°00’43.9”N 30°21’13.7”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 2299.*



## в. КНЯЖЫЦА, Лятчанскі сельсавет

**Магіла Курбакова Івана Фёдаравіча (№ 4427).** На заходняй ускраіне вёскі, каля чыгуначнай станцыі Княжыца. Камандзір штабнога ўзвода асобнай роты сувязі 6-й сд Унутраных войск НКВД лейтэнант І.Ф. Курбакоў пры перадыслакацыі штаба дывізіі з Віцебска ў г. Вілейку 28.07.1944 г. пры самастойным аглядзе трафейнай гарматы, якая аказалася заражанай, зрабіў стрэл. У выніку ўдару адкатнага механізму ў грудзі, л-т Курбакоў памёр на месцы. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск. Адпаведна СУВВЗ, лічыцца пахаваным у ВП № 4421 у в. Старое Сяло.

**К: 55°10’55.7” N 30°01’11.4”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 190; пашпарт ВП № 4427; Курбаков І.Ф.: https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=10021418.*



## в. КНЯЗІ, Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4456).** На грамадзянскіх могілках, за д. 46 па вул. Князеўская. У 1985 г. лічыліся пахаванымі 96 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Па ўдакладненых дадзеных, у магіле пахаваны 201 савецкі салдат (СУВВЗ). У 1957 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з зоркай. У 2015 г. праведзена рэканструкцыя абеліска, нанесены прозвішчы ўсіх салдат, якія загінулі ў наваколлях вёскі і пахаваны ў магіле.



**К: 55°17’12.3” 30°35’34.4”.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 190; пашпарт ВП № 4456; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4456.html.*

## в. КОЙТАВА, Мазалаўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і мірных жыхароў (№ 4427).** За 300 м на паўднёвы ўсход ад вёскі. Пахаваны 23 воіны, якія загінулі пры вызваленні вёскі ў лютым 1942 г. ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і 2 мірныя жыхары, што загінулі ў 1942 г. ад рук гітлераўскіх карнікаў. Адпаведна звестак СУВВЗ, тут пахаваны толькі 2 салдаты. У 1975 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з металічнай зоркай. Пазней да яго была прымацавана пластыкавая шыльда з прысвячэннем і другая з інфармацыяй: “Воинам 249-й сд, 51-го сб 4-й Ударной армии Калининского фронта, героически павшим на подступах к Витебску в феврале 1942 г. Имена ваши не известны. Но подвиг ваш бессмертен. Благодарные потомки”.

**К: 55°19’02.1” 30°19’16.8”.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 190; пашпарт ВП № 4427.*



**Памятны знак на месцы пераходу 825-га волга-татарскага батальёна на бок партызан.** Непадалёк ад дома-музея І.Я. Рэпіна “Здраўнёва”. У лютым 1943 г. у час правядзення фашыстамі карнай экспедыцыі супраць партызан Віцебскай зоны “Шаравая маланка” на бок партызан перайшоў 825-ы волга-татарскі батальён легіёна “Ідэль-Урал”, які быў сфарміраваны фашыстамі з былых ваеннапалонных – ураджэнцаў Паволжжа. Пераход адбыўся каля вёсак Гралёва, Руба, Сенькава. Легіянеры, якія перайшлі на бок партызан (ад 500 да 900 чалавек), былі размеркаваны між брыгадамі Захарава і Біруліна. Ужо праз некалькі дзён яны ўдзельнічалі ў баях па прарыву варожай блакады, дзе праявілі мужнасць і гераізм у барацьбе з нямецкімі захопнікамі. На валуне размешчана гранітная мемарыяльная шыльда з надпісам пра абставіны падзеі. Аўтары праекта А.А. Нурыеў, А.А. Разакоў, М.С. Хакімаў. Усталяваны ў 2014 г.

**К: 55°19’11.7”N 30°19’48.2”E.**

*Літ. і К.: Гончаров А.А. Первая Витебская партизанская бригада (1941–1943 гг.). – Витебск, 2012. – 321 с.*



## в. КОПЦІ, Акцябрскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4462).** На 1985 г. лічылая, што ў магіле пахаваны 1926 савецкіх салдат і афіцэраў, якія загінулі ў восень 1943 – летам 1944 г. Невядомы імёны 528 салдат. Сюды ў другой палове 1960-х гг. былі перапахаваны астанкі загінуўшых воінаў з разрозненых магіл каля вёсак Зазыбы і Маклакі. У апошні час тут праводзяца пахаванні знойдзеных на месцах былых баёў астанкаў савецкіх салдат у Акцябрскім сельскім савеце.

**К: 55°03’45.5”N 30°20’50.2”E.**

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 571. Воп. 4. Спр. 185. Арк. 6. Пастанова Віцебскага райкама “О предложенниях районной комиссии по увековечению подвигов советских людей на территории района в годы Великой Отечественной войны от 15 июня 1966 г.; пашпарт ВП № 4462.*





**Помнік воінам 36-й курсантскай брыгады, якая змагалася за вызваленне Віцебшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.** У 1988 г. у памяць гэтай падзеі ўзведзены помнік. Рашэннем Віцебскага аблвыканкама ад 27.12.1990 г. месту нададзены статус помніка гісторыі і культуры.

Найбольш верагодна, гэты помнік – вялізны камень з гранітнай шыльдай на “Плошчы Гардова” ў в. Копці. На шыльдзе надпіс: “Площадь Гордова”. Вышэй: “Генерал-полковник Гордов Василий Николаевич Герой Советского Союза. Командующий: Сталинградским фронтом 1942 г.; 33-й армией Западного фронта 1943–1944 гг.; 3-й Ударной Армией 1-го Белорусского и 1-го Украинского фронтов 1944–1945 гг.”. Ніжэй асобная шыльда: “За нашу советскую Родину. 36-я отдельно-стрелковая бригада 33-й армии”. Гэта воінскае злучэнне доўгі час вяло баявыя дзеянні на ўчастку фронту каля Капцей.

**К: 55°03’48.5”N 30°21’04.0”E.**

*Літ. і К.: Памятник воинам 36-й курсантской бригады // Решение исполнительного комитета Витебского областного Совета народных депутатов от 27 декабря 1990 г. № 348 // О дополнении государственных списков недвижимых памятников истории и культуры местного значения.*




**Дзве магілы.** За 2,5 км на паўночны захад ад в. Копці, ва ўр. Харошчына. За 400 м ад дома, які знаходзіцца каля чыгункі Віцебск – Лёзна. Два металічныя помнікі-абеліскі стаяць на вяршыні марэнавай грады. Мясцовыя жыхары кажуць, што было 3 помнікі. Некаторыя сцвярджаюць, што астанкі салдат былі перанесены, але невядома куды. Іншыя, што перапахаванне не праводзілася. Мясцовыя ветэраны і доўгажыхары – В.Д. Цярэшчанка, Радомскі пра помнікі і пахаванні нічога не ведаюць. Вакол шмат слядоў “чорных” капальнікаў, шмат рэчаў, якія засталіся ад часоў вайны.

**К: 55°04’46.2”N 30°20’50.4”E.**





**Воінскі мемарыял у гонар Ленінскага камсамола.** Мемарыял утвораны па ініцыятыве мясцовых жыхароў і ветэрана вайны В.Д. Цярэшчанка на месцы ваенных могілак, дзе пахаваны савецкія салдаты і афіцэры, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Уключае ў сябе Курган Славы і больш за 60 помнікаў, усталяваныя ў розныя часы, у тым ліку: у гонар вызвалення в. Копці і населеных пунктаў Акцябрскага сельскага савета, помнік у гонар воінаў-татарстанцаў, лётчыкам французскай авіяэскадрыллі “Нармандыя–Нёман”, помнік Якаву Джугашвілі, помнік Г.М. Мамонавай, помнік Герою Савецкага Саюза П.А. Галецкаму і шэраг іншых.

У 1995 г. на Кургане ўсталяваны танк Т-62, перададзены Міністэрствам абароны РБ да 50-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Вакол Кургана ўстаноўлены 10 гранітных пліт, на якіх выбіты назвы вёсак і колькасць воінаў 33-й і 39-й армій 3-га Беларускага фронту, якія загінулі пры іх вызваленні. На ўваходзе ў мемарыял пастаўлена сцяна Памяці, на якой нанесена схема аперацыі “Баграцыён”, пералічаны воінскія злучэнні, якія вызвалялі тэрыторыю Акцябрскага с/савета, у склад якога ўваходзяць Копці.

**К: 55°03’45.5”N 30°20’50.2”E.**



Сярод іншых помнікаў, размешчаных на мемарыяле:

**Помнік у памяць пра загінуўшых землякоў.** Помнік пастаўлены ў гонар 99 мясцовых жыхароў, якія не вярнуліся з Вялікай Айчыннай вайны.

**Помнік вязням фашызму.** Прысвечаны ўсім жыхарам Беларусі – вязням фашысцкіх канцлагераў і загінуўшых у выніку нялюдскага акупацыйнага рэжыму, усталяванага гітлераўцамі на тэрыторыі БССР і СССР.

**Помнік Герою Савецкага Саюза Пятру Антонавічу Галецкаму.** Партызан П.А. Галецкі 20.10. 1942 г., праводзячы дыверсію на чыгунцы, кінуўся з выбухоўкай пад цягнік і коштам свайго жыцця знішчыў варожы эшалон.




**Помнік Герою Савецкага Саюза Георгію Сцяпанавічу Грыгор’еву.** У час разведачнай аперацыі 20.01.1944 г., ураджэнец Маскоўскай вобласці, разведчык Г.С. Грыгор’еў быў сур’ёзна паранены. Яго група была блакіравана фашыстамі і адзіны шлях адступлення пралягаў праз міннае поле, якое знаходзілася пад абстрэлам нямецкага ДОТа. Вырываючыся з пасткі, Г. Грыгор’еў сваім целам закрыў амбразуру, коштам свайго жыцця дапамог выратавацца таварышам, якія выконвалі баявое заданне і знішчылі каля 20 гітлераўцаў.

**Помнік Якаву Джугашвілі.** Старэйшы сын І.В. Сталіна, старшы лейтэнант, камандзір 6-й артылерыйскай батарэі 14-га гаўбічнага палка 14-й танкавай дывізіі, 7-га механізаванага корпуса 20-й арміі выходзячы з акружэння, трапіў у палон каля в. Ляснова непадалёк ад Лёзна. У палоне ўтрымліваўся ў некалькіх канцлагерах. Паводзіў сябе мужна і дастойна. Загінуў 14 красавіка 1943 г. у канцлагеры Заксенхаўзен.






**Помнік Васілю Джугашвілі.** Васілій Джугашвілі, малодшы сын І. Сталіна летам 1944 г. удзельнічаў у вызваленні Віцебска, будучы камандзірам 3-й гвардзейскай знішчальнай авіяцыйнай дывізіі.

**Помнік авіяэскадрыллі “Нармандыі–Нёман”.** Усталяваны ў гонар французскага знішчальнага авіяцыйнага палка, які ваяваў пад час Вялікай Айчыннай вайны на савецка-германскім фронце. Усяго ў вызваленні Беларусі бралі ўдзел больш за 50 экіпажаў французскіх лётчыкаў. Воінскае злучэнне ўдзельнічала ў вызваленні Лёзненшчыны, Аршаншчыны, Талачыншчыны. У ліпені 1943 г. эскадрылля была рэарганізавана ў 1-ы асобны знішчальны полк. Непадалёк ад Капцей, каля в. Дубраўка знаходзіўся палявы аэрадром авіяпалка.

**Помнік на магіле Г.М. Мамонавай.** Ганна Мікалаеўна Мамонава працавала да вайны хірургам-стаматолагам у Віцебску. У часы вайны яна вымушана была з’ехаць у вёску і працавала ў мясцовым шпіталі. Таемна ад немцаў яна аказвала дапамогу партызанам. Аднаго разу, распусціўшы чуткі аб тым, што ў вёсцы пачынаецца эпідэмія, дамаглася таго, што ў бальніцы аб’явілі карантын. Такім чынам, на некаторы час дактары змаглі бесперашкодна лекаваць партызан прама ў вёсцы. Аднойчы над вёскай быў збіты савецкі самалёт. Лётчык Мікалай Багданаў быў паранены, але змог выратавацца. У партызанскім лагеры Ганна Мамонава аказала яму дапамогу, але калі яна вярнулася ў вёску, фашысты схапілі яе і расстралялі разам з малалетнімі дзецьмі.

**Помнік у гонар воінаў-татарстанцаў.** Помнік усталяваны татарстанцамі у гонар сваіх землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на Віцебшчыне. За вызваленне Беларусі 6 татарстанцаў атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. 23 чэрвеня 1944 г. Бары Шаваліеў паўтарыў подзвіг А. Матросава. За прарыў фашысцкай абароны і фарсіраванне Дзвіны званне Героя Савецкага Саюза атрымаў капітан Булат Янціміраў і Валі Хазіеў. Мемарыял прысвечаны не толькі воінам кадравага войска, але і 825-га волга-татарскага батальёна легіёна “Ідэль-Урал”, які перайшоў на бок партызан 23.02.1943 г.

*Літ. і К.: Витебский район: Жемчужины Беларуси. – С. 16; Терещенко В.Д. Жизни не щадя [баі 39-й арміі пад Копцямі] // ЖП. – 2002. – 15.10.; Терещенко, В.Д. Боевое крещение [баі пад в. Копці] // ЖП. – 2003. – 4 марта; Кухарева В.Т. Живи и помни [мемарыяльны комплекс у в. Копці] // ЖП. – 2004. – № 64. – С. 2; Терещенко В.Д. Шли в бой “панцирники” // ЖП. – 2006. – 5 сент. – С. 4.*











**Манумент “Белыя журавы”.** Помнік у выглядзе 3-х штыкоў, узнятых уверх, на якіх выявы жуpавоў – сімвалаў загінуўшых салдат, душы якіх узносяцца ў неба. Гэта апошні помнік на “Лініі вечнай памяці” мемарыяла ў Капцях. Адкрыты ў маі 2020 г. Помнік сімвалізуе памяць пра салдат, якія загінулі пры вызваленні Віцебскага раёна ў гады вайны. Побач 17 мармуровых пліт з імёнамі 1290 салдат, якія загінулі пры вызваленні Капцей.



## в. КОТАВА, Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4452).** На заходняй ускраіне вёскі, за д. 11 па вул. Зарэчнай. У 1985 г. лічыліся пахаванымі 477 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Па ўдакладненых дадзеных, у магіле пахаваны 986 савецкіх воінаў і партызан (СУВВЗ).

У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск – скульптура воіна, які схіліў калена на пастаменце і надмагільныя помнікі. У 2013 г. праведзена рэканструкцыя абеліска. Пастамент абкладзены чорным гранітам, усталяваны пліты з чорнага граніту, на якія нанесены імёны пахаваных. У 2016 г. усталявана індывідуальная пліта ст. лейтэнанта Р.Д. Антадзэ, у 2019 г. капітана М.Г. Рэзбаева, імёнаў якіх няма на агульных плітах. Пахаванне мае статус ГКК.

**К: 55°13'13.9"N 30°36'31.6"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 190; пашпарт ВП № 4452; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4452.html*



**Брацкая магіла ахвяр вайны (№ 7516).** На невялікім узвышшы каля р. Выснянка, за д. № 30 па вул. Цвяточная, у накірунку в. Прывольная. Пахаваны жыхары в. Піхцяі, забітыя фашыстамі 15.01.1943 г.: Арлоўская Варвара Макееўна і яе дзеці Саша, Маша і немаўля.

"...Жителей деревни Пихтяи тоже выгнали из домов и приказали идти в Котово, будто бы их вместе с детьми вызывает немецкий комендант. Их собрали на окраине деревни и расстреляли. Женщине с девочкой удалось добежать до луга, но их догнали и убили. Трупы хоронить строго запретили.

Палачи продолжали зверствовать. Через некоторое время они схватили жену партизана Николая Фомича Орловского Варвару Макеевну и троих детей. Самый маленький у неё был грудной. Их привели к дереву, возле которого лежали трупы ранее расстреляных. Пригнали жителей деревни и объявили им, что это – партизанка, её повесят и что со всеми партизанами будет то же.

Свидетели этой чудовищной расправы рассказывали, что женщина ни о чем не просила, не упала перед палачами на колени. Люди видели её омертвевшее лицо и крепко сжатые губы...

Замученные были потом похоронены на месте бывшего исполкома Котовского сельсовета. Всего их было 24".

У пасляваенны час на магіле быў усталяваны помнік і невялікая агароджа. У 2015 г. на магіле пастаўлены новы помнік В.М. Арлоўскай і яе дзецям. Крыж з чорнага граніту з надпісам: "Здесь покоятся жена партизана Орловская Варвара Макеевна, ее дети Саша, Маша и грудной ребенок, казненные карателями 14 января 1943 года. Упокой, Господи, души невинно убиенных". У 2018 г. тут перапахаваны яшчэ 10 мірных жыхароў. У 2019 г. на іх магіле устаноўлена пліта з імёнамі 19 мірных жыхароў в. Піхцяі, якія былі расстраляны ў в. Котава. Пахаванне мае металічную агароджу. Побач усталяваны драўляны праваслаўны паклонны крыж.

**К: 55°13'06.8"N 30°36'51.3"E.**

*Літ. і К.: СУВВЗ; пашпарт ПАВ № 7516; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 231.*



**Брацкая магіла ахвяр вайны.** На грамадзянскіх могілках. На помніку надпіс: “Королевы Даниил, Мария, Домна, Шура, Тася. Погибли в 1943 г.”.

*Літ. і К.: Королев Данила Сергеевич 1887 к-з Рассв. Победителя (д. Пихтяи). № 294 в списке погибших по Котовскому с/с (ГАВО. – Ф. 256. Оп. 1. Д. 1. Л. 92).*

**Магіла ахвяр вайны.** На грамадзянскіх могілках. На металічным крыжы шыльдачка з надпісам: “1885 Крузо Даниил Прокопович, 1879 Крузо Анна Андроновна 1942”.

*Літ. і К.: Крузова Анна Андроновна 1870 к-з им. Буденного (д. Котово) № 10 в списке погибших по Котовскому с/с (ГАВО. – Ф. 256. Оп.1. Д. 1. Л. 85).*

**Магіла ахвяр вайны.** На грамадзянскіх могілках. На металічным крыжы шыльдачка з надпісам: “Миронов Лентий Иванович 1901. Убит 20.01. 1943”.

*Літ. і К.: Миронов Леон Иванович 1905 к-з Заветы Ильича (д. Кроты) № 256 в списке погибших по Котовскому с/с (ГАВО. – Ф. 256. Оп. 1. Д. 1. Л. 91).*









**Магіла ахвяр вайны.** На грамадзянскіх могілках “Лаза” в. Котава. На помніку фота, шыльдачка з надпісам: “Морозов Данила Анисимович 1892–1942”.

*Літ. і К.: Морозов Данила Анисимович 1895 к-з Рассв. Победитель (д. Пихтяи) № 113 в списке погибших по Котовскому с/с (ГАВО – Ф. 256. Оп. 1. Д. 1. Л. 88).*

**Магіла ахвяры вайны.** На грамадзянскіх могілках. На бетонным абеліску шыльда з тэкстам: “Кириленко Александра Михайловна 1888–1942 г. Помню и скорблю. Племянница”. Раней, на магіле № 4452 была шыльда “Кириленко Александра Михайловна 1888–1942. Погибла от рук предателя, изменника Родины”. Пасля рэканструкцыі знята.

*Літ. і К.: Інфармацыя В. Марозава.*






*Старая таблічка на магіле А.М. Кірыленка*

## в. КРАЎЦОВА, Задуброўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх войнаў (№ 4401).** У цэнтры вёскі, па вул. Шашэйнай, каля дарогі Віцебск – Сураж. Пахаваны 116 воінаў, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па ўдакладненых дадзеных, у магіле пахаваны 139 савецкіх салдат (СУВВЗ). У 1963 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з металічнай зоркай наверсе на вялікім падмурку з мармуровай дошкай з інфармацыяй аб пахаванні. У 1988 г. абеліск заменены на стэлу, на верхняй частцы якой змешчаны сімвалічныя барэльефы мірнай жыхаркі, салдата і партызана. На шыльдзе надпіс: “Вечная слава павшим в боях за освобождение и независимость нашей Родины. 1941–1945 гг.”. Ніжэй выява галінкі лаўра. Па абодвух баках манумента 4 бетонныя надмагільныя помнікі з плітамі, на якія нанесены імёны пахаваных салдат. Маецца агароджа з цагляных слупоў і металічных ланцугоў.

**К: 55°22’03.8”N 30°40’11.1”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 190; пашпарт ВП № 4401.*



## в. КУЗЬМЯНЦЫ, Шапечынскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4445).** На могілках ва ўрочышчы Шаркі. На 1973 г. лічылася, што тут пахаваны 380 воінаў, якія загінулі ў 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Цяпер на ўліку ў СУВВЗ тут знаходзяцца 1107 салдат. З іх невядомы імёны 133 асоб. У 1957 г. на магіле пастаўлены металічны абеліск з зоркай у драўлянай агароджы. Пазней праводзіліся перапахаванні знайдзеных астанкаў савецкіх салдат. Зараз стаяць яшчэ 2 металічныя абеліскі і металічны помнік са словамі: “Братское захоронение воинов Красной Армии, погибших в боях за деревню Мяклово”. У 2013 г. усталяваны надмагільныя помнікі з плітамі, на якія нанесены імёны загінуўшых салдат. У 2018 г. усталяваны новыя пліты. Маецца металічная агароджа. Пахаванне мае статус ГКК.

**К: 54°59’47.7”N 30°15’06.6”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 190; пашпарт ВП № 4445.*



**Памятны знак 251-й стралковай дывізіі.** Бетонны абеліск з зоркай усталяваны ў памяць байцоў 251-й сд, якая несла вялікія страты ў баях на берагах р. Лучоса каля в. Шаркі. На абеліску выбіты надпіс “Воинам 251-й стрелковой дивизии от благодарных потомков. Здесь при освобождении Белоруссии на подступах к Витебску во время разведки боем с 17 по 21 июня 1944 г. дивизия потеряла более 1200 человек. Вечная память и низкий поклон”. Таксама прымацавана шыльдачка з імёнамі некалькіх салдат.



## в. КУКАВЯЧЫНА, Ноўкінскі сельсавет

**Шыльды на радзіме П.Л. Грышчанкі.** Памятная дошка з тэкстам “Отчий дом Петра Лукъяновича Грищенко” ўсталявана на доме, дзе нарадзіўся Герой Савецкага Саюза. Другая дошка з інфармацыяй пра лётчыка знаходзіцца на доме № 15 па вуліцы Р. Грышчанка: “Улица названа в память Петра Лукъяновича Грищенко, уроженца д. Куковячино, Героя Советского Союза. Летчик-истребитель П.Л. Грищенко окончил Витебский аэроклуб, Армавирскую военную авиашколу пилотов, Военно-воздушную академию”. Камандзір звяна знішчальнага авіяпалка П.Л. Грышчанка ваяваў на фронце з сакавіка 1943 г. Удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі, Берлінскай аперацыі. Зрабіў 380 баявых вылетаў, правёў 78 паветраных баёў, збіў 27 нямецкіх самалётаў і аэрастат. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 01.07.1944 г. Памёр 21.12.1973 г.

**К.: 55°09’00.0”N 30°00’29.7”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 190; Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984; Пучкова Е. Улица имени Героя уходит в небо // Витьбичи. – 2018. – 13 июня. – С. 3.*



## в. КУРЫНА, цэнтр сельсавета

**Магіла Сільніцкага Міхаіла Фёдаравіча (№ 4417).** На грамадзянскіх могілках. Герой Савецкага Саюза М.Ф. Сільніцкі нарадзіўся 20.11.1921 г. у в. Зполле Курынскага с/с (зараз не існуе) Віцебскага р-на ў сям'і селяніна. У Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941 г., потым кулямётчык партызанскага атрада Д.Ф. Райцава партызанскай брыгады імя Чырвонасцяжнага Ленінскага камсамола. Вызначыўся ў баі супраць карнікаў 28.03.1942 г. Партызаны сустрэлі ворага ў раёне вёсак Платы і Курына. Пяць гадзін цягнуўся напружаны бой, і партызаны вымушаны былі адступіць. М.Ф. Сільніцкі прыкрываў адыход атрада. Калі скончыліся патроны, акружаны гітлераўцамі, мужны партызан адбіваўся нажом і загінуў у рукапашным баі. 15.05.1942 г. М.Ф. Сільніцкаму першаму сярод партызан-камсамольцаў Беларусі прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імя было прысвоена партызанскаму атраду, калгасу ў Полацкім р-не, Курынскай школе, каля чыгуначнай станцыі Лужасна пастаўлена стэла (гл. арт. “Помнік Сільніцкаму Міхаілу Фёдаравічу”. – С. 59).



*Драўляны помнік на магіле М. Сільніцкага*

У 1945 г. на магіле пастаўлены драўляны абеліск, у 1952 г. – помнік з цэглы, 1957 – з мармуру, у 1987 г. – мемарыяльная кампазіцыя: шматвугольная бетонная сцяна з прарэзанай стылізаванай зоркай. Выкарыстаны мармур, бетон, граніт. На помніку надпіс: “Герой Советского Союза Сильницкий Михаил Фёдорович 20.10.1921–28.03.1942”. Помнік мае статус ГКК.

**К: 55°22'35.6"N 30°26'36.7"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 190–191; пашпарт ВП № 4417; Люди легенд. – М., 1966; Калинин П.З. Партизанская республика. – 2 изд. – Мн., 1968; Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Документы и материалы. Т. 1. – Мн., 1967; Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984.*



*Помнік на магіле М. Сільніцкага. 2018*

**Магіла Лапікава Івана Сямёнавіча (№ 4418).** На могілках, побач з магілай М. Сільніцкага. Партызан атрада Д.Ф. Райцава – І.С. Лапікаў загінуў разам з баявым сябрам Героем Савецкага Саюза М.Ф. Сільніцкім 28.03.1942 г. у баі супраць нямецкіх карнікаў каля в. Платы. У 1966 г. на магіле пастаўлены гранітны абеліск з надпісам: “Лапиков Иван Семенович погиб в борьба с немецко-фашистскими захватчиками 28.03.1942”.

**К: 55°22'35.6" 30°26'36.7".**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 190–191; пашпарт ВП № 4418; Люди легенд. – М., 1966; Калинин П.З. Партизанская республика. – 2 изд. – Мн., 1968.*




**Пахаванне партызан.** За бальніцай, у хвоях ёсць мясцовыя невялікія могілкі. Каля пахаванняў Забаўленкаў і Перапечаных знаходзіцца магіла часоў вайны. Па звестках адных, тут пахаваны 3 дзяўчыны, якіх расстралялі фашысты. Па звестках іншых, тут пахаваны партызан, які пераплыў Дзвіну, але яго злавілі фашысты і расстралялі.

**К: 55°21'57.5"N 30°25'42.0"E.**

Л



## в. ЛАТЫГАВА (каля былой в. Рабцава), Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4457).** За 700 м на паўднёвы захад ад вёскі. Раней прывязка давалася па в. Рабцава, якая зараз не існуе. У магіле пахаваны 73 савецкія воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну пры вызваленні раёна.

У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск. У 2016 г. дзякуючы фінансавай дапамозе Лідзіі Чарненка, унучцы пахаванага тут Г.Д. Макарава, зроблена добраўпарадкаванне магілы. Абеліск заменены на пліты з чорнага граніту, на якія нанесены імёны пахаваных байцоў.

**К: 55°17’10.4”N 30°37’52.9”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 191; пашпарт ВП № 4457; Братская могила № 4457 // Ценою жизни // http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4457.html.*




## в. ЛЕБАРТОВА, Вымнянскі сельсавет

**Індывідуальная магіла невядомага салдата (№ 6676).** На мясцовых могілках, насупраць д. 1 па вул. Зарэчнай. На помніку, зробленаму з бетоннай крошкі, надпіс: “Здесь покоится неизвестный солдат. Погиб в июле 1941”.

**К: 55°14’21.3”N 30°27’48.1”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 6676.*



## в. ЛЁТЦЫ ВЯЛІКІЯ, Лятчанскі сельсавет

**Памятны знак у гонар 70-годдзя Перамогі.** Знак усталяваны каля галоўнага корпуса (былога) Вяліка-лятчанскага дзіцячага дома. На помніку з чорнага граніта выбіты надпіс: “Никто не забыт, ничто не забыто. 70 лет Великой Победы. Память павшим. Май 2015”.

**К.: 55°11’52.2”N 29°58’04.9”E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы палявой экспедыцыі 2017 г.*




## в. ЛЁТЦЫ МАЛЫЯ, Лятчанскі сельсавет

**Магіла савецкіх чыгуначнікаў і салдат.** У цэнтры грамадзянскіх могілак. Бетонны помнік з металічнай зоркай і шыльдай з надпісам: “Одинадцать неизвестных железнодорожников, погибших в 1941 г.”. У магіле пахаваны чыгуначнікі і савецкія воіны, якія загінулі ў час бамбёжкі станцыі нямецкімі самалётамі 8.07. 1941 г. Помнік пастаўлены ў 1954 г. работнікамі сельсавета. Па звестках М.Д. Юшкевіч, там пахаваны начальнік чыгуначнай станцыі Біднэўскі, дзяжурны па станцыі Іван Сцяпанаў, дзяжурны па станцыі Аляксандр Андрэевіч Васілевіч, пуцявы рабочы ст. Сіроціна Бакуін, санітарка бальніцы Алісава, машыніст і качагар паравоза (прозвішчы не ўстаноўлены), міліцыянер Калатоўкін. У магіле таксама пахаваны некалькі савецкіх салдат, якія загінулі ў баі з нямецкімі матацыклістамі ў 1941 г.



**К: 55°12’53.1”N 29°54’55.9”E.**

*Літ. і К.: Юшкевич М.Д. Лучи памяти. – Витебск: б.м., 2016. – С. 53.*

**Магіла невядомага салдата.** На грамадзянскіх могілках. Металічны абеліск з накладной зоркай. Інфармацыйная шыльда страчана.

**К.: 55°11’52.2”N 29°58’04.9”E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы В. Васілеўскай, Н. Пішчулавай.*



## в. ЛЁПІНА, Янавіцкі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4449).** На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 227 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Па звестках СУВВЗ, у магіле пахаваны 197 савецкі салдат. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**К.: 55°20'06.0"N 30°47'02.0"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 191; пашпарт ВП № 4449.*



*Абеліск. 1958*
*Фота. 1973*

*Сучасны выгляд помніка*



## в. ЛІПАЎЦЫ, Шапечынскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** За 1 км ад вёскі, на 21 км аўтамагістралі Віцебск – Орша (Старааршанская шаша). Пахаваны 4 воіны 247-й сд 72-га ск 5-й арміі 3-га Беларускага фронту, якія загінулі пры вызваленні пасёлка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па нумары медаля "За баявыя заслугі" ўстаноўлена імя ст. сяржанта Іванова Дзмітрыя Трафімавіча. Астанкі салдат знайшлі студэнты будаўнічага атрада мастацка-графічнага факультэта ВДПІ імя С.М. Кірава, якія ўзводзілі тут жывёлагадоўчы комплекс. Ініцыятарам стварэння манумента стаў Я. Угорцын, праект помніка распрацаваў С. Баркуноў. Манумент у выглядзе зоркі між бетонных пліт на магіле быў пастаўлены ў 1976 г.

На металічнай шыльдзе надпіс: "Здесь в 1944 году вели ожесточенные бои с немецко-фашистскими захватчиками воины 277-й стрелковой дивизии. Живым и павшим, но победившим. Память о вас вечна. Дела ваши бессмертны". У СУВВЗ не ўключана. У ЗПГіКБ прывязваецца да в. Акцябрская. Адна з вуліц дачнага кааператыва "Звездочка", на тэрыторыі якога загінулі салдаты, названа ў гонар ст. сяржанта Д.Т. Іванова. На доме, пры будаўніцтве якога былі знойдзены астанкі салдат, прымацавана памятная шыльдачка.

**К: 55°02'14.9"N 30°17'50.2"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 179.*

**Памятны знак у гонар салдат 251-й сд.** Каля дарогі Віцебск – Орша. На гранітнай стэле высечаны словы: "Вечно живым солдатам Витебской краснознаменной, ордена Суворова 251 стрелковой дивизии которые своим геройством и мужеством победили смерть. От благодарных потомков". Каля абеліска знаходзяцца каскі, гільзы, якія засталіся з вайны. Да абеліска вядуць прыступкі.

**К: 55°01'12.5"N 30°18'02.2"E.**





## в. ЛОСВІДА, Мазалаўскі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 4430).** За 400 м на поўнач ад будынка былой канторы саўгаса “Лосвіда”. На 1985 г. лічылася, што тут пахаваны каля 800 савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г. у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Па дадзеных СУВВЗ, у магіле пахаваны 352 савецкія салдаты. У 1964 г. на могілках пастаўлены абеліск і ўстаноўлена 15 надмагільных пліт. Па сведчаннях мясцовых жыхароў, у магілу перапахаваны і мірныя жыхары, забітыя фашыстамі і пахаваныя ў асобных магілах.

**К.: 55°21’17.6”N 30°07’55.0”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 191; пашпарт ВП № 4430.*



## в. ЛУЖАСНА, Мазалаўскі сельсавет

**Месца бою 1942 г.** У час так званага “рэйда на Віцебск” воіны 249-й сд 4-й Ударнай арміі і партызаны атрада М.Ф. Біруліна 01.02.1942 г. разграмілі ў вёсцы буйны нямецка-фашысцкі гарнізон. У 1972 г. у гонар гэтай падзеі на будынку Лужаснянскага сельскагаспадарчага тэхнікума імя Ф.А. Сурганава ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Магіла з загінуўшымі пры вызваленні чырвонаармейцамі не захавалася. Мясцовыя жыхары кажуць, што яна была знівілявана пры будаўніцтве чыгункі. Аднак некаторыя прозвішчы ваеннаслужачых, якія пахаваны ў брацкай магіле ў Ціраспалі (раён г. Віцебска), указаны як перапахаваныя з Лужасна.

**К.: 55°15’14.2”N 30°08’25.3”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 191; успаміны мясцовых жыхароў.; Газин Д.Р. Пылал Придвинский край.*




**Месца загубы савецкіх грамадзян.** На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. Тут у 1941–1943 гг. нямецкія фашысты загубілі сотні савецкіх ваеннапалонных, партызан і мірных жыхароў. Напрыклад, расстралялі больш за 80 жыхароў з вёсак Вярхоўе, Шалыгі, Трыгубцы, Каралева, Цяцёркі, Койтава і іншых, якіх схапілі ў час карнай экспедыцыі 15–17 чэрвеня 1942 г.

У 1972 г. каля шашы, што вядзе ад ст. Лужасна на Рубу, быў устаноўлены памятны знак: бетонная арка на вялікім п’едэстале з шыльдай. Месца пахавання знаходзіцца ў некалькіх сотнях метраў на паўночны ўсход ад помніка, каля берага Лужаснянкі. Месца не вызначана, штогод заворваецца трактарамі. Па іншых звестках, астанкі перапахавалі на ўзгорку каля помніка.

**К.: 55°15’30.0”N 30°08’11.1”E (месца памятнага знака); 55°15’31.9”N 30°08’14.3”E (верагоднае месца загубы і пахаванняў).**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 191; Кніга “Памяць”. – С. 233.*



**Месца нямецкага канцлагера.** У 1941 г. у п. Лужасна знаходзіўся нямецкі лагер для савецкіх ваеннапалонных. Іх утрымлівалі ў недабудаванай тэхнікумаўскай сталоўцы і прылягаючай да яе тэрыторыі, на таку і каля яго. Цяпер гэта тэрыторыя сучаснага гаспадарчага двара. Вакол лагера быў нацягнуты калючы дрот, пастаўлена кулямётная вышка. Ваеннапалонныя, як і мясцовыя жыхары прымушаліся працаваць на вырубцы Цёплага лесу, на разборцы будынкаў ваенных лагераў, дастаўцы матэрыялаў у Віцебск, рамонце чыгуначнага маста праз Крывы ручай, які быў узарваны адыходзячымі войскамі Чырвонай Арміі. Некаторых ваеннапалонных аддавалі на сельскагаспадарчыя работы ў маёнтак памешчыка ў Падбярэззе.

Па ўспамінах Т.Ф. Лукіной, у лагеры не было ніводнай травінкі, бо ўсё было з'едзена ваеннапалоннымі. Голад, нішчымныя ўмовы жыцця, адсутнасць медыцынскай дапамогі і знясільная праца прывялі да таго, што да восені 1941 г. значная колькасць ваеннапалонных памерла. Самі палонныя штодзень вазілі на пахаванне на двуколцы, накрытай дзяругай, памёрлых і тых, хто ўжо не мог рухацца. Хавалі іх у выкапаных палоннымі ямах непадалёк ад Лужаснянкі.

З 1942 г. у лагер прывозілі людзей, якіх фашысты забіралі ў партызанскай зоне у час правядзення карных экспедыцый. Частку расстрэльвалі, частку адпраўлялі ў "Пяты полк". З сакавіка 1943 па чэрвень 1944 г. у Лужасна быў арганізаваны нямецкі лагер каля пярэдняга края нямецкай абароны.

Дакладна вядома, што летам 1942 г. фашысты расстралялі мірных жыхароў, якіх прыгналі з Вярхоўя і іншых населеных пунктаў партызанскай зоны.

8.02. 2019 г. на будынку, дзе ў вайну размяшчаўся канцлагер, усталявана мемарыяльна-інфармацыйная шыльда. Побач метка з QR-кодам, якая адсылае да артыкула, размешчанага ў Інтэрнэце на старонцы Віцебскага кадэцкага вучылішча.

**К.: 55°15'22.7"N 30°08'22.9"E.**

*Літ. і К.: Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на оккупированной территории Беларуси 1941–1944 / Авт.-сост. В.И. Адамушко и др. – Мн.: НАРБ, 2001. – 158 с. – С. 23; ЗПГіКБ. Вв. – С. 191; ДАВВ. – Ф. 330. Воп. 1. Спр. 67. Успаміны і апытальныя лісты былых вязняў канцлагера "Лужасна", сабраныя Дз.Р. Газіным; успаміны мясцовых жыхароў; Інфармацыя пра лужаснянскі канцлагер // http://vku.by/index.php/nauchno-obrazovatelnaya-deyatelnost/infarmatsyya-pra-luzhasnyanski-kantslager.*




## в. ЛУЖАСНА, чыгуначная станцыя, Мазалаўскі сельсавет

**Помнік Сільніцкаму Міхаілу Фёдаравічу.** Каля шашы Віцебск – Ленінград, каля паварота на в. Лужасна. На ўшанаванне памяці Героя Савецкага Саюза М.Ф. Сільніцкага ў 1964 г. пастаўлена стэла, у цэнтры яе – барэльефная выява партызана, які страляе з кулямёта, ніжэй – надпіс-інфармацыя: "У вёсцы Плоты ў баі з фашыстамі 28 сакавіка 1942 года загінуў Міхаіл Сільніцкі. Яму першаму з камсамольцаў Беларусі прысвоена званне Героя Савецкага Саюза" (гл. арт. "Магіла Сільніцкага Міхаіла Фёдаравіча". – С. 54).

**К.: 55°15'12.9"N 30°06'51.1"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 191.*



## в. ЛУЖКІ (да 1964 г. в. Кабыляк), Мазалаўскі сельсавет

**Брацкая магіла партызан (№ 4432).** У цэнтры вёскі. Пахаваны 20 партызан 1-й Віцебскай брыгады, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных – сакратар Віцебскага падпольнага райкама КП(б)Б В.І. Когаль, начальнік штаба брыгады І.А. Крыцкі, камандзір атрада № 4 А.І. Собалеў. У 1964 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура партызана. У 1967 г. на ўшанаванне памяці В.І. Когаля каля помніка ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Адпаведна СУВВЗ, імёны не выяўлены. Аднак на шыльдзе на помніку ўказаны імёны пахаваных партызан.



У пастанове Віцебскага райкама КПБ ад 1966 г. планавалася перапахаванне партызан з розных магіл у адну ў Лужкі.

**К: 55°21′17.8″N 30°18′24.2″E.**

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 571. Воп. 4. Спр. 185. Арк. 5. Постановление Віцебскага райкама “О предложенниях районной комиссии по увековечению подвигов советских людей на территории района в годы Великой Отечественной войны от 15 июня 1966 г.; пашпарт ВП № 4432.*



*Мемарыяльная дошка у гонар І.В. Когаля і памятная дошка з імёнамі перапахаваных у магілу партызан*

**Месца базіравання Віцебскіх падпольных райкамаў КП(б)Б і ЛКСМБ, штаба 1-й Віцебскай партызанскай брыгады.** У вёсцы Кабыляк з красавіка 1942 г. размяшчаўся штаб партызанскага атрада М.Ф. Біруліна (арганізаваны ў лютым 1942 г.), на базе якога ў лютым 1943 г. была створана 1-я Віцебская партызанская брыгада. Камандзір брыгады – М.Ф. Бірулін, камісары – У.А. Хабараў (люты – чэрвень 1943 г.), В.Р. Кудзінаў (чэрвень – кастрычнік 1943 г.), Г.Т. Савельеў (кастрычнік 1943 г.). Партызаны праводзілі дыверсіі на шашэйных дарогах, на чыгуначных участках Віцебск – Гарадок, Віцебск – Сіроціна, грамілі варожыя гарнізоны. У лютым – сакавіку і ў чэрвені 1943 г. вялі абарончыя баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якія праводзілі карныя аперацыі “Шаравая маланка”, “Майская навальніца”, “Дождж на Сёмуху”. 28.10.1943 г. брыгада (2 атрады, 247 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

З 31.05.1942 г. пры партызанскім атрадзе М.Ф. Біруліна дзейнічаў Віцебскі падпольны райкам КП(б)Б. Сакратар – В.І. Когаль (31.05.1942 г. – 03.05.1943 г.). Друкаваны орган райкама – газета “За Родину”. У 1-й Віцебскай партызанскай брыгадзе знаходзілася асноўная база Віцебскага падпольнага райкама камсамола, які быў створаны Віцебскім падпольным абкамам ЛКСМБ і пачаў работу 10.05.1942 г.

У 1964 г. на адным з будынкаў у вёсцы ўстаноўлена мемарыяльная дошка. У сувязі з тым, што ён прыйшоў у аварыйны стан, дошка знята і знаходзіцца на захаванні ў музеі Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова.

**К: 55°21′17.8″N 30°18′24.2″.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 192; Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1944). – Мн., 1975.*



## в. ЛУЖЫНА, Акцябрскі сельсавет

**Магіла невядомага савецкага салдата.** На грамадзянскіх могілках былой в. Лапулі, якія знаходзяцца за 3 км ад в. Лужына, за 500 м ад фермерскай гаспадаркі Багачова пахаваны невядомы савецкі салдат, што загінуў у 1943 г. Магіла знаходзіцца каля сямейнага пахавання Цітовых Івана Іванавіча і Ефрасінні Кузьмінішны (два помнікі з мармуровай крошкі ў агароджы), у нагах пахавання Цітовых. Магіла азначана металічным крыжам, агароджы не мае. Раней была шыльдачка з інфармацыяй, цяпер страчана.

**К.: 55°07’04.8”N 30°22’15.5”E.**

*Літ. і К.: Распавяла Салаўёва Таццяна Леанідаўна, інфармант – Салаўёў Леанід Сяргеевіч.*

## в. ЛУКІ, Лятчанскі сельсавет

**Магіла партызан.** У лесе, за некалькі сотняў метраў на паўночны ўсход ад ускраіны вёскі. У гады вайны каля Лукаў паліцай Касцяш высачыў і расстраляў двух партызан. Мясцовыя жыхары перанеслі целы і пахавалі іх у лесе. Пасля вайны работнікі санаторыя ўзвялі на магіле помнік. У кастрычніку 2009 г. пры правядзенні раскопак салдатамі 52-га ОСПБ астанкаў у магіле выяўлена не было. Верагодна, яны былі перапахаваны ў гады вайны патаемна. Цяпер помнік мае характар кенатафа.

**К: 55.174456, 29.901499.**

*Літ. і К.: Юшкевич, М.Д. Симфония вечности. – Витебск: б.м., 2017. – С. 54; Храналогія пошукавай дзейнасці на тэрыторыі Віцебскага раёна // Бягучы архіў аўтара.*

## в. ЛУЧЫНАЎКА, Воронаўскі сельсавет

**Магіла невядомага савецкага салдата (№ 4392).** Каля д. 5 па вул. Цэнтральнай, каля шашы Віцебск–Лёзна. Бетонны абеліск з металічнай зоркай. На надмагілле пакладзена пліта з чорнага граніту з надпісам: “Неизвестный солдат”. Пахаваны невядомы савецкі салдат, які загінуў пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Маецца невысокая фігурная металічная агароджа.

**К: 55°06’59.6”N 30°30’51.4”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4392.*

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4393).** Каля д. 13 па вул. Цэнтральнай, каля шашы Віцебск – Лёзна. На ўсходняй ускраіне вёскі, каля шашы Віцебск – Смаленск. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Па ўдакладненых дадзеных, у магіле пахаваны 62 савецкія салдаты (СУВВЗ). У 1952 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з металічнай зоркай. На надмагілле пакладзена пліта з чорнага граніту з імёнамі пахаваных. Маецца невысокая фігурная металічная агароджа.

**К: 55°06’59.6”N 30°30’51.4”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4393.*





**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 5441).** Каля д. 6 В па вул. Цэнтральнай, каля шашы Віцебск – Лёзна. Пахаваны 118 воінаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, імя аднаго невядома. У 1952 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск. У 2000-я гг. узведзены новы помнік з чорнага граніту і выявай ордэна Айчыннай вайны. Па баках ляжаць 4 пліты з імёнамі пахаваных. Па цэнтры квадратная пліта з чорнага граніту.

**К: 55°06’59.6”N 30°30’51.4”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 5441.*



**Магіла Драздова Андрэя Фёдаравіча (№ 5713).** Каля д. 6 Б па вул. Цэнтральнай, каля шашы Віцебск–Лёзна. Чырвонаармеец 707-га сп А.Ф. Драздоў (1911–1944) памёр ад ран 19.05. 1944 г. У 1952 г. на магіле пастаўлены бетонны помнік з металічнай зоркай і шыльдай: “Дроздов Андрей Фёдорович 20.05.1911 – 19.05.1944”. Маецца металічная агароджа.

**К: 55°06’59.6”N 30°30’51.4”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 193; Могила солдата Советской Армии Дроздова А.Ф., погибшего при освобождении Витебщины. 1952 г. в д. Лучиновка, Вороновский сельсовет; Дроздов А.Ф. // ОБД “Мемориал” ЭР.РК. https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=1913193280; Пашпарт ВП № 5713.*




## в. ЛЫЧНЁВА (не існуе), Запольскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Лычнёва знаходзілася за 3 км на захад ад в. Тарасенкі, каля дарогі Н230. Перад вайной у ёй жылі 185 чалавек. У ліпені 1942 г. нямецка-фашысцкія карнікі знішчылі 144 жыхароў в. Лычнёва, вёску (40 двароў) спалілі. Пасля вайны не адрадзілася. У 1988 г. узведзены помнік. На сімвалічным куту сялянскай хаты ўсталявана стойка са звонам, які сімвалізуе памяць аб загінуўшых. На шыльдзе словы: “Товарищ, остановись! На этом месте находилась дер. Лычнево, сожженная фашистами в июле 1942 г. вместе с 144-мя жителями”. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”. У 1990 г. месту нададзены статус помніка ГКК. Зараз статусу не мае.

**К: 55°26’09.2”N 30°39’47.3”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 193; Бывшая д. Лычнево // Решение исполнительного комитета Витебского областного Совета народных депутатов от 27 декабря 1990 г. № 348 // О дополнении государственных списков недвижимых памятников истории и культуры местного значения; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 227.*



M



## в. МАЗАЛАВА, цэнтр сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 7844).** Знаходзіцца на месцы былой в. Лапіцкія, на беразе р. Лужаснянка. Месца ўяўляе сабой помнік, зроблены з цэменту, агароджаны плотам, вырабленым з цэменту і драўлянага штакетніку. На помніку, які мае форму абеліска, надпіс: “Память павшим в боях за Родину. От Гришановой”.

Па ўспамінах Марчанка Марыі Фёдараўны, 1929 г.н. “каля вёски ляжала бальшая груда бацинак, груда шынэляў і пасы. Рядам свежая магіла. Гришанова Анна, што жила на горе, каля кладбища (Плетнище?) на месте могилы памятник сама поставила”.

Па звестках іншага чалавека (не назваў сябе), у магіле пахаваны 7 савецкіх разведчыкаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. прыблізна ў час наступлення. Галоўным быў старшы сяржант. Імёны не вядомы, немцы ўсе дакументы забралі. Пахавалі жанчыны, Капітаніха (Капітанова Мальвіна). Іншыя сцвярджаюць, што тут пахаваны салдаты, якія загінулі ў 1941 г.

У 1974 г. на магіле быў пастаўлены абеліск. 20.12. 1990 г. рашэннем Віцебскага аблвыканкама магіла была абвешчана помнікам гісторыі і культуры. У 2019 г. пахаванне ўключана ў СУВВЗЗЖВ.

**К.: 55°16’26.6”N 30°08’39.8”E.**

*Літ. і К.: Братская могила неизвестных красноармейцев, погибших в 1941 г. // Решение исполнительного комитета Витебского областного Совета народных депутатов от 20 декабря 1990 г. № 348 // О дополнении государственных списков недвижимых памятников истории и культуры местного значения; успаміны мясцовых жыхароў.*



*Абеліск у Мазалава. 1998*



**Помнік землякам.** У вясковым скверы, каля былой канторы калгаса “Прызыў”, цяпер праўленне “МазалаваГаз”. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. на вялікай бетоннай аснове пастаўлена стэла. У верхнім левым вуглу наўскось выразана Георгіеўская стужка. Да стэлы прымацавана шыльда з абрысамі пылаючай паходні і словы: “В память жителям колхоза, погибшим за Родину в 1941–1945. Никто не забыт ничто не забыто. От колхозников колхоза «Призыв» в год 50-летия Октября”. У 2020 г. шыльда знята, словы-прысвячэнні нанесены на стэлу, яна пафарбавана ў чорны колер.

**К.: 55°17’22.9”N 30°08’18.7”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 193.*



**Пахаванне ахвяр вайны (ахвяр сталінскіх рэпрэсій).** За 2 км ад в. Мазалава, на могілках былой в. Хмары, 27.08.2018 г. перапахаваны астанкі 302 асоб з ляснога масіву каля в. Хайсы. Раскопкі праводзіліся ў маі – чэрвені 2017 г. ваеннаслужачымі 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна сумесна з супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**К.: 55°18’16.8”N 30°09’31.1”E.**

*Літ. і К.: Останки 302 мирных жителей торжественно перезахоронены в аг. Мазолово Витебского района // ЖП. – 2018. – 28 жн. – С. 2; успаміны мясцовых жыхароў.*




## в. МАКАРАВА, Акцябрскі сельсавет

**Месца прарыву Чырвонай Арміяй варожай абароны ў чэрвені 1944 г.** За 3 км ад вёскі, на аўтамабільнай дарозе Віцебск – Орша, каля скрыжавання дарог Копці – Макарава.

23.06.1944 г. войскі 3-га Беларускага фронту пачалі Віцебска-Аршанскую аперацыю. 39-я армія ў складзе 7-мі стралковых дывізій, 28-й гвардзейскай танкавай брыгады і 957-га самаходнага артылерыйскага палка моцным ударам прарвала абарону праціўніка ў раёне вёсак Макарава, Карпавічы, Падніўе. З ходу фарсіраваўшы р. Лучоса, савецкія часці перарэзалі чыгунку Віцебск–Орша каля станцыі Замасточча і разграмілі 197-ю пяхотную дывізію ворага. За першы дзень наступлення 39-я армія левым флангам прасунулася на 15 км і адрэзала з поўдня і паўночнага захаду шляхі адыходу ворага ад Віцебска.



У 1969 г. у гонар часцей, якія ўдзельнічалі ў прарыве варожай абароны, пастаўлена стэла, выкладзеная з буйных камянёў з металічнай шыльдай. На ёй надпіс: “Подвигу вечная слава! Здесь 23 июня 1944 г. 5 гв. ск (17, 19, 91 гв. с.д. и 28 табр) поддержанный 3 ПАД прорвал фронт в Витебской операции 39 А. Первым ворвался в оборону врага батальон Федорова (61 гв. сп. 19 гв. сд.). Успех дивизии обеспечил начало окружения и уничтожения врага. Июль 1969”.

**К: 55°02’48.7”N 30°17’45.9”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 193.*

## в. МАКЛАКІ, Акцябрскі сельсавет

**Магіла невядомага савецкага салдата.** На грамадзянскіх могілках, за 300 м на захад ад вёскі. На самай ускраіне могілак, каля дарогі пахаваны невядомы савецкі салдат. На магіле ўсталявана металічная піраміда. Зорка страчана, агароджы няма.

**К.: 55°02’29.2”N 30°21’24.0”E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы палявога выхаду ВКВ 03. 2020 г.*



## в. МАЛЫЖЫНА, Вымнянскі сельсавет

**Магіла ахвяр фашызму.** На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі, на ўездзе з боку в. Войтава. Пахаваны 84 мірныя жыхары вёскі (жанчыны, дзеці, старыя), якіх 04.02.1942 г. расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі.

У 1977 г. на магіле насыпаны Курган, на яго вяршыні абеліск і дошка з імёнамі загінуўшых. У 2017 г. абеліск заменены гранітнай плітой.

**К: 55°12’20.5”N 30°33’25.7”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 193; Малыжынская трагедыя // Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 235; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/sozh-derevny.html.*



**Магіла ахвяр фашызму.** На грамадзянскіх могілках ва ўр. Ярмолкава. Пахаваны 14 членаў сям’і Салаўёвых, забітых фашыстамі ў 1943 г. Бетонны помнік з шыльдай: “Память Соловьевым. Отец Маисей, сестра Анна, Погибшие в 1943 г. Мать Марина, Федор, Евдокия, Екатерина, Надежда, Петр, жена Федора, Мария, Валя, Федя, Толя, Паша, Ваня. Память отцу, матери, братьям, сестрам и племянникам от дочери Нины и ее семьи”.

*Літ. і К.: Звесткі прадстаўлены В.М. Марозавым.*



## в. МАНУЛКІ, Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 2296).** У цэнтры вёскі, на вул. Фермерскай. Пахаваны 280 воінаў, якія загінулі на тэрыторыі сельсавета ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На магіле ў 1956 г. пастаўлены абеліск. У 2018 г. праведзена рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу. На манументе з чорнага граніту з металічнай зоркай наверсе нанесены імёны пахаваных салдат. Увосень 2017 г. усталявана мемарыяльная пліта народнаму татарскаму паэту Мансуру Гаязаву.



**К: 55°11’13.3”N 30°32’41.4”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 193; СУВВЗ; пашпарт ВП № 2296; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-2296.html.*

## в. МАШКІНА, Заронаўскі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 4411).** У цэнтры вёскі, каля дома 3. па вул. Майская. Невысокая бетонная стэла, да якой прымацаваны барэльефная выява салдата з аўтаматам у руках. На падмурку знаходзіцца шыльда са словамі: “Героям, павшим в боях за Родину”. Побач надмагільныя помнікі. У якасці агароджы выкарыстаны металічныя ланцугі. Помнік устаноўлены ў 1978 г.

Пахаваны 12 савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вядома прозвішча толькі чырвонаармейца 243 АІБ Навасельцава Івана Спірыдонавіча (1903–11.02. 1944). У баях пад в. Машкіна прапалі без звестак 3–6.02.1944 г. 25 салдат 83-й гв. сд.

**К: 55°19’10.6”N 29°56’12.5”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4411; Новосельцев И.С. // https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=404915899.*



## в. МІХАЙЛАВА, Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 4455).** За 200 м на захад ад вёскі, за д. 21 па вул. Лапашнёўскай. На 1985 г. лічылася, што тут пахаваны 245 воінаў, якія загінулі ў 1943–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па ўдакладненых звестках, у магіле пахаваны 526 савецкіх воінаў (СУВВЗ). У 1956 г. на могілках пастаўлены абеліск. У 2014 г. па ініцыятыве сваякоў загінуўшых воінаў была праведзена рэканструкцыя пахавання. Асобныя абеліскі, якія прыйшлі ў непрыгодны стан, былі заменены. Акрамя цэнтральнага помніка, абкладзенага чорным гранітам, стаяць 9 абеліскаў-пірамідак і 2 асобныя пліты: М.У. Сталыпіну і Я.А. Сямёнаву.

**К: 55°15’17.1”N 30°33’13.7”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194; пашпарт ВП № 4455; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4455.html.*



## в. МІКАЛАЁВА, Мазалаўскі сельсавет

**Магіла ахвяр фашызму.** На грамадзянскіх могілках. Масіўны бетонны надмагільны помнік з двума металічнымі крыжамі наверсе. На помніку тэкст: "Маляров Илья Малахович, Малярова Катерина Карповна, Маляров Коля 4 года. Трагически погибли, расстреляны. 1941–1943".

**К: 55°20'38.6"N 30°15'51.1"E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы палявога выхаду ВКВ у в. Чырвоны Двор 04.2019 г.*




## в. МІШУТКІ, Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 4453).** На ўскраіне грамадзянскіх могілак, непадалёк ад д. 1 па вул. Мірная. На 1985 г. лічылася, што тут у 11 магілах пахаваны 328 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (ЗПГіКБ). Па ўдакладненых звестках, у магілах пахаваны 580 савецкіх салдат (СУВВЗ). У 1956 г. на могілках пастаўлены абеліск. У 2015 г. праведзена рэканструкцыя цэнтральнага абеліска. Ён быў абкладзены чорным гранітам, а на масіўны надмагільным помніку нанесены абноўлены спіс пахаваных воінаў. Побач бетонныя абеліскі з металічнымі зоркамі на магілах савецкіх салдат. У 2016–2018 гг. на могілках усталяваны 3 персанальныя пліты: М. Абекаву, М.А. Басаву і А.І. Іванову.

**К: 55°18'32.6"N 30°34'36.8"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194; пашпарт ВП № 4453; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4453.html.*



**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4454).** У цэнтры вёскі, за д. 13 па вул. Бярозавай. Пахаваны 6 невядомых савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск. Па ўспамінах мясцовых жыхароў, сярод пахаваных – капітан П.А. Бібонаў, чыё фота змешчана на абеліску (лічыцца пахаваным у № 4453). У 1966 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск са словамі: "Памяти павшим будьте достойны".

**К: 55°18'38.7"N 30°34'44.4"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194; пашпарт ВП № 4454.*



## в. МЯКЛАВА, Шапечынскі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 4465).** У вёсцы, каля д. 17 на вул. Кастрычніцкай, каля дарогі. Металічны помнік з зоркай. Побач гранітная пліта з тэкстам: «Братское захоронение Воинов Красной Армии, погибших в боях за д. Мяклово. 33-я Армия Западного фронта (42 с.д.; 144 с.д.; 274 с.д.; 371 с.д.; 36 о.с.Б.р.) Январь – март 1944 г. 39-я армия 3-го Белорусского фронта. Апрель – июнь – 1944 г. Имена Ваши неизвестны, подвиг – бессмертен. От благодарных потомков”. У якасці абгароджы вакарыстаны металічныя ланцугі. У магіле пахаваны радавы 274-га сп Баброў Сяргей Аляксандравіч (1897–5.02. 1944), радавы Мамаеў Магамедгад (1915–?).

**К.: 55°03’26.7”N 30°16’09.8”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4465.*

**Брацкая магіла (№ 4466).** За 50 м ад паўночна-заходняй ускраіны вёскі. У магіле пахаваны радавы 1 ШІСБ Марозаў Мікалай Сцяпанавіч (1925–05.01.1944), радавы 274-га сп Урусаў Яўгеній Дзмітрыевіч (1907–05.03. 1944), радавы 274-га сп Паўлаў Іван Міхайлавіч (1923–1944), якія загінулі ў студзені – сакавіку 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

На бетонным абеліску фотаздымкі і шыльды з імёнамі пахаваных, у тым ліку і тых, што ў пахаванні згодна СУВВЗ не пазначаны: “Огрызков Егор Васильевич 1911–5.II. 1944”, “Жуков … …”. Побач на гранітнай дошцы тэкст: “Братское захоронение воинов Красной Армии, погибших в боях за д. Мякло-во. 33-я Армия западного фронта (42 с.д.; 144 с.д.; 274 с.д.; 371 с.д.; 36 о.с.Б.р.) Январь – март 1944 г. 39-я армия 3-го Белорусского фронта. Апрель – июнь – 1944 г. Имена Ваши неизвестны, подвиг – бессмертен. От благодарных потомков”.

**К.: 55°03’33.7”N 30°15’44.9”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4466.*








## в. НАВАСЁЛКІ, Запольскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4394).** Насупраць школы, каля могілак. У 1968 г. на пахаванні ўсталяваны абеліск. У 1992 г. пастаўлена мемарыяльная кампазіцыя: бетонная стэла з фігурнай зоркай і сімвалічнымі промнямі, якія разыходзяцца ад яе. Унізе на пастаменце надпіс: “Слава павшим героям”. У 2015 г. абноўлены бетонныя пліты з імёнамі пахаваных салдат. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 408 воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні тэрыторыі сельсавета ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У СУВВЗ лічыцца 332 пахаваных. Сюды перанесены астанкі салдат 334-й сд і кавалерыстаў 18-га кп 24-й кд з брацкай магілы ў в. Шыцікі (не існуе). Помнік і пахаванне маюць статус ГКК.

**К: 55°33’18.0”N 30°50’16.1”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194; пашпарт ВП № 4393.*

**Мемарыяльная дошка ў гонар аднаўлення савецкай ўлады.** Устаноўлена ў 1976 г. у гонар аднаўлення ў красавіку – верасні 1942 г. савецкай улады, дзейнасці Пудацкага сельскага савета (старшыня Р.М. Ласман) і калгасаў.

**К: 55°33’18.0”N 30°50’16.1”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194.*



*Абеліск у Навасёлках. 1953*







## в. НАВІКІ, Шапечынскі сельсавет

**Памятны знак у гонар савецкіх салдат 735-га самаходна-артылерыйскага палка.** У 2017 г. за сродкі М.Ф. Фраловай, пляменніцы камандзіра самаходкі мл. л-та М.І. Лашкова, усталяваны валун з мемарыяльнай дошкай з надпісам: “Здесь у деревни Новики в феврале – марте 1944 г. штурмовали плацдарм воины-самоходчики 735 САП, танкисты 26 и 43 ГвТБ, пехотинцы 215, 173, 371 сд. Друзья-командиры самоходок выпускники 2-го Ростовского артиллерийского училища и их экипажи остались здесь навсегда. Погибли в бою, были смертельно ранены, пропали без вести”. Побач, на двух гранітных плітах інфармацыя пра 49 загінуўшых у баях салдат, якія лічацца як “згарэўшыя ў самаходках”. Таксама змешчаны назвы воінскіх злучэнняў, якія змагаліся на гэтым участку фронту: 144-я, 173-я, 215-я, 274-я сд; 26-я і 43-я гв. танкавыя брыгады, 735-ы самаходна-артылерыйскі полк, 1-я штурмавая інжынерна-сапёрная брыгада РГК і інш.

**К: 55°04’48.7”N 30°14’57.5”E.**

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 8013).** У жніўні 2020 г. салдатамі 52 АСПБ, членамі пошукавага клуба “Память і примирение” (Масква), “РВС” (Наваполацк) былі падняты рэшткі 42-х салдат РККА. 18.11.2020 г. яны былі перапахаваны на мемарыял “Плацдарм Навікі”. Імёны не ўстаноўлены.

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 8013; Сеньков В. Салют на берегу Лучесы // ВВ. – 2020. – 21 нояб. – С. 10.*



## в. НОЎКА, цэнтр сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, помнік землякам (№ 4433).** Каля дарогі з в. Ноўка на в. Сасноўка. У 1965 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна. Побач – мемарыяльная сцяна на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На сцяне імёны 137 землякоў, рэльефная выява ордэна Айчыннай вайны.

На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 402 воіны і партызаны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па дадзеных СУВВЗ, у магіле пахаваны 223 салдаты. Сярод пахаваных – Героі Савецкага Саюза Рыгор Дзмітрыевіч Ермалаеў і Уладзімір Сяргеевіч Смятанін.

Р. Дз. Ермалаеў нарадзіўся ў 1924 г. у в. Шылаўка Екацярынаўскага р-на Саратаўскай вобл. На фронце з 1943 г. Камандзір танка Т-34 28-й асобнай гв. танкавай брыгады гв. мл. л-т Р.Дз. Ермалаеў вызначыўся 25.06.1944 г., калі экіпаж танка пад яго камандаваннем адным з першых выйшаў да р. Лучоса, захапіў пераправу, што забяспечыла фарсіраванне ракі пяхотай; у складзе роты першым дасягнуў шашы Віцебск – Лепель, у раёне в. Якушы аваладаў пераправай цераз Заходнюю Дзвіну. На працягу трохгадзіннага бою адбіў 10 контратак ворага, знішчыў 3 самаходныя гарматы і 9 пушак, 120 гітлераўцаў. Загінуў у гэтым баі. 24.03.1945 г. Р. Дз. Ермалаеву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



У.С. Смятанін нарадзіўся 02.07.1917 г. у г. Паўлаград Днепрапятроўскай вобл. На фронце з 1941 г. Намеснік камандзіра 48-га гв. сп 17-й гв. сд гв. падпалкоўнік У.С. Смятанін вызначыўся ў баях па знішчэнню варожай групоўкі, якая прарывалася з Віцебскага “катла”. Полк пад яго камандаваннем адбіў 13 контратак ворага, знішчыў каля 800 гітлераўцаў. Цяжка паранены, не пакінуў поле бою. Быў схоплены ворагам і па-зверску закатаваны. 24.03.1945 г.







**К: 55°08’00.4”N 30°09’21.4”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194; пашпарт ВП № 4433.*

## в. НОЎКА, цэнтр сельсавета

**Мемарыяльная дошка Даўбешкіну Пятру Лукічу.** На будынку школы. Устаноўлена ў 1969 г. на ўшанаванне памяці былога вучня, Героя Савецкага Саюза гв. капітана П.Л. Даўбешкіна. На шыльдзе змешчаны тэкст: “Герой Советского Союза гв. капитан Долбешкин Петр Лукьянович учился в Новкинской школе в 1920–1924 гг. Героически погиб при форсировании Днепра в 1943 году”.

**К: 55°08’05.4”N 30°09’02.5”E.**



**Памятны знак у гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.** Каля Алеі землякоў Віцебскага раёна ўсталяваны валун, на якім прымацавана гранітная дошка з надпісам: “Памятный знак в честь 75-летия освобождения Республики Реларусь от немецко-фашистских захватчиков и 95-летия образования Витебского района. Установлен 2 июля 2019 года за счет средств Витебского отделения Белорусского фонда мира”.

**К.: 55°08’01.6”N 30°08’58.4”E.**




**Алея Славы на Алеі славутых землякоў.** У цэнтры вёскі, каля Дома культуры. Урачыста адкрыта ў 2014 г. Складаецца з алеі з сілумінавымі бюстамі землякоў і інфамацыйнымі шчытамі ў гонар 15-ці Герояў Савецкага Саюза і 6-ці Герояў Сацыялістычнай працы – ураджэнцаў Віцебскага раёна і асоб, якія праславілі край.

**К.: 55°08’01.6”N 30°08’58.4”E.**









## в. ПАБЯДЗІНШЧЫНА, Лятчанскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 5717).** Па звестках СУВВЗ, у магіле пахаваны 43 невядомыя савецкія салдаты, якія загінулі ў баях за вёску. Па звестках М.Д. Юшкевіч, у 2004 г. сюды былі перапахаваны астанкі 48 невядомых савецкіх салдат з-пад в. Гарбачы. У 2016 г. усталявана металічная пліта. На ёй тэкст: “Здесь, на высоте 152,4 10 февраля 1944 года во время ожесточенного боя погиб Герой Советского Союза командир танка старший лейтенант Краев Владимир Павлович и его боевые товарищи танкисты 143-й танковой бригады. Ст. л-т Краев, л-т Борейко, ст. л-т Черненко, л-т Кулаков, тех л-т Савченко, мл. л-т Борилко, л-т Мазурецст. серж. Дривалов, ст. серж. Воронин, ст. серж. Бошлич, серж. Никитин, Шилин. Вечная слава и память отважным воинам!”.



У 1983 г. саслужыўцамі ст. лейтэнанта, Героя Савецкага Саюза У.П. Краева ў 1983 г. тут быў усталяваны металічны крыж на месцы гібелі героя. У 2013 г. на камяні прымацавана гранітная пліта з тэкстам: “Герой Советского Союза Краев Владимир Павлович 15.07.1921–10.02.1944. Старший лейтенант, командир танка 143-й танковой бригады. Погиб в деревне Побединщина”.

Яшчэ адна памятная дошка ў гонар Дзмітрыя Міхайлавіча Пярова (1915–1986). Шафёр баявой машыны “БМ-13” (“Кацюша”) 394 гв. мінамётнага дывізіёна 99-га гв. мінамётнага палка 1-га Прыбалтыйскага фронту, гв. мл. сяржант Д.М. Пятроў вызначыўся 03.02.1944 г. у баі каля вёсак Ужляціна – Гарбачы. Снарад ворага трапіў у пакет напраўляючых баявой установкі і было пашкоджана 14 мін. У двух загарэлася ракетная частка і яны сталі рухацца ў бок запасных зарадаў. Д.М. Пятроў з рызыкай для жыцця наваліўся на снарад, затрымаўшы яго рух і выдвернуў узрывацелі і перадухіліў выбух. Выратаваў такім чынам 4 рэактыўныя ўстаноўкі і вялікі запас боепрыпасаў. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета ад 22.07.1944 г. за ўзорнае выкананне баявой задачы яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**К.: 55°14’52.8”N 29°55’09.1”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 5717; Герои Советского Союза: Краткий биографический словарь / Пред. ред. коллегии И.Н. Шкадов. – М.: Воениздат, 1988. – Т. 2.*

## в. ПАДДУБ'Е, Варонаўскі сельсавет

**Магіла Шульчэнкі Уладзіміра Дзям'янавіча (№ 7049).** На грамадзянскіх могілках. У магіле пахаваны партызан У.Д. Шульчэнка (30.06.1922–30.04.1943), які загінуў 30 красавіка 1943 г. На магіле пастаўлены абеліск з мармуровай крошкі роднымі загінуўшага. На ім выява партызана і інфармацыя пра яго.

**К: 55°11'39.1"N 30°27'01.8"E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 7049.*




## в. ПАПАРАТНА, Запольскі сельсавет

**Магіла Хрушчова Мікіты Рыгоравіча (№ 4463).** На грамадзянскіх могілках. Пахаваны радавы 21 УОС 4 увдс 1-га Прыбалтыйскага фронту М.Р. Хрушчоў (1905–19.06.1943), які загінуў пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены бетонны помнік з накладной зоркай у верхняй частцы помніка.

**К: 55°29'09.1"N 30°45'58.1"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194; пашпарт ВП № 4463.*




## в. ПАРАСЯТНІЦА / Новааляксееўка (не існуе), Запольскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Парасятніца знаходзілася за 3 км на ўсход ад в. Канькі. У сакавіку 1942 г. супраць партызан 1-й Беларускай брыгады гітлераўцы пачалі карную аперацыю. Яны ўварваліся ў вёску, расстралялі 60 яе жыхароў, а вёску (20 двароў) спалілі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны не адрадзілася. У 1965 г. на месцы расстрэлу мірных жыхароў пастаўлена стэла. На ёй тэкст: "Товарищ, остановись! Здесь была большая деревня Поросятница, стертая с лица земли фашистами в марте 1942 года".

**К: 55°28'47.6"N 30°53'06.5"E.**

**Да помніка няма дарогі.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194–195.*



## в. ПЕНКЛАВІЧЫ, Задуброўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4402).** На могілках пры ўездзе ў вёску. Пахаваны 60 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943–1944 гг. у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У СУВВЗ змешчаны толькі 55 прозвішчаў. У 1958 г. на магіле пастаўлена бетонная сцяна з металічнай зоркай наверсе. Па баках металічныя пліты з імёнамі пахаваных салдат. Унізе металічная шыльда са словамі: “Вечная слава павшим в боях за освобождение и независимость нашнй Родины 1941–1945”. Маецца яшчэ адна шыльда з тэкстам: “Здесь похоронены солдаты, сержанты и офицеры, погибшие в боях с немецко-фашистскими захватчиками в период Великой Отечественной войны 1941–1945”.

**К: 55°20’53.6”N 30°28’58.3”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195; пашпарт ВП № 4402.*

## в. ПЕРАВОЗ, Ноўкінскі сельсавет

**Магіла Рублеўскага Аляксея Іванавіча (№ 4437).** За 1 км на поўнач ад вёскі, непадалёк ад грамадзянскіх могілак. Бетонны абеліск з металічнай зоркай наверсе. Пахаванне мае металічную агароджу. Чырвонаармеец 492-га сп 199-й сд А.І. Рублеўскі загінуў у баі 10.02.1944 г. каля в. Жукі. У 1972 г. на магіле пастаўлены абеліск. Адпаведна дадзеных АБД “Мемарыял”, у магіле таксама пахаваны Мікалай Васільевіч Петухоў (1925–10.02.1944) і Мікалай Трафімавіч Вараб’ёў (1922–10.02.1944). Можна лічыць пахаванне брацкай магілай.

**К: 557°03’16.0”N 30°13’30.5”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195; пашпарт ВП № 4437; https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=54698509.*

## в. ПЕСТУНІЦА, цэнтр Заронаўскага сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4413).** У цэнтры вёскі, насупраць будынка сельсавета. У 1975 г. на магіле пастаўлены масіўны бетонны абеліск з металічнай зоркай. Да помніка прымацавана ахоўная шыльда. Маецца металічная агароджа зробленая з ланцугоў. Пахаваны 12 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вядомы імёны лейтэнанта М.З Іваненка (1919–07.02.1944) і чырвонаармейца М.П. Кірылава (1911–01.03.1944). Да абеліска прымацавана пластыкавая шыльда з імёнамі “Иваненко Н.З., Кириллов Н.П.”.

**К: 55°16’20.7”N 29°59’00.7”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195; пашпарт ВП № 4413.*







## в. ПІХЦЯІ, Вымнянскі сельсавет



**Брацкая магіла.** На бетонным помніку з металічным крыжыкам на версе змешчаны здымак і шыльдачка з тэкстам: “Партизан Пуков Петр Степанович рож-я 1895 погиб 26.11.1942 и один неизвестный”.

*Літ. і К.: Звесткі прадстаўлены В.М. Марозавым.*




**Магіла Куляша Юрыя Цімафеевіча.** На грамадзянскіх могілках пахаваны лётчык-знішчальнік Ю.Ц. Кулеш (1916–1942). Лейтэнант 133-га знішчальнага авіяпалка 266-й штурмавой авіядывізіі. Загінуў 30.10.1942 г. Помнік пастаўлены жонкай. На металічнай шыльдзе фотаздымак і надпіс: “Здесь похоронен КУЛЕШ Юрий Тимофеевич 1916. Погиб в 1942. Летчик-истребитель. Дорогому мужу от жены”.

*Літ. і К.: Звесткі прадстаўлены В.М. Марозавым; https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=153504484.*




## в. ПЛОТКІ (не існуе), Запольскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Знаходзілася за 4 км на поўнач ад в. Заполле, за 1,5 км на захад ад в. Марчанкі Запольскага сельсавета. Да вайны ў вёсцы пражывала 176 чалавек. У лютым 1943 г. пад час карнай аперацыі нямецкія фашысты забілі 25 жыхароў і спалілі вёску. Пасля вайны не адрадзілася.

На месцы былой вёскі пастаўлена стэла з надпісам: “Товарищ, остановись! На этом месте была деревня Плотки”.




Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”.

*Літ. і К.: Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 227.*



## в. ПРАНІКІ, Суражскі сельсавет

**Магіла Міхайлава Сяргея Іванавіча (№ 6675).** На грамадзянскіх могілках. У магіле пахаваны партызан С.І. Міхайлаў (1922–1943), які загінуў 23.05.1943 г. На магіле ўсталявана стэла з бетоннай крошкі. На гранітнай устаўцы тэкст: “Здесь похоронен партизан Михайлов Сергей Иванович 1922–23.05.1943 гг.”.

**К.: 55°20’38.3”N 30°47’18.2”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 6675.*



## в. ПУДАЦЬ, Запольскі сельсавет

**Месца стварэння партызанскага атрада М.П. Шмырова.** У цэнтры вёскі, побач з былым клубам, у памяць аб стварэнні партызанскага атрада ў 1964 г. пастаўлены абеліск: бетонная стэла на двух пастаментах, абкладзеныя мармурам. На шыльдзе тэкст: “Здесь, в поселке Пудоть в июле 1941 г. из рабочих фабрики был образован партизанский отряд под командованием М.П. Шмырёва” (з красавіка 1942 г. атрад імя Р.С. Курмялёва 1-й Беларускай партызанскай брыгады).

**К: 55°34’15.1”N 30°51’31.4”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195.*




## в. ПУШЧА, Тулаўскі сельсавет

**Помнік у памяць жыхароў в. Пушча.** Абеліск усталяваны на мясцовых могілках. На высокім абеліску выкананым з мармуровай крошкі з металічнай зоркай наверсе шыльда з надпісам: “Жителям д. Пуща, погибшим в 1941–1945 гг.”. Згодна кнізе “Памяць”, у в. Пушча ў гады вайны на франтах загінула 19 землякоў, 3 – у партызанах. Колькі сталі ахвярамі фашысцкага тэрору – невядома.

**К: 55°14’07.9”N 30°20’15.8”E.**

*Літ. і К.: Кніга “Памяць”. – С. 509, 584.*



## в. ПЫШНЯКІ, Бабініцкі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 2293).** На ўскраіне вёскі. На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 90 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Па ўдакладненых звестках, у магіле пахаваны 293 савецкіх салдат і партызан (СУВВЗ). У 1965 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з зоркай. На надгробку металічныя пліты з імёнамі пахаваных. Маецца металічная агароджа.

**К: 55°19’30.5”N 30°29’08.8”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195; пашпарт ВП № 2293.*



## в. ПОДЦЕВА (не існуе), Курынскі сельсавет (між вёскамі Курына і Кулакова)

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Подцава знаходзілася за 3 км на захад ад в. Курына. Перад вайной у ёй жыло 80 чалавек. 23.05.1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 29 жыхароў в. Подцава, спалілі 18 двароў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны вёска не адрадзілася.

У 1958 г. на месцы спаленай вёскі пастаўлены абеліск. На ім шыльда з надпісам: “Вечная память 260 советским гражданам, зверски сожженным фашистскими бандитами 23 мая 1943 г.”. Адпаведна справаздачы Суражскага райкама КП(б)Б ад верасня 1944 г., у вёсцы былі спалена запёртымі ў пабудовы 73 чалавекі.

Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”.

**К.: 55°24’13.7”N 30°26’05.2”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 227–228; ДАВВ. – Ф. 202. Воп. 3. Спр. 4. Арк. 197–198 (Справаздача аб рабоце Суражскага райкама КП(б)Б 3 лістапада 1943 г. па 24 верасня 1944 г.).*



*Абеліск на месцы в. Подцева*




*Абеліск у м/к “Хатынь”*

*Месцазнаходжанне ур. Подцева*



# Р



## в. РУДАКІ, Ноўкінскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4436).** У цэнтры вёскі. Пахаваны 243 воіны і партызаны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па ўдакладненых звестках, у магіле пахаваны 490 савецкіх салдат (СУВВЗ), з іх невядомы імёны



18 асоб. У 1958 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск у выглядзе мураванай калоны з металічнай зоркай. На тумбе надпіс: “Вечная слава и память погибшим сынам нашей Родины 1941–1944 гг.”.

**К: 55°08’03.1”N 30°02’43.1”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 196; пашпарт ВП № 4436.*

С



## в. САЗАНЫ (не існуе), Запольскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Сазаны знаходзілася за 3 км на паўночны ўсход ад в. Сапраны. Перад вайной у ёй жылі 220 чалавек. У снежні 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 21 жыхара, вёску (40 двароў) спалілі. Пасля вайны не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”. Помнік у вёсцы быў такі, як у былой в. Плоткі.

Дарогі ва ўр. Сазаны няма.

**К.: 55°30’09.3”N 30°42’50.3”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 196; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 228.*




## в. САКОЛЬНІКІ, Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 2301).** На заходняй ускраіне вёскі, за д. 27 па вул. Янавіцкай. На 1965 г. лічылася, што тут пахаваны 137 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Па ўдакладненых звестках, тут пахаваны 244 савецкія воіны. У 1956 г. на магіле пастаўлены высокі бетонны абеліск з металічнай зоркай і нішай, у якой змешчана шыльда з прысвячэннем: “Вечная слава героям”. На надмагільным помніку – металічныя шыльды з імёнамі пахаваных салдат. У 2019 г. побач з абеліскам усталяваны 2 дадатковыя мемарыяльныя пліты з чорнага граніту, на якія нанесены прозвішчы загінуўшых воінаў.

**К: 55°19’07.5”N 30°35’55.6”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 196; пашпарт ВП № 2301; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-2301.html.*



## в. САСНОЎКА, Ноўкінскі сельсавет

**Магіла Пашыка Барыса Антонавіча (№ 4435).** На тэрыторыі санаторыя "Сасноўка". Гвардыі ст. лейтэнант Чырвонай Арміі 742-га сп 164-й сд Б.А. Пашык загінуў 25.06. 1944 г. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск. У 1986 г. на магіле ўсталяваны бюст работы віцебскага скульптара А.М. Гвоздзікава.

**К: 55°05'21.4"N 30°10'22.5"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 196; пашпарт ВП № 4435; https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=4492057.*




## в. САЎЧОНКІ (чыгуначная станцыя Лосвіда), Мазалаўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4429).** Побач з вёскай, каля чыгункі, за 0,4 км ад чыгуначнай станцыі Лосвіда. У магіле пахаваны 236 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Па звестках мясцовых жыхароў, у магілу былі перапахаваны астанкі мірных грамадзян з магіл, якія знаходзіліся каля станцыі Ловіда. Ва ўшанаванне памяці мірных грамадзян на магіле ўсталявана памятная гранітная пліта. У 1950-я гг. сюды сімвалічна перапахавалі салдат, пахаваных ва ўр. Магучова і з грамадзянскіх могілак Герасімова.

У 2017 г. у магілу адбылося перапахаванне астанкаў 172 чалавек, знойдзеных у лясным масіве каля в. Хайсы. Найбольш верагодна, гэта ахвяры сталінскіх рэпрэсій.

**К.: 55°19'50.2"N 30°05'21.5"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 196; пашпарт ВП № 4429.*

**Жалезабетонны ДОТ.** Нямецкі ДОТ (Доўгачасовая агнявая кропка), які захаваўся да нашага часу непашкоджаным, знаходзіцца побач з будынкам чыгуначнай станцыі Лосвіда. Выкарыстоўваецца як гаспадарчая пабудова для захавання інвентару чыгуначнікаў.

**К.: 55°19'42.0"N 30°05'16.4"E.**





## в. СКРЫДЛЕВА, Шапечынскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4398).** На могілках, завулак Шашэйны. Пахаваны 14 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні раёна. На магіле ўсталяваны абеліск. Сярод пахаваных – Герой Савецкага Саюза Павел Ананьевіч Крыванос. У 1959 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск: прамавугольная стэла з барэльефам галавы воіна ў касцы ў верхняй частцы. На мармуровай шыльдзе тэкст: "Слава героям, павшим в боях за свободу и независимость нашей Родины 1941–1945 гг.". У 1965 г. у гонар П.А. Крываноса каля абеліска ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Помнік і пахаванне маюць статус ГКК.

П.А. Крыванос нарадзіўся ў 1920 г. у в. Альхоўка Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл. Вызначыўся пры ліквідацыі варожай групоўкі каля Віцебска. 27.06. 1944 г. камандзір танкавага ўзвода мл. л-т П.А. Крыванос уступіў у адзінаборства з самаходнай гарматай "фердынанд" і засланіў бранёй свайго танка танк камандзіра палка. Цяжка паранены, ён не пакінуў поля бою і працягваў камандаваць узводам. Памёр ад ран 27.06. 1944 г. 24.03.1945 г. П.А. Крываносу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**К: 55°01'43.4"N 30°03'31.1"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 196; пашпарт ВП № 4398.*



## в. СТАРОЕ СЯЛО, Лятчанскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4421).** У цэнтры вёскі. Пахаваны 3577 воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных – Героі Савецкага Саюза Фёдар Пятровіч Ерзікаў і Уладзімір Паўлавіч Краеў. Могілкі ўтвораны ў 1954 г., калі ад в. Пабядзіншчына сюды быў перапахаваны У.П. Краеў. У 1959 тут была ўсталявана мемарыяльная пліта ў яго гонар. У 1970 г. яна заменена. Яе тэкст: "В 1944 г. в боях под д. Казаки погиб отважный танкист ст. лейтенант В.П. Краев. Вечно будет жить боевой подвиг русского богатыря. Слава павшим героям. Июль 1970 г.".





У 1970 г. у памяць аб Ф.П. Ерзікаву была ўсталявана пліта з тэкстам: "Здесь, в районе Старое Село 27 июня 1944 г. подразделение под командованием Героя Советского Союза гв. капитана Ерзикова Ф.П. совершило бессмертный подвиг. Вечная слава героям. Май 1970 г.".

Праводзіліся 4 перапахаванні: у 1968 г. 10 савецкіх салдат з в. Волкава; у 1991 г. 41 баец 204-й сд з в. Лебяды, якія загінулі 24.06.1944 г.; у 1995 г. 10 партызан з в. Ноўка. 4 разы рабілася рэстаўрацыя і добраўпарадкаванне могілак. Апошні раз у 2011 г. Абноўлены пліты з імёнамі загінуўшых, узведзены новы помнік.

**К: 55°13'36.3"N 29°53'00.0"E.**

■ ■ ■

**Магіла Героя Савецкага Саюза Краева Уладзіміра Паўлавіча (№ 4422)** (гл. арт. "Помнік Герою Савецкага Саюза В.П. Краеву". – С. 83).






**Помнік землякам, загінуўшым у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.** Каля чыгуначнаяй станцыі. Усталяваны ў 1974 г. На бетоннай стэле мармуровая шыльда з тэкстам: "Слава героям, павшим в боях за свободу и независимость нашей Великой Советской Родины. Светлая память о них будет вечно жить в сердцах благодарных потомков". Побач на бетоннай тумбе размешчаны 7 металічных шыльд з імёнами 188 загінуўшых землякоў і шыльда з тэкстам: "Воинам и землякам совхоза им. В.П. Краева, погибшим в войне за свободу и независимость нашей Родины!". Статус помніка гісторыі і культуры нададзены ў 1990 г. Цяпер статусу не мае.

**К: 55°13'38.6"N 29°53'05.9"E.**

*Літ. і К.: Памятник землякам, погибшим в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны // Решение исполнительного комитета Витебского областного Совета народных депутатов от 20 декабря 1990 г. № 348 // О дополнении государственных списков недвижимых памятников истории и культуры местного значения.*



**Памятны знак настаўнікам і вучням Старасельскай СШ, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.** Помнік ўзведзены ў 1986 г. Да гранітнай глыбы прымацавана зорка з нержавеючай сталі і шыльда з прысвячэннем: "Навсегда сохраним в наших сердцах светлую память об учителях и учениках старосельской школы, погибших в боях с немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны. Благодарные потомки". У 1990 г. нададзены статус помніка гісторыі і культуры.

**К: 55°13'32.4"N 29°52'39.3"E.**

*Літ. і К.: Памятный знак учителям и учащимся Старосельской СШ, погибшим в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны // Решение исполнительного комитета Витебского областного Совета народных депутатов от 20 декабря 1990 г. № 348 // О дополнении государственных списков недвижимых памятников истории и культуры местного значения.*



**Памятны знак Аляксандру Пятровічу Калініну.** Лётчык-знішчальнік, камандзір звяна 2 ГКИ АП 322-й знішчальнай авіядывізіі гв. лейтэнант А.П. Калінін 08.01.1944 г. быў збіты ў паветраным баі каля в. Старое Сяло, выкінуўся з парашутам і загінуў пры прызямленні. Быў пахаваны на месцы гібелі, каля в. Запруддзе. Пазней быў перапахаваны на вайсковых могілках (№ 4421). На месцы падзення самалёта роднымі забітага была ўсталявана металічная тумба з зоркай і фота лётчыка і шыльда з тэкстам: "Летчик, лейтенант Калинин А.П. 22.05. 1922 г.р. Место гибели 08.01. 1944 г.". 20.08.1988 г. са згоды сваякоў помнік быў перанесены да Старасельскай СШ.

**К: 55°13'32.4"N 29°52'39.3"E.**

*Літ. і К.: Юшкевич М.Д. Через годы и столетия. Летопись Старосельского края. – Витебск: б.м., 2012. – С. 54; https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=55778033.*



**Помнік Герою Савецкага Саюза Фёдару Пятровічу Ерзікаву.** Каля былой канторы калгаса. Усталяваны ў 1984 г.

Ф.П. Ерзікаў нарадзіўся 30.05.1918 г. у с. Архангельскае Міласлаўскага р-на Разанскай вобл. у сялянскай сям'і. У Чырвонай Арміі з 1938 г. Вызначыўся 25–27.06.1944 г. Артбатарэя пад камандаваннем гв. ст. лейтэнанта Ф.П. Ерзікава знішчыла каля 200 фашыстаў, 10 аўтамашын, 12 павозак з грузам. Сам Ф.П. Ерзікаў знішчыў каля 40 гітлераўцаў. Загінуў у баі 27.06.1944 г. 24.03.1945 г. Ф.П. Ерзікаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**К: 55°13'32.4"N 29°52'39.3"E.**

*Літ. і К.: Памятник Герою Советского Союза Ф.П. Ерзикову, погибшему при освобождении Витебщины. 1990 г. в д. Старое Село, Летчанский сельсовет // Решение исполнительного комитета Витебского областного Совета народных депутатов от 27 сентября 1991 г. № 247 // О дополнении государственных списков недвижимых памятников истории и культуры местного значения // http://bii.by/tx.dll?d=49521.*




**Помнік Герою Савецкага Саюза В.П. Краеву.** У.П. Краеў нарадзіўся 05.07.1921 г. у с. Лекма Слабадскога р-на Кіраўскай вобл. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1943 г., лейтэнант, камандзір танка 259-га танкавага батальёна 143-й танкавай брыгады. У час прарыву варожай абароны 06.10.1943 г. у раёне вёсак Рассядзенне і Вялікая Будніца Мехаўскага раёна танк У.П. Краева знішчыў супрацьтанкавую гармату і 3 агнявыя кропкі. Пры разведцы каля в. Востраў захапіў батарэю палявых гармат і склад боепрыпасаў. Рухаючыся па прасёлках, адрэзаў адыход калоны ворага. Каля в. Марчанкі на працягу двухгадзіннага бою знішчыў 2 гарматы і 5 кулямётаў, 3 аўтамашыны з грузам, да 20 гітлераўцаў, а каля в. Жукава – 3 кулямёты і 2 аўтамашыны. 09.10.1943 г. У.П. Краеў быў цяжка паранены, але не пакінуў поля бою. Загінуў у баі 10.02.1944 г. 04.06. 1944 г. У.П. Краеву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**К: 55°13'25.6"N 29°52'51.1"E.**

*Літ. і К.: Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984; Мезенцев В.И., Батарея сражалась геройски // ЖП. – 2003. – № 47. – С. 2; Памятник Герою Советского Союза Краеву В.П, погибшему при освобождении Витебщины. 1990 г. в д. Старое Село, Летчанский сельсовет // Решение исполкома Витебского областного Совета народных депутатов от 27 сентября 1991 г. № 247.*



**Памятны знак на месцы подзвігу М.А. Ніканава.** У 2011 г. на беразе р. Язвенка ўсталяваны валун з гранітнай шыльдай, на якой нанесены тэкст: "Ніканаў Мікалай Андрэевіч (1924–1954) здзейсніў подзвіг 25.06.1944 г. на беразе р. Язвенка".

24–27.06.1944 г. ст. с-т М.А. Ніканаў камандаваў аддзяленнем 732-га сп 235-й сд 43-й арміі. Вызначыўся ў баях па вызваленні Віцебска. У баі за в. Жаробычы асабіста забіў 13 варожых салдат, а 7 узяў у палон. 27.06.1944 г. у раёне в. Язвіна разам са сваім аддзяленнем узяў у палон 28 варожых салдат і афіцэраў. У ходзе далейшага наступлення ў баі за в. Старое Сяло быў паранены, але застаўся ў страі. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22.07.1944 г. быў удастоены звання Герой Савецкага Саюза.

**К: 55°12'43.8"N 29°52'27.9"E.**

*Літ. і К.: Юшкевич, М.Д. Симфония вечности. – Витебск: б.м., 2017. – С. 44.*



## в. СТАСЕНКІ, Суражскі сельсавет

**Магіла Мiначкiна Iвана Мiкiтавiча (№ 5712).** На ўскраіне вёскі, каля шашы Сураж – Веліж. Санінструктар 42-га гв. сп 16-й гв. сд І.М. Міначкін загінуў у баі 04.02.1942 г. каля в. Савары. У 1965 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з зоркай. На помніку шыльдачака з тэкстам: “Рядовой Миночкин И.Н. 1941”. У СУВВЗ лічыцца, што салдат невядомы. У Спісе помнікаў гісторыі і культуры Віцебскага аблвыканкама значыцца брацкім пахаваннем.

**К: 55°27’29.5”N 30°54’32.5”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 5712; https://obd-memorial.ru/html/info.htm?id=50458715&p=3.*



## в. СУБАЧЫ (Субачава), Заронаўскі сельсавет

**Магіла Кучына Аляксандра Арцёмавіча (№ 4414).** Знаходзіцца на грамадзянскіх могілках в. Субачы, за 200 м на поўнач ад вёскі. Камандзір узвода палкавой разведкі лейтэнант А.А. Кучын загінуў 08.03.1944 г. пад час баявога задання, прыкрываючы адыход сваіх таварышаў. Быў забіты нямецкім снайперам. Бетонны абеліск з металічнай зоркай установлены ў 1975 г., да яго прымацавана металічная шыльда з тэкстам: “Лейтенант Кучин Александр Артемович. Командир взвода полковой разведки 706-го сп 204-й Витебской сд 1919 г.р. Погиб при выполнении боевого задания 8 марта 1944 года. Уроженец Пензенской области село Павловское”.

**К: 55°17’04.6”N 29°56’45.5”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4414; успаміны мясцовых жыхароў; матэрыялы Л.К. Нікіцінай.*



## в. СУЙКАВА, Заронаўскі сельсавет

**Брацкая магіла партызанак (№ 4408).** На заходняй ускраіне вёскі, каля дарогі Віцебск – Полацк. Бетонны абеліск з металічнай зоркай наверсе ўсталяваны на магіле ў 1960 г. На шыльдачцы надпіс: “Барченко Надежда Ермолаевна”. У якасці агароджы выкарыстаны металічныя ланцугі.

Пахаваны дзве партызанскія разведчыцы, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941–1944 гг. Вядома прозвішча Надзеі Ермалаеўны Барчанка. Па сведчаннях мясцовых жыхароў, якія ўскосна пацвярджаюцца архіўнымі дадзенымі, дзяўчат, якія ішлі ў Гарадоцкі раён, выдаў здраднік у в. Пестуніца. Іх арыштавалі і трымалі ў в. Суйкава, дзе пасля катаванняў расстралялі. Былі пахаваны мясцовымі жыхарамі.

**К: 55°14’08.0”N 30°05’11.5”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4408; сведчанні М.Д. Юшкевіч.*



## г.п. СУРАЖ, цэнтр сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4439).** Знаходзіцца ў цэнтры пасёлка. Пахаваны 370 салдат і 3 партызаны, якія загінулі пры вызваленні раёна. Галоўным чынам, сюды былі перанесены астанкі салдат, якія былі пахаваны ў брацкіх магілах на правым беразе р. Дзвіна. На магіле ўсталявана скульптура салдата з аўтаматам. Пазней скульптуру, якая прыйшла ў нягоднасць, замянілі на каменны пілон з выявай ордэна Айчыннай вайны і лічбамі 1941–1945. Па баках аб'ёмныя пілоны кубічнай і прамавугольнай фомы з барэльефамі салдата і партызана. Шыльды з імёнамі пахаваных прымацаваны да пілонаў. Побач, у скверы расце партызанскі дуб, пасаджаны ў 1972 г.

**К: 55°24'30.8"N 30°43'31.6"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 196; пашпарт ВП № 4439.*

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4467).** Знаходзіцца на вул. Чырвонаармейскай. Згодна пашпарту пахавання, тут пахаваны 3 савецкія воіны, якія загінулі пры вызваленні раёна. Вядома імя радавога 4 особ 101 осбр Шчаблыкіна Антона Ерамеевіча (1911–09.10.1943). У 1964 г. на магіле ўсталяваны абеліск. У 2018 г. быў заменены на гранітны. На ім надпіс: "Здесь захоронены верные сыны Отечества, погибшие за освобождение Суражской земли от немецких оккупантов в 1943–1944 гг. Помним и скорбим". Плошча пахавання вельмі вялікая для магілы на 3-х чалавек, гэта дае падставу лічыць, што ў магіле пахавана значна больш салдат. Да таго ж, у "Зборы помнікаў" згадваецца, што ў магіле на вул. Чырвонаармейскай былі пахаваны 106 воінаў, якія загінулі ў 1943–1944 гг.

**К.: 55°24'26.2"N 30°43'51.8"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 196; пашпарт ВП № 4467.*

**Магіла сапёраў.** На грамадзянскіх (Спасаўскіх) могілках, непадалёк ад дарогі. Савецкія сапёры загінулі ўвесну 1944 г. пры размініраванні вызваленай ад гітлераўцаў тэрыторыі. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск. У артыкуле В.Ф. Кухаравай згадваецца, што тут знаходзіцца пахаванне мінёраў: "У дороги – скромный памятник минёрам, погибшим при разминировании поселка весной 1944 года".

**К.: 55°23'59.9"N 30°43'17.5"E.**

*Літ. і К.: Рашэнне Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта № 215, 1973; ЗПГіКБ. Вв. – С. 198; Кухарава В.Ф. А на кладбище неспокойненько [могілкі Суража] // ЖП. – 2001. – № 94. – С. 3.*







**Месца загубы грамадзянскага насельніцтва і партызан.** За былымі яўрэйскімі могілкамі, між Суражам і в. Будзянка фашысты на працягу акупацыі праводзілі расстрэлы мірных грамадзян, западозраных у сувязях з партызанамі, савецкіх і партыйных работнікаў. Па звестках краязнаўцы Н. Кухаравай, тут расстраляна каля 100 чалавек. Помніка ці памятнага знака няма. Ёсць некалькі асобных пахаванняў, помнікі на якіх былі ўстаноўлены сваякамі загінуўшых (партызану П.А. Міхайлаву, сям'і Селязнёвых, партызанскім разведчыцам).

**К.: 55°24'09.5"N 30°44'20.1"E.**

*Літ. і К.: Інфармацыя З.Н. Касянок; матэрыялы палявых даследаванняў 02.2020 г.*

**Магіла дзвюх партызанскіх разведчыц.** На былых яўрэйскіх магілках Суража. На магіле ўсталяваны металічны крыж і бетонны надмагільны помнік. Вакол добрая драўляная агароджа. На крыжы металічная шыльда з тэкстам, частка якога страчана: "Убиты немецко-фашистскими захватчиками...

Убита 5 августа ... Кирев... Нина Тимофеевна. Рожд. 1923 г. д. Пу...

Убита 8 августа ... нова ... мофеевна. Рожд. 1925 г.

Найбольш верагодна, адна з забітых – Іванова Еўдакія Цімафееўна, 1925 г.н., ураджэнка в. Рабава, падпольшчыца, расстраляна ў г.п. Сураж.

*Літ. і К.: Памяць. – С. 582.*

**К.: 55°24'09.5"N 30°44'20.1"E.**

**Магіла партызана П.А. Міхайлава.** На былых яўрэйскіх могілках. Надмагільны помнік зроблены з мармуровай крошкі. На помніку надпіс: "Партизан Михайлов Петр Архипович (1904–1943). Помним, скорбим. От детей. Расстрелян фашистами". Жыхар в. Сібякі Суражскага раёна, былы старшыня сібякоўскага калгаса, партызан П.А. Міхайлаў трапіў у палон, прыведзены ў Сураж. Потым расстраляны на яўрэйскіх могілках разам з яшчэ адным невядомым партызанам з в. Сібякі.

**К.: 55°24'09.5"N 30°44'20.1"E.**

*Літ. і К.: Кухарава, В.Ф. За Суражем виднеется курган – казнили там фашисты партизан // ЖП. – 2005. – № 7. – С. 2.*










**Магіла Селязнёвых.** На былых яўрэйскіх могілках. Магільны помнік зроблены з бетону. На помніку маюцца выява зоркі і тэкст: “Селезнёвы: Семен Александрович 27 лет, Лидия Кириловна 16 лет, Анна Карповна 25 лет. Расстреляны немецкими фашистами 22.9.1942 г.”.

**К.: 55°24’09.5”N 30°44’20.1”E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы палявых даследаванняў 02.2020 г.*

**Месца гібелі яўрэяў Суража каля в. Вялікая Любшчына.** Большасць яўрэяў Суража жылі за Дзвіной. 2 жніўня 1941 г. у Сураж прыбыў атрад айнзацкаманды-9 пад кіраўніцтвам афіцэра Шнайдэра (у некаторых крыніцах сустракаецца дата 12.08.1941 г.). У Задзвінні салдаты групамі па 2–3 чалавекі абыходзілі дамы і выганялі ўсіх яўрэяў. Уброд перагналі праз Дзвіну (лета было вельмі спякотным, таму раку можна было перайсці). Сабралі на плошчы, каля былой друкарні “Ударнік”. Абвесцілі, што іх адправяць на працу ў Гарадок. Мужчын аддзялілі, прымусілі пакласціся на зямлю галавой уніз на адным баку плошчы, жанчын і дзяцей – на другім. Пры спробе павярнуць галаву білі ботамі, прыкладамі ці палкамі. Каля 30 мужчын пагрузілі на машыны і павезлі капаць магілы.

Каля 17 гадзін сабраных, прыблізна 400 чалавек, пастроілі па 4 чалавекі ў калону і пад аховай аўтаматчыкаў пагналі ў бок в. Любшчына. За 3 км ад Суража, каля глыбокага прыроднага рва прыпыніліся. Там ужо былі падрыхаваныя 3 ямы. Дарослых выстраівалі групамі па 20–25 чалавек. Спачатку немцы, аддзяліўшы ад асноўнай групы каля 50 дзяцей, кінулі іх у яму і, накрыўшы брэзентам падпалілі. Бацькі кінуліся да іх, але былі расстраляны. Астатніх расстралялі і пахавалі ў некалькіх ямах. Целы не змяшчаліся, таму іх “утрамбоўвалі”, кідаючы туды гранаты. Акцыя знішчэння скончылася каля 23 гадзін.

Найбольш верагодна, у акце аб злачынствах 1944 г. гэта месца згадваецца як роў ручая Гарадзішча.

На судзе ў 1962 г. у Берліне за кіраўніцтва знішчэння савецкіх грамадзян Шнайдэр атрымаў 10 гадоў зняволення.

*Месца расстрэлу каля в. Вял. Любшчына. Сучасны выгляд*



У 1996 г. на месцы гібелі быі праведзены раскопкі. У трох ямах эксгуміравана астанкі 372 чалавек, затым перанесены на былыя яўрэйскія могілкі (каля Шапурова).

Месца ведаў народны артыст СССР Ф.І. Шмакаў. Ён прывозіў у Любшчыну сям’ю з Ізраіля. Яны паставілі там помнік і прыязджалі штогод.

*Літ. і К.: ГАРФ. – Ф. 7021. Оп. 84. Д. 13. Лл. 1–8; копии находятся в Архиве Яд Вашем, М-33/448.*



**Магіла савецкіх партызанак-сувязных.** На левым беразе р. Каспля, за 6 км уверх па цячэнні ад Суража. Каля былой в. Церахова, насупраць в. Каспляны (з правага боку ракі). Усталяваны металічны крыж.

**К.: 55°22’23.4”N 30°45’08.6”E**

*Літ. і К.: Сведчанні З.Н. Касянок; матэрыялы палявых даследаванняў 10.04.2021 г.*

**Магіла ахвяр гета г.п. Суража. На былых яўрэйскіх могілках, каля в. Шапурова. Пахаванне ахвяр вайны (№ 7986).** Пахаваны астанкі ахвяр-яўрэяў, закатаваных фашыстамі 2 жніўня 1941 г. на беразе р. Дзвіна каля в. Вялікая Любшчына.

Астанкі былі выяўлены ў 1996 г. Ваеннаслужачымі спецыялізаванай пошукавай роты МА РБ былі праведзены даследаванне і эксгумацыя. У трох ямах выяўлены астанкі 372 чалавек. Было знойдзена шмат гузікаў, пласмасавых зубных пратэзаў, жаночых грабеньчыкаў, спражак, сцізорыкаў, мундштукоў, небяспечных брытваў.

10.07.1996 г. эксгуміраваныя астанкі былі перапахаваны на былых яўрэйскіх могілках каля в. Шапурова. На месцы перапахавання ўсталяваны бетонны помнік з шасціканечнай зоркай (магендавідам) і шыльдай з надпісам: “Вечная память жертвам фашистского геноцида, 620 евреям Суража, расстреляным 12 августа 1941 г.”.



У надпісе маюцца 2 памылкі: трагедыя адбылася 2 жніўня, перапахаваны астанкі 372 чалавек.

Адначым блытаніну ў лічбах. Вядома, што перад вайной у Суражы пражывала больш за 450 яўрэяў. У шэрагу крыніц згадваецца аб тым, што ў Суражы фашыстамі было знішчана 969 яўрэяў. Можна дапусціць, што акрамя мясцовых яўрэяў, тут былі расстраляны і яўрэі-бежанцы, якія ішлі з мястэчак Заходняй Беларусі на ўсход.

**К.: 55°24’09.9”N 30°44’19.9”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ПАВ 7986; Памяць. – С. 234; Шульман А.А. Место его уже не узнает. – Мн.: Медисонт, 2007. – С. 163, 169; Ботвинник М.Б. Памятники геноцида евреев Беларуси. – Мн., 2000. – С. 167; Кухарава В.Ф. На святога Іллю [загуба яўрэяў Суража ў жніўні 1941 г. у Любшчыне] // ЖП. – 1994. – № 69. – С. 163, 169.*

**Помнік сям’і Кац.** На яўрэйскіх могілках, непадалёк ад помніка на месцы перапахавання яўрэяў Суража, забітых у в. Вялікая Любшчына. Масіўны бетонны абеліск з тэкстам: “Дорогим родителям КАЦ Менделю Боруховичу и Любове (?) Абрамовне, братьям Залману и ?амфелю сестре и ее мужу Розе и Якову Иоффе, племянникам Абраше и Лева Иоффе, Меллочке Кац и Гиленьке (?) Шур. Расстрелянным немецкими фашистами 2.VIII.1941 г. От детей и родных”. Помнік з’яўляецца кенатафам і ўсталяваны на пачатку 1970-х гг. сваякамі загінуўшых.



**К.: 55°24’11.2”N 30°44’15.1”E.**

*Літ. і К.: Інфармацыя З.Н. Касянок; матэрыялы палявых даследаванняў 02.2020 г.*

**Месца гібелі яўрэяў Суража на беразе р. Неварожка.** На паўднёвай ускраіне Суража, на левым беразе р. Неварожка. Адразу пасля акупацыі, летам 1941 г. тут расстрэльвалі савецкіх і партыйных актывістаў. Вядома, што тут былі расстраляны Н.П. Захаранка, Я.Н. Марока, Е.С. Асташанка, якія былі схоплены па даносу паліцая. Тое ж самае – міліцыянер Вараб’ёў, ветурач Іваноў. Вядома, што тут была расстраляна сям’я дзеда Прохара за тое, што у іх акне калыхалася занавеска, калі гналі ваеннапалонных. Паліцэйскія папярэджвалі, каб ніхто не выглядваў у вокны, каб нават занавеска не варухнулася.



Пасля таго, як фашысты знішчылі яўрэяў, што жылі ў Задзвінскай частцы Суража, у Вялікай Любшчыне, яны прыняліся і за астатніх. Іх расстрэльвалі на беразе Неварожкі. Летам 1941 г. тут жа забівалі і знямоглых і знясіленых ваеннапалонных і мірных грамадзян, якіх фашысты гналі па вул. Кузнечнай у Віцебск, у канцлагер “Пяты полк”. Іх расстрэльвалі і закопвалі ў ямах і варонках на беразе ручая.

Месца адзначана помнікам, які выраблены з мармуровай крошкі. Абеліск абнесены металічнай агароджай памерамі 3 на 4 м. На помніку фарбай напісаны тэкст: “Здесь захоронены мирные жители г.п. Сураж, расстрелянные немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг.”. Колькасць пахаваных невядома. Помнік пастаўлены прыватнай асобай. Раней ён стаяў бліжэй да вады, але з прычыны пастаянных разліваў вады, перанесены вышэй.

**К.: 55°23’53.7”N 30°42’53.4”E.**

*Літ. і К.: Кухарава В.Ф. У першыя дні вайны // ЛПр. – 1987. – № 23. – С. 3; інфармацыя З.Н. Касянок; матэрыялы палявых даследаванняў 02.2020 г.*

**Помнік дзецям Шмырова Міная Піліпавіча.** М.П. Шмыроў (партызанскі псеўданім Бацька Мінай) з’яўляўся камандзірам партызанскага атрада (з красавіка 1942 г. 1-й Беларускай партызанскай брыгады). Акупанты неаднаразова спрабавалі ліквідаваць яе, абяцалі за галаву партызанскага камандзіра вялікую ўзнагароду. Страціўшы надзею знішчыць партызана, гітлераўцы ўзялі 19.10.1941 г. заложнікамі чацвярых дзяцей М.П. Шмырова: Лізу (14 гадоў), Сяргея (10 гадоў), Зіну (7 гадоў) і Мішу (3 гады). Фашысты паабяцалі пакінуць дзяцей жывымі, калі Бацька Мінай добраахвотна здасца ў палон. Прыйсці да ворага са схіленай галавой М.П. Шмырову не дазволілі абавязак камандзіра, сумленне камуніста і самі дзеці. 14.02.1942 г. гітлераўцы расстралялі дзяцей, а таксама сястру М.П. Шмырова і маці яго жонкі.




У 1984 г. на ўшанаванне памяці дзяцей Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова пастаўлены помнік (скульптар А. Гвоздзікаў, архітэктар В. Ягадніцкі, бронза, бетон) – кампазіцыя са стылізаваных пілонаў з скульптурнымі вывамі твараў загубленых дзяцей.

**К: 55°24’24.1”N 30°43’48.1”E.**

*Літ. і К.: Бялевіч А. Мінай Шмыроў. – Мн., 1970; ЗПГіКБ. Вв. – С. 198–199.*

**Памятны дуб.** У скверы па вул. Савецкай, каля брацкай магілы № 4439. Пасаджаны былымі партызанамі ў 1972 г. з нагоды 30-годдзя заснавання 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Да дуба ланцугом прымацавана шыльда з надпісам: “Настоящий дуб посажен бывшими партизанами в честь 30-летия 1-й Белорусской пратизанской бригады. Апрель 1972 г. Сураж”.

**К.: 55°24’31.1”N 30°43’32.1”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 198.*



*Пасадка партызанскага дуба*





**Месца разгрому варожага гарнізона.** У Суражы 10.09.1941 г. партызаны атрада М.П. Шмырова разграмілі нямецка-фашысцкі гарнізон. У 1961 г. у памяць аб гэтым на будынку выканкама пасялковага Савета была ўстаноўлена мемарыяльная дошка з тэкстам: “10-го сентября 1941 года партизанами под командованием Шмырева Миная Филипповича был разгромлен в гор. Сураже гарнизон немецко-фашистских оккупантов”.

**К: 55°24’28.0”N 30°43’25.4”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 198.*




**Сад Перамогі.** Закладзены ў 2013 г. на тэрыторыі Суражскай дзіцячага сада-сярэдняй школы. У 2019 г. высаджаны яблыні. У памяць аб падзеі да валуна прымацавана гранітная шыльда з тэкстам: “Сад Победы. Заложен руководителями учреждений образования Витебского района в канун 70-летия Победы в Великой Отечественной войне”.

**К.: 55°24’22.9”N 30°43’51.3”E.**




**Алея Памяці.** Высаджана ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На тэрыторыі Суражскай дзіцячага сада-сярэдняй школы у 2019 г. высаджаны яблыні. У памяць аб падзеі ўсталявана стойка з пластыкавай шыльдай, на якой размешчаны тэкст: “Аллея Памяти. Высажена в ознаменование 75-летия освобождения г.п. Сураж от немецко-фашистских захватчиков. 26 октября 2018 г.”.

**К.: 55°24’22.9”N 30°43’51.3”E.**



**Мемарыяльная шыльда ў гонар надання Суражскай школе імя М.П. Шмырова.** На будынку Суражскай школы. Гранітная пліта з надпісам: “В 2015 г. школе присвоено имя Героя Советского Союза командира 1-й Белорусской партизанской бригады Шмырева Миная Филипповича 23.12.1891 г. – 03.09.1964 г.”.

**К.: 55°24’23.2”N 30°43’48.1”E.**




## в. СЦЯПАНКОВА (Степанково), Заронаўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4410).** На ўсходняй ускраіне вёскі, каля дома 1 на вул. Палявая, каля дарогі з Сцепанкова на Варашылы. Бетонны абеліск з металічнай зоркай наверсе пастаўлены ў 1974 г. Інфармацыйнай шыльды няма. Маецца металічная агароджа.

На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 82 воіны і партызаны, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Па звестках СУВВЗ, у магіле пахаваны 266 савецкіх салдат. На 2020 г. улічана 285 воінаў.

**К: 55°14’42.1”N 29°57’26.9”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 199; пашпарт ВП № 4410; Легоньков Б.Я. Обелиск в Степанкове [Заронаўскі с/с] // ЖП. – 1997. – № 33. – С. 2; звесткі Л.К. Нікіцінай.*



**Магіла танкістаў.** На грамадзянскіх могілках (ур. Малыя Рубіны). Магіла абкладзена бетоннымі плітамі, мае абеліск, на якім прымацавана шыльда з бляхі з надпісам: “Танкистам 1-го танк. корпуса 11-й гв. армии, героически погибшим в феврале 44 г. Вечная память героям”.

**К: 55°15’21.5”N 29°57’56.8”E.**

*Літ. і К.: Звесткі Л.К. Нікіцінай.*





## в. СУШЧОВА, Мазалаўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4426).** За 0,4 км на поўдзень ад вёскі. Пахаваны 956 воінаў і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941–1944 гг. (1985). Па звестках СУВВЗ, у магіле пахаваны 920 савецкіх салдат. Тут праводзілася перапахаванне з магіл навакольных вёсак. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск. Пазней заменены на манумент, які ўяўляе сабой два высокія пілоны (6 і 7 м), што шчыльна стаяць побач. Уверсе прымацавана зорка. Да манумента вядуць прыступкі. Па баках на вялікіх кубах лічбы 1941–1945. На надмагільных помніках па баках на металічных плітах імёны пахаваных воінаў.

**К.: 55°20'46.9"N 30°14'00.3"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 199; пашпарт ВП № 4426.*




*Выгляд абеліска. 1968 г*




**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 5739).** За 3 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Смалякі. Знаходзіцца некалькі магіл з металічнымі крыжамі. Маюцца металічныя агароджы. На адной магіле акрамя крыжа змешчана металічная пліта на стойках і мармуровая пліта з фотаздымкам капітана Курапава Герасіма Іванавіча. Згодна дадзеных АБД "Мемарыял", камандзір 417 ОПАБ (асобнага кулямётна-артылерыйскага батальёна) 155 УР (Умацаванага раёна) капітан Г.І. Курапаў загінуў 20.05.1944 г., пахаваны на могілках у в. Смалякі Віцебскага раёна. Разам з ім у магіле пахаваны яшчэ 3 салдаты, імёны якіх невядомы. У 1945 г. была ўсталявана мармуровая пліта з фотаздымкам Курапава. У 1960-я гг. афіцыйна адбылося перапахаванне ў брацкую магілу ў в. Сушчова, але, насамрэч гэтага здзейснена не было.

Побач знаходзіцца яшчэ адно воінскае пахаванне з металічным крыжом з таблічкай "Веселов Владимир Александрович". Чырвонаармеец, тэлефаніст 417 ОПАБ 155 УР, 1902 г.н., ураджэнец г. Кастрама, быў забіты 03.06.1944 г.

У адпаведнасці з дакументамі АБД "Памяць народа", на могілках у Смаляках былі пахаваны і іншыя афіцэры Савецкай Арміі: лейтэнант, камандзір 4-й роты Пётр Іванавіч Мерынаў, 1902 г.н., які загінуў 20.05.1944 г.; лейтэнант 4-й роты Якаў Васільевіч Арсенцьеў, 1916 г.н. загінуў 23.05. 1944 г.; лейтэнант, камандзір узвода Каменьшыкаў Аляксандр Іванавіч, 1918 г.н., які гераічна загінуў 10.06.1944 г.; малодшы лейтэнант Аляксееў Захар Уласовіч, 1908 г.н., загінуў 10.04.1944 г.

Можна меркаваць, што пералічаныя асобы былі пахаваны ў гэтай брацкай магіле.

**К.: 55°21'08.6"N 30°12'09.0"E.**

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 45 п. Воп. 2. Спр. 8. Арк. 23; Сводка потерь // Память народа [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pamyat-naroda.ru/*



*В.А. Весялоў*



*Г.І. Курапаў*



# T



## в. ТАДУЛІНА, Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла (№ 4459).** У цэнтры вёскі, на вул. Прыазёрнай. У 5 магілах пахаваны савецкія салдаты, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На 1985 г. лічылася, што пахаваны 115 воінаў. Па дадзеных СУВВЗ, тут ляжаць 73 савецкія салдаты. У 1956 г. на цэнтральнай магіле пастаўлены бетонны абеліск. У 2015 г. абеліск рэканструяваны, абкладзены чорным гранітам, нанесены прозвішчы загінуўшых. На магілах стаяць 4 асобныя помнікі: ст. лейтэнанту П.С. Палёнаму, лейтэнанту В.М. Карабейнікаву, маёру Я.П. Жупікаву, ст. лейтэнанту М.І. Міхайлаву. Пахаванне мае агароджу ў выглядзе металічных ланцугоў.

**К.: 55°14'42.3"N 30°37'44.0"E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4459; ЗПГіКБ. Вв. – С. 199; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4459.html.*



## в. ТРУШЧЫ, Задуброўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4404).** На могілках. Пахаваны 76 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па дадзеных СУВВЗ, у магіле пахаваны 69 савецкіх воінаў і партызан. У 1956 г. на магіле пастаўлены бетонны абеліск з металічнай зоркай наверсе на масіўным падмурку. У 2014 г. заменены на стэлу з чорнага граніту з вывай ордэна Айчыннай вайны і надпісам: "Вечная слава павшим в боях за освобождение и независимость нашей Родины. 1941–1945". Па баках металічныя пліты з імёнамі пахаваных. Па цэнтры металічная шыльда са словамі, што паўтарае тэкст на стэле.

**К: 55°22'46.2"N 30°33'09.6"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 199; пашпарт ВП № 4404.*



## в. ТРЫГУБЦЫ, Мазалаўскі сельсавет

**Магіла ахвяр вайны.** Знаходзіцца ў полі, за 250 м на захад ад вёскі. Магіла абкладзена невялікімі камянямі, усталяваны металічны крыж, маецца металічная агароджа. Да яе прымацавана шыльда з тэкстам: “Здесь покоятся мирные жители деревень Поповичи и Тригубцы, расстрелянные фашистскими оккупантами 13 июня 1942 года, более 10 человек: Пискунова Наталья Тимофеевна 1905 г.р., Пискунов Григорий Семенович, семья Москалевых” (2020).

Адпаведна звестак мясцовых жыхароў, нямецкія карнікі сагналі ўсю вёску. Сталі шукаць, хто з іх дапамагае партызанам. Аднаго чалавека сталі моцна збіваць. Ад пабоеў ці па іншай прычыне ён паказаў на выпадковых людзей. Усіх іх расстралялі. Прозвішчы Г.С. Піскунова і Н.І. Піскуновай згадваюцца ў кнізе “Памяць” Віцебскага раёна як жыхары в. Трыгубцы – ахвяры фашысцкага тэрору.

Па дакументах НАРБ, успамінах Д.Р. Газіна 15–17 чэрвеня 1942 г. фашысты спалілі Вярхоўе, і навакольныя вёскі Шалыгі, Трыгубцы, Каралева, Цяцёркі, Койтава і іншыя. А жыхароў, якія не паспелі схавацца, пагналі ў Лужасна і больш як за 80 чалавек расстралялі. Вясной 1943 г. фашысты ў чарговы раз напалі на вёскі Каралева, Трыгубцы, Маркавічы, Высокае. На гэты раз фашысты сагналі людзей у Баркова (Гарадоцкі раён) і частку іх, як і ў Вярхоўі, расстралялі.

**К.: 55°19’06.0”N 30°14’29.7”E.**

*Літ. і К.: НАРБ. – Ф. 861. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 126–128; НАРБ. – Ф. 1363. Воп. 1. Спр. 974. Арк. 68–70; НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 411. Арк. 151–153; інфармацыя: Піскуноў Пётр Сямёнавіч (1927 г.н.) казаў, што пахаваны 13 чалавек. Шулькоў Аляксандр Канстанцінавіч (1957 г.н.) са слоў бацькоў – 11 чалавек; Ганчароў А.А. (1935 г.н.); в. Трыгубцы. Ахвяры фашысцкага тэрору // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Віцебскі раён. – С. 618–619.*



*Магіла ахвяр вайны ў в. Трыгубцы. 2018*

## в. ТУЛАВА, Тулаўскі сельсавет

**Месца гібелі яўрэяў Віцебскага гета (Памятны знак вязням Віцебскага гета).** Знаходзіцца злева ад дарогі на выездзе з Віцебска з вуліцы Лазо (у бок в. Тулава). У так званым Ілаўскім (Тулаўскім) рве фашысты праводзілі расстрэлы яўрэяў – жыхароў Віцебска, якія не паспелі эвакуіравацца з горада да прыходу немцаў. У рве замардавана каля 10000 віцебскіх яўрэяў. На месцы масавай гібелі яўрэяў у 1995 г. усталявана мемарыяльная шыльда, прымацавана да каменю. 25.06.2010 г. усталяваны помнік: фігура жанчыны і абрысы зоркі Давіда. На ніжняй частцы помніка, які знаходзіцца на шасціканцовай зорцы, надпіс: ”У памяці нашай заўсёды”, паўтораны на рускай і англійскай мовах. За помнікам – металічная арка. Побач мемарыяльны валун з надпісам: “Тут у 1941 годзе гітлераўцы расстралялі каля 10000 яўрэяў”. Надпіс паўтораны на іўрыце і англійскай мове.

**К: 55°12’17.9”N 30°16’22.5”E.**

*Літ. і К.: Осталась только память : очерки / сост. А.Л. Шульман. – Мн.: Медисонт, 2010. – 115 с.*





# У



## в. УЛАНАВІЧЫ, Бабініцкі сельсавет

**Месца загубы ваеннапалонных і савецкіх мірных жыхароў “Чорныя пруды”.** Каля вёскі Уланавічы, у мясцовасці пад назвай “Чорныя пруды” ўжо ў першыя дні вайны з 14 па 17 ліпеня 1941 г. фашысты праводзілі расстрэлы выкрытых удзельнікаў віцебскага антыфашысцкага савецкага падполля. Сюды прывозілі на расстрэл патрыётаў, вязняў канцлагера “Пяты полк”, з турмы СД, а таксама хавалі ўжо расстраляных у горадзе. Пазней тут былі знішчаны тысячы вязняў канцлагераў – ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, а таксама мірных жыхароў Віцебска і навакольных вёсак.

Масавае пакаранне адбывалася летам–увосень 1941 г. і ўвесь 1942 г. Вызначаюцца тры месцы расстрэлаў: на тэрыторыі Нова-Уланаўскай гары на самым пачатку і ў заходнім баку могілак “Дружба”. Побач знаходзіцца кавалак забалочанай мясцовасці, якое і называюць “Чорнымі прудамі”, “Чорным балотам”, “Чорнай лужынай”. Другое месца – уласна самі Чорныя пруды і пясчаная паляна насупраць Нова-Уланаўскай гары. Два гэтыя месцы раздзяляюць 200 м балоцістай нізменнасці. Трэцяе пахаванне знаходзіцца ў лесе за в. Уланавічы. Яно на самым ўскрайку лесу, за апошнімі дачамі. Па сведчаннях сведкаў, у “Чорных прудах” было 7 адкрытых пляцовак.

У 2001 г. усталяваны памятны знак з надпісам: “Потомок, не оскверни память тех, кто отдал жизнь за свою Родину и твое светлое будущее”.

*Літ. і К.: Бурдо А.А. Трагедия “Чёрных прудов” // http:www.pobeda.witebsk.by/land/epizode/black/*





## в. УЛАСАВА, Суражскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4443).** На грамадзянскіх могілках. Каменны абеліск усталяваны ў 1957 г. У 2010-х гг. заменены на гранітную стэлу. На ёй надпіс: “Вечная слава воинам и партизанам, павшим в боях за освобождение Родины”.

Пахаваны 12 чалавек: 3 савецкія салдаты і 9 партызан (СУВВЗ). Іх імёны размешчаны на бетонным надгробку перад абеліскам. Некаторыя партызаны пахаваны ў асобных магілах, але ўказаны на помніку.

**К.: 55°21’34.6”N 30°47’33.0”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 199; пашпарт ВП № 4443.*



**Магіла савецкіх салдат.** На грамадзянскіх могілках. Бетонны абеліск з надпісам: “Вечная слава героям, павшим в боях за Родину. Погибли в июне 1943 г. Иванов Петр Михайлович 1914 г. рожд. и 2 воина”.

**К.: 55°21’34.6”N 30°47’33.0”E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы пошукавай экспедыцыі ВКВ і Суражскай ДССШ 02.2020 г.*



**Магіла І.Ф. Нікіціна.** На грамадзянскіх могілках. Бетонны абеліск з металічнай зоркай. На помніку надпіс: “Никитин Иван Федорович. Пал в боях за Родину. 19...–1942”.

**К.: 55°21’34.6”N 30°47’33.0”E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы пошукавай экспедыцыі ВКВ і Суражскай ДССШ 02.2020 г.*




**Магіла А.Н. Давыдава.** На грамадзянскіх могілках. Металічны крыж на бетоннай аснове. Побач мармуровая шыльда з фотаздымкам у медальёне і надпіс: “Давыдов Ануфрий Никанорович. Погиб в 1942. Помним, скорбим”. У СУВВЗ указаны, што пахаваны ў брацкай магіле № 4443.

**К.: 55°21’34.6”N 30°47’33.0”E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы пошукавай экспедыцыі ВКВ і Суражскай ДССШ 02.2020 г.*






**Магіла І.П. Майсеева і яго сям’і.** На грамадзянскіх могілках. На высокім чорным гранітным помніку надпіс: “Моисееву Ивану Парфеновичу и его семье от дочери и сестры. Погибли XI. 1942 г.”.

**К.: 55°21’34.6”N 30°47’33.0”E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы пошукавай экспедыцыі ВКВ і Суражскай ДССШ 02.2020 г.*




## в. ФІЛІПКАВА (Филипково) Вымянскі сельсавет

**Магіла кавалера ордэна Славы трох ступеняў Абраменка Дзмітрыя Кузьміча.** Д.К. Абраменка нарадзіўся ў в. Філіпкава 22.07.1910 г. На фронце з ліпеня 1941 г. Камандзір гарматы, гв. ст. сяржант вызначыўся пры вызваленні Севастопаля, дзе ягоны разлік знішчыў 2 дэсантныя катэры, і пры вызваленні г. Шаўляй у Літве. У баі ў г. Прэйсіш-Элаў (Усходняя Прусія) агнём гарматы з адкрытай пазіцыі знішчыў 4 станкавыя кулямёты і падавіў дзве кулямётныя кропкі праціўніка. Тры разы быў паранены. Пасля вайны жыў і працаваў на Віцебшчыне. Узнагароджаны трыма ордэнамі Славы, ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Айчыннай вайны, медалём “За адвагу” і іншымі ўзнагародамі. Памёр 28.01.1984 г.




У 1985 г. на магіле ўзведзены абеліск. У 1990 г. пахаванне атрымала статус ГКК. Зараз статусу не мае.

**К.: 55°15’31.8”N 30°31’13.5”E.**

*Літ. і К.: Могила кавалера ордена Славы трех степеней Абраменко Д.К. // Решение исполнительного комитета Витебского областного Совета народных депутатов от 20 декабря 1990 г. № 348 // О дополнении государственных списков недвижимых памятников истории и культуры местного значения; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 349–350.*

## в. ФОКІНА, Вымянскі сельсавет

**Магіла Селязнёва Осіпа Паўлавіча.** На грамадзянскіх могілках. На магіле ўсталяваны металічны крыж з шыльдай, на якой маецца надпіс: “Селезнев Осип Павлович убит немцами в 11 лет”.

*Літ. і К.: Звесткі прадстаўлены В.М. Марозавым.*



## в. ФОКІНА, Вымнянскі сельсавет

**Магіла Селязнёва Патапа Пятровіча.** На грамадзянскіх могілках. На металічным крыжы шыльда з надпісам аб тым, што П. Селязнёў (1926–23.01. 1943) быў забіты красынскай паліцыяй 23 студзеня 1943 г.

*Літ. і К.: Звесткі прадстаўлены В.М. Марозавым; ДАВВ. – Ф. 256. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 91. Список погибших по Котовскому с/с.*

**Магіла сям'і Маркавых.** На грамадзянскіх могілках. Пахаваны два браты Маркавы, іх жонкі і дзеці, усяго 9 чалавек, забітыя ў 1943 г. Пасля вайны пастаўлены два каменныя помнікі. Адпаведна ДАВВ, загінулі: Марков Петр Исаевич, 1885; Маркова Евдокия Федоровна, 1905; Марков Василий Петрович, 1924; Маркова Мария Петровна, 1927; Маркова Евдокия Петровна, 1930; Марков Фома Исакович, 1909; Маркова Ксения Прохоровна, 1911; Марков Николай Фомич, 1937; Марков Демьян Фомич, 1939.

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 256. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 88. Список погибших по Котовскому с/с; звесткі прадстаўлены Пчолка Ірынай Навумаўнай, пляменніцай.*

**Магіла партызана.** На грамадзянскіх могілках, злева ад магілы сям'і Маркавых. На абеліску з металічнай зоркай белага металу шыльда, на якой змешчаны звесткі аб тым, што у гады вайны паліцыяй быў застрэлены Іван Фёдаравіч Галодны (1925–1943).

*Літ. і К.: Виртуальная книга памяти. http://kas954.blogspot.com/2017/10/blog-post_17.html.*










# X

## в. ХАЙСЫ, Мазалаўскі сельсавет

**Магіла Алёхіна Васіля Іванавіча.** На могілках. Партызан В.І. Алёхін быў забіты паліцэйскім у засадзе ўвосень 1943 г. каля Лужаснянскага млына. Пры забітым быў камсамольскі білет на імя Алёхіна Васіля Іванавіча. Яго пахавалі на месцы гібелі, на беразе р. Лужаснянка, каля ўпадзення ў яе Крывога ручая.

У 1964 ці 1977 г. выкладчык віцебскага ветінстытута Генадзь Аляксандравіч Сакалоў (доктар ветэрынарных навук), па дамове з сельскім саветам, са сваёй групай перапахаваў астанкі партызана на грамадзянскія могілкі ў в. Хайсы, у магілу салдат. На магіле пастаўлены металічны помнік з зоркай.

**К.: 55°16’33.1”N 30°05’44.6”E.**

*Літ. і К.: Успаміны мясцовых жыхароў; інтэрв’ю Г.А. Сакалова.*

**Магіла савецкіх сапёраў.** На могілках. Пахаваны два савецкія сапёры, якія загінулі пры размініраванні могілак у 1945 г. На магіле ўсталяваны металічны помнік. Інфармацыйная таблічка страчана.

**К.: 55°16’33.1”N 30°05’44.6”E.**

*Літ. і К.: Указаў на магілу Анатоль Пятровіч Карпенка, 1935 г.н.*





## в. ХАМЯКОВА, Курынскі сельсавет

**Месца базіравання штаба партызанскай брыгады імя Чырвонасцяжнага Ленінскага камсамола.** За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Ліпнік. На невялікім кургане размешчана бетонная стэла, да якой вядуць прыступкі. На стэле шыльда з надпісам: “Место дислокации штаба партизанской бригады имени Краснознаменного Ленинского комсомола. Создана в ноябре 1942 г. на базе отряда Д.Ф. Райцева. Командир бригады – Д.Ф. Райцев. Комиссары: В.К. Перунов, В.С. Цыганков”. Партызаны правадзілі дыверсіі на чыгунцы і шашы Віцебск – Гарадок, удзельнічалі ў жніўні 1943 г. у аперацыі “Рэйкавая вайна”, вялі баі супраць карных аперацый “Шаравая маланка”, “Майская навальніца”, “Дождж на Сёмуху”. 1.11.1943 г. і 03.12.1943 г. брыгада ў складзе 3 атрадаў (363 партызаны) злучылася з Чырвонай Арміяй.



У 1972 г. у гонар брыгады і яе баявых дзеянняў пастаўлена стэла.

Помнік захаваўся, але дарогі зааране.

**К: 55°23’55.3”N 30°22’45.3”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 199.*

**Месца бою 1942 г.** За 4 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, у раёне былой в. Платы. 28.03.1942 г. партызаны атрада пад камандаваннем Д.Ф. Райцава вялі жорсткі бой супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1978 г. на месцы бою насыпаны Курган, на вяршыні яго пастаўлена стэла. Мемарыяльная шыльда аднаўлена. На ёй нанесены тэкст: “Здесь 28 марта 1942 г. в бою с карателями погиб Герой Советского Союза Сильницкий Михаил Фёдорович, пулеметчик отряда Райцева Д.Ф.”.

**К: 55°23’55.3”N 30°22’45.3”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 199.*

**Помнік землякам.** У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну на франтах і ў партызанскай барацьбе, у 1980 г. насыпаны Курган і ўстаноўлена мемарыяльная пліта з чорнага граніту. На ёй надпіс: “Землякам, погибшим в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 г.“.

**К.: 55°22’56.4”N 30°22’45.4”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 199.*





## в. ХРАПАВІЧЫ, Мазалаўскі сельсавет

**Пахаванне невядомага савецкага воіна (№ 7842).** Магіла знаходзіцца на прысядзібным участку дома № 1. На магіле пастаўлены помнік у выглядзе металічнай піраміды з чырвонай зоркай. Магіла мае адмостку з цэменту, агароджана драўляным плотам, добра даглядаецца.

Па сведчанні Яўгеніі Васільевай (1935 г.н.), у магіле пахаваны "зусім малодзенькі чырвонаармеец, у шынэлі. Яго завярнулі ў посцілку і пахавалі".

Валянціна Фёдараўна Брыкава (1931 г.н., пражывае ў в. Буяны) засведчыла, што сама ўдзельнічала ў пахаванні. "Як прыйшлі ў Храпавічы ў чэрвені ці пачатку ліпеня 1944 г., салдацік малодзенькі ў канаве ляжыць. І немцаў поўна валялася, ну мы сначала толькі нашых хаpанілі. У карманах яголых паглядзелі – нічога не было. Верхняй вопраткі не было і пагонаў тожа не было. Адна жанчына ўзяла посцілку, мы на яе палажылі, выкапалі магілку зусім непадалёк ад той канавы і там яго пахаранілі. Потым, як дзень Пабеды, дык всегда там усе сабіраліся. Потым там дом пабудавалі, а тады не було".



**К.: 55°20'24.5"N 30°09'15.2"E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 7842; успаміны Я. Васільевай; успаміны В.Ф. Брыкавай.*

▪ ▪ ▪

**Магіла настаўніцы.** Знаходзіцца на правым беразе р. Храпаўлянка, ва ур. Малыя Храпавічы, на ўзбочыне поля. За 150 м ад былой фермы, збудаванай з чырвонай цэглы, за 50 м ад групы белых таполяў.

Са словаў відавочцаў вядома, што калі фашысты палілі дамы, настаўніца, якую звалі Марыя Аляксандраўна, не захацела разам са састарэлай маці адыходзіць ад дома, бо каля калодзежа закапалі частку маёмасці. За непадпарадкаванне фашысты забілі іх. Пахаваны сынам за 150 м ад свайго дома. Пасля вайны магіла была абнесена металічнай агароджай, пастаўлены крыж. Пахаванне даглядалася сынам.

Найбольш верагодна, тут пахавана настаўніца нямецкай мовы Храпавіцкай школы Марыя Аляксандраўна Ястрабава. Пацвярджаецца ўскоснымі звесткамі. 1 верасня 1942 г. фашысты спалілі вёску: 78 дамоў, 97 надврных пабудоў, усе грамадскія двары, школу, разбурылі царкву. Пры гэтым у вёсцы былі расстраляны 10 чалавек. У "Акце аб злачынствах нямецкіх акупантаў" сярод расстраляных жыхароў в. Храпавічы згадваецца Марыя Аляксандраўна Ястрабава (40 гадоў) і Марыя Аляксандраўна Ждановіч (80 гадоў). Сярод жыхароў в. Храпавічы, якія сталі ахвярамі фашысцкага тэрору, таксама ўпамінаюцца Ястрабава і яе маці.

**К.: 55°20'03.8"N 30°08'57.6"E.**

*Літ. і К.: Акт о преступлениях немецких оккупантов, совершенных в деревнях Витебского района 6 сентября 1942 г. // Трагедия белорусских деревень, 1941–1944: Документы и материалы / Сост. Н.В. Кириллова, В.Д. Селеменев [и др.]; редкол.: В.И. Адамушко [и др.] – М.: Фонд «Историческая память», 2011. – С. 54; Ахвяры фашысцкага тэрору. В. Храпавічы // Памяць: Віцебскі раён. – С. 619; успаміны В.Ф. Брыкавай; успаміны Васільевай Яўгеніі Канстанцінаўны, 1935 г.н.*



## в. ХРАПАЛЬНА, Забудроўскі сельсавет

**Месца гібелі савецкіх ваеннапалонных і мірных грамадзян.** Знаходзіцца каля в. Храпальна. Перад вёскай, з боку Суража, каля так званага Сахонавага маста, праз ручай немцы расстралялі шмат ваеннапалонных і мірных жыхароў (старых, тых, хто не мог ісці), якіх гналі ў Пяты полк.

**К.: 55°23'16.7"N 30°41'19.4"E.**

*Літ. і К.: Інфармацыя З.Н. Касянок.*

# Ц



## в. ЦІМАХІ (не існуе), Запольскі сельсавет

**Месца першага бою партызанскага атрада Шмырова Міная Піліпавіча.** За 200 м на поўнач ад вёскі. Партызанскі атрад М.П. Шмырова (“Бацькі Міная”) пачаў дзейнічаць з ліпеня 1941 г. 25.07.1941 г. каля хутара Самахваліхі партызаны правялі першы бой. На беразе р. Тураўка атрад нямецкай конніцы размясціўся на адпачынак. Партызаны напалі на атрад і забілі каля 30 гітлераўцаў. У памяць аб гэтым баі ў 1964 г. пастаўлены абеліск.

Помнік захаваўся, але да месца складана дабірацца. Знаходзіцца ў 7 км ад в. Пудаць, дарогі няма. Месца былой вёскі леснікі засадзілі лесам.

**К: 55°35’08.0”N 30°53’56.1”E.**

*Літ. і К.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Документы и материалы. Т. 1. – Мн., 1967; Бялевіч А. Мінай Шмыроў. – Мн., 1970; ЗПГіКБ. Вв. – С. 200.*



## в. ЦЯЦЁРКІ, Мазалаўскі сельсавет

**Магілы савецкіх салдат.** На пачатку могілак (заходні бок), перад магілай Коршунава Віктара. Дзве магілы без крыжоў і агародж. Са слоў Я.С. Кукушкінай, там пахаваны савецкія салдаты. Яна ведае ад Чыжыкавай Алены Сяргееўны, якая з’яўлялася сведкай падзей.

У 2006 г. Калінкіна Зінаіда Філіпаўна ўказвала на некаторыя магілы ў вёсках Калінава і Цяцёркі як месцы, дзе былі пахаваны салдаты, якія загінулі ў лютым 1942 г., але раскопкі, якія праводзіліся салдатамі 52-га ОСПБ, нічога не выявілі.

**К: 55°16’19.3”N 30°13’11.3”.**

*Літ. і К.: Матэрыялы палявога даследавання 10.2020 г.; інфармацыя Я. Кукушкінай.*



# Ч

## в. ЧЫРВОНАЯ ІСКРА (былая в. СУМЫ), Вымнянскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4469).** На грамадзянскіх могілках. У 1985 г. лічыліся пахаванымі 40 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў (ЗПГіКБ. Вв.). Па дадзеных СУВВЗ, пахаваны 423 савецкія воіны. У 1964 г. на магіле ўсталяваны абеліск. У 2013–2015 гг. усталяваны мемарыяльныя пліты з імёнамі загінуўшых. Пахаванне мае металічную агароджу з цаглянымі слупамі.

**К: 55°15’26.5”N 30°28’50.1”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4469; http://pomnim.vymno.of.by/br-mogily/bm-4469.html.*



## в. ЧЫРВОНЫ ДВОР, Мазалаўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4424).** На ўсходняй ўскраіне вёскі. Пахаваны 58 воінаў, якія загінулі ў 1943–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў (1985). Па звестках СУВВЗ, у магіле пахаваны 8 савецкіх салдат. У 1965 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна. Па сведчаннях мясцовых жыхароў, першапачаткова на могілках былі таблічкі з указаннем прозвішчаў, званняў, пасад пахаваных салдат і афіцэраў. У нейкі час іх перанеслі ў Сушчова, магілы проста разраўнялі. У пазнейшы час ўсталявалі помнік, зрабілі 4 сімвалічныя магілы, аднак таблічак назад не перанеслі.

**К.: 55°20’31.7”N 30°18’45.5”E.**

*Літ. і К.: Пашпарт ВП № 4424; ЗПГіКБ. Вв. – С. 200.*



**Магіла ахвяр вайны.** На грамадзянскіх могілках. Пахаваны 17 чалавек. На помніку сімвал серп і молат і надпіс: “В 1943 г. расстреляны немецкими фашистами Коралева Мария Николаевна, Маскалева Лидия Матвеевна и ее трое детей, Крицкая Дарья Матвеевна и ее двое детей, семья Орловых девять человек. От дочери и сестры Марии”.

**К.: 55°20’14.1”N 30°18’39.5”E.**

*Літ. і К.: Шифротелеграмма В.Г. Бирюкова в БШПД о расправе немецких оккупантов с населением деревень Суражского и Витебского районов 12 апреля 1943 г. // Трагедия белорусских деревень, 1941–1944: Документы и материалы / Сост. Н.В. Кириллова, В.Д. Селеменев [и др.]; Редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. – М.: Фонд «Историческая память», 2011. – С. 137; інфармацыя Антоненкавай Сафіі Сцяпанаўны, в. Чырвоны Двор, вул. Паўднёвая, 1.*

**Магіла ахвяр вайны.** На грамадзянскіх могілках. Пахаваны 12 чалавек. На помніку надпіс: “Маскалевы Марк Федосович (1883–1943), Мария Касьяновна (1884–1943), Татьяна, Наталья и еще 8 человек их дети расстреляны в 1943 году. Родные”.

**К.: 55°20’14.1”N 30°18’39.5”E.**

*Літ. і К.: Шифротелеграмма В.Г. Бирюкова в БШПД о расправе немецких оккупантов с населением деревень Суражского и Витебского районов 12 апреля 1943 г. // Трагедия белорусских деревень, 1941–1944: Документы и материалы / Сост. Н.В. Кириллова, В.Д. Селеменев [и др.]; Редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. – М.: Фонд «Историческая память», 2011. – С. 137; інфармацыя Антоненкавай Сафіі Сцяпанаўны, в. Чырвоны Двор, вул. Паўднёвая, 1.*

**Магіла ахвяр вайны.** На грамадзянскіх могілках. Пахаваны 4 чалавекі. Усталяваны металічны крыж з шыльдачкай. На ёй надпіс: “Расстреляны фашистами Добрецов М.И., Пискунов П., Антоненко В., Москалёв А.”.

**К.: 55°20’14.1”N 30°18’39.5”E.**

*Літ. і К.: Інфармацыя Антоненкавай Сафіі Сцяпанаўны, в. Чырвоны Двор, вул. Паўднёвая, 1.*









**Магіла партызана Каралёва Канстанціна Паўлавіча.** На грамадзянскіх могілках. Партызан К.П. Каралёў (1902–02.05.1943) быў забіты у засадзе фашыстамі. На магіле ўсталяваны металічны крыж з шыльдачкай, але надпіс нельга прачытаць. Пахаванне не мае агароджы.

**К.: 55°20’13.7”N 30°18’39.6”E.**

*Літ. і К.: Партызаны і падпольшчыкі, удзельнікі антыфашысцкага руху і падполля , члены іх сем’яў – ахвяры фашысцкага тэрору // Памяць: Віцебскі раён. – С. 578; інфармацыя Антоненкавай Сафіі Сцяпанаўны, в. Чырвоны Двор, вул. Паўднёвая, 1.*

**Магіла невядомага савецкага радыста.** Савецкі радыст, які быў закінуты з тылу ў партызанскі атрад для сувязі, смяротна параніў сябе са свайго аўтамата ў час трывогі. Пахаваны на грамадзянскіх могілках побач з магілай К.П. Каралёва На магіле ўсталяваны металічны крыж. Пахаванне не мае агароджы.

**К.: 55°20’13.7”N 30°18’39.6”E.**

*Літ. і К.: Інфармацыя Антоненкавай Сафіі Сцяпанаўны, в. Чырвоны Двор, вул. Паўднёвая, 1.*








## в. ШАЛЫГІ, Мазалаўскі сельсавет

**Пахаванне ахвяр вайны.** Знаходзіцца за 400 м на паўднёвы захад ад вёскі. Металічны крыж у агароджы. У часы вайны нямецкія фашысты спалілі хутар з людзьмі. Па паказаннях мясцовых жыхароў, дакладна вядома імя аднаго пахаванага – Вярцёлкіна. У Вярхоўі жыла сям'я Кірылавых, які наведвалі магілку.

Восенню 1943 г. карнікі наляцелі на жыхароў в. Шалыгі. Яны капалі ў полі бульбу, там, каля могілак, іх і зрашацілі нелюдзі з аўтаматаў. У лютым 1943 г. фашысты спалілі жывымі 28 чалавек, растралялі 7, паранілі 1, павялі з сабой траіх чалавек. Спіс з прозвішчамі маецца. У кнізе "Памяць" на с. 619 змешчаны спіс забітых фашыстамі жыхароў в. Шалыгі. У ім 37 чалавек. Шэрагу прозвішчаў з "Акта 28.03.1943 г." няма.



**К.: 55°18'26.5"N 30°15'47.6"E.**

*Літ. і К.: Памяць – С. 233; інфармацыя Каруннага Генадзя Мікалаевіча, 1958 г.н.; Шалыги: Акт 28 марта 1943 г. // НАРБ. Белорусские деревни, сожженные в годы ВОВ // [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://db.narb.by/search/5081.*

## в. ШУЛЬЦАВА, Акцябрскі сельсавет

**Вышыня 222,9.** За 1,2 км на паўночны ўсход ад вёскі. Каля дарогі М8 (Е-95), паварота на дарогу, яка вядзе на аэрапорт. 05.06.1944 г. воіны 17-й гвардзейскай стралковай дывізіі і іншых часцей 39-й арміі штурмам авалодалі вышынёй 222,9 і адкрылі шлях да вызвалення Віцебска. На помніку размешчаны надпіс: "Воинам 39-й Армии, проявившим мужество и героизм в боях с немецко-фашистскими захватчиками". У 1976 г. на вышыні ў гонар гэтых падзей пастаўлены мемарыяльны знак. Бетонная стэла з барэльефамі Чырвонай зоркі і Георгіеўскай стужкі.



**К.: 55°08'44.5" N 30°20'21.0"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 200.*

## в. ШАПЕЧЫНА, цэнтр сельсавета

**Мемарыяльны знак Лучосе.** Каля будынка Шапечынскага сельскага выканаўчага камітэта, каля дарогі Віцебск – Орша. Са снежня 1943 па чэрвень 1944 г. на подступах да Віцебска праходзілі жорсткія баі. Савецкія войскі неслі цяжкія, часта неапраўданыя страты. Па неафіцыйных звестках, у баях за Віцебск загінула больш за 80 тысяч салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, а горад так і не быў узяты. Памятны знак усталяваны членамі пошукавых атрадаў Віцебшчыны ў гонар салдат 5-й, 33-й, 39-й армій, якія загінулі на віцебскім напрамку ў 1943–1944 гг.

Камандзір снайперскага ўзвода, малодшы лейтэнант Георгій Ушакоў напісаў верш у памяць пра загінуўшых таварышаў, у якім даваў запавет назваць іменем ракі Лучосы, на якой загінула столькі сяброў, будучую дачку.



*И в память тех, кто в росную траву*
*Упал, свой долг отдавши честно,*
*Я будущую дочку назову*
*Твоим прекрасным именем, Лучеса.*

Георгій Ушакоў загінуў у баях за Літву. Але ягоная сястра, выконваючы запавет брата, назвала сваю дачку Лучосай. Цяпер яна пражывае ў Петрапаўлаўску-Камчацкім.

Намаганнямі актывістаў пошукавага руху Віцебшчыны, у 2000 г. у Шапечына ўзведзены помнік Лучосе. Металічны крыж і пліта з чорнага граніту з вершам-прысвячэннем. Побач інсталяцыя, якая сімвалізуе выбух. Помнік узведзены актывістамі пошукавага руху Віцебшчыны ў 2000 г.

**К: 54°59’39.9”N 30°18’47.0”E.**

*Літ. і К.: Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы. – Мн., 2008. – С. 134–135.*

## в. ШАПУРОВА, Суражскі сельсавет

**Мемарыяльная шыльда ў памяць А.Я. Сакалова** На будынку Шапуроўскага сельскага Дома культуры ўсталявана шыльда з тэкстам: “В 1942–1943 годах на территории Суражского р-на в сражениях с гитлеровскими захватчиками участвовала 17-я Смоленская партизанская бригада. В одном из боев 23 июля 1943 года геройски погиб комбриг СОКОЛОВ Анатолий Евлампиевич”.

**К.: 55°23’05.7”N 30°45’22.1”E.**

*Літ. і К.: Матэрыялы палявога даследавання 02.2020 г.*

*Шыльда ў гонар А.Я. Сакалова ў в. Шапурова. 2020*



**Помнік Шмырову Мінаю Піліпавічу.** Каля адміністрацыйнага будынка эксперыментальнай базы імя М.П. Шмырова Беларускага рэспубліканскага аб'яднання па насенняводству сельскагаспадарчых культур. Бюст Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова – аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобл. у Вялікую Айчынную вайну, устаноўлены ў 1970 г.

**К: 55°23'06.2"N 30°45'18.3"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 200.*






*Шыльда ў гонар брыгады імя А. Данукалава ў в. Рабава, цяпер у Шапурова. 2019*

**Месца фарміравання і базіравання партызанскай брыгады імя А.Ф. Данукалава.** Першапачаткова была ўсталявана ў в. Рабава. У раёне вёсак былога калгаса "Чырвоны Сцяг" была сфарміравана і дзейнічала да лістапада 1942 г. партызанская брыгада імя Героя Савецкага Саюза А.Ф. Данукалава (да красавіка 1944 г. называлася брыгада "Аляксея").

Брыгада была створана ў красавіку 1942 г. на базе атрадаў "Радзіма", "Крэпасць", "Гроза врагам" (потым "Смерць ворагам"). Дзейнічала на тэрыторыі Смаленскай (Касплянскі р-н) вобл. РСФСР, Віцебскай (Аршанскі, Багушэўскі, Бешанковіцкі, Віцебскі, Лёзненскі, Суражскі, Ушацкі, Чашніцкі р-ны) і Вілейскай (Плiскі р-н) абласцей БССР.

Камандзіры брыгады – А.Ф. Данукалаў (04.1942 г. – 04.1944 г., загінуў), В.А. Блахін (04–07.1944 г.).

Партызаны брыгады ў 1942 г. разграмілі варожыя гарнізоны ў вёсках Шапурова, Будзянка, Ляшчова Суражскага, Стасева Лёзненскага р-наў, удзельнічалі ў баях супраць карнікаў, сістэматычна праводзілі дыверсіі на чыгунках Віцебск – Орша, Віцебск – Смаленск, Полацк – Маладзечна, на шашэйных дарогах Віцебск – Веліж, Віцебск – Лёзна, Віцебск – Янавічы – Панізоўе, Сянно – Віцебск, Лепель – Віцебск, Чашнікі – Бешанковічы і інш. 01.07.1944 г. брыгада ў складзе 12 атрадаў (1817 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

У 1976 г. на будынку праўлення калгаса "Чырвоны Сцяг" устаноўлена мемарыяльная дошка. У 2018 г. перанесена ў будынак Дома культуры ў в. Шапурова.

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195.*

## ур. ШАРКІ (не існуе), Заронаўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4409).** За 2 км на поўнач ад в. Варашылы, каля дарогі Варашылы – Казлы. Бетонны абеліск з металічнай зоркай усталяваны на пахаванні ў 1967 г. На ім выбіты словы: "Вечная слава и память погибшим сынам нашей Родины 1941–1944 гг.". Надмагільных помнікаў няма. Маецца металічная агароджа.

На 1985 г. лічылася, што ў магіле пахаваны 962 воіны і партызаны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Па звестках СУВВЗ, у магіле пахаваны 390 савецкіх салдат. Імёны ўсіх салдат вядомы. Пахаванне мае статус ГКК. У 1980 (1977?) г. на магіле пастаўлены абеліск.

**К: 55°17'27.1"N 29°58'35.4"E".**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 200; пашпарт ВП № 4409.*



## в. ШАПУРЫ (Арлова), Акцябрскі сельсавет

**Воінскія могілкі (№ 4420).** У цэнтры вёскі, пры шашы Віцебск – Смаленск, насупраць д. 11 па вул. Пераможцаў. 1959 г. пастаўлены помнік – фігура салдата, які ў адной руцэ трымае аўтамат, у другой каску. Побач два надмагіллі з плітамі ў гонар Герояў Савецкага Саюза П.В. Шысцерава і Г.С. Грыгор’ева. У 1982 г. помнік быў дэмантаваны і ўзведзена мемарыяльная сцяна з надпісам-прысвячэннем: “Вечная слава павшим в боях за свободу и независимость нашей Родины 1941–1945 г.г.” і надмагіллі. Пазней да сцяны былі прымацаваны выява ордэна Айчыннай вайны і барэльеф трох воінаў. Вышыня сцяны 4 м, маецца агароджа. У 2016 г. быў праведзены рамонт мемарыяла, заменены пліты. Побач узведзена капліца.Помнік і пахаванне маюць статус ГКК.







На 1973 г. у пахаванні лічылася 10013 савецкіх салдат. На 1985 – 11,5 тыс. воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Па звестках СУВВЗ – 17132. Сюды перапахаваны астанкі савецкіх салдат з навакольных вёсак. Лічыцца, што Г.С. Грыгор’еў пахаваны ў в. Копці.

Г.С. Грыгор’еў нарадзіўся ў 1924 г. у в. Лажкі Мажайскага р-на Маскоўскай вобл. У Чырвонай Арміі з лютага 1942 г. Член ВЛКСМ. 20.01.1944 г. група разведчыкаў 94-й асобай гвардзейскай разведроты 91-й гв. сд атрымала заданне правесці разведку боем і захапіць “языка”. У баі пры выкананні задання вызначыўся гвардыі сяржант Г.С. Грыгор’еў. У рашаючы момант бою ён закрыў сваім целам варожы кулямёт, што забяспечыла поспех аперацыі. Група знішчыла больш за 20 гітлераўцаў і ўзяла 2-х палонных. 03.06.1944 г. Г.С. Грыгор’еву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

П.В. Шысцяроў нарадзіўся ў 1917 г. у в. Бабыліца Пышчугскага р-на Кастрамской вобл. Член ВЛКСМ з 1942 г. У Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941 г. Радавы 940-га сп 262-й сд імя Дзямідава. 21.6.1944 г. каля в. Шапуры пасля працяглага артылерыйска-мінамётнага абстрэлу гітлераўцы пайшлі ў атаку на пазіцыі савецкіх войск. П.В. Шысцяроў, застаўшыся адзін, стрымліваў ворага аўтаматным агнём. Калі скончыліся патроны, адбіваўся гранатамі. Загінуў у няроўным баі. 24.03.1945 г. П.В. Шысцярову прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Усталявана памятная шыльда ў памяць снайпера 919-га сп 251-й сд Бабкова Аляксандра Васільевіча (1912–17.06.1944).

**К: 55°06’42.6”N 30°16’56.5”E.**

*Літ. і К.: Кошалеў М.К. Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984; ЗПГіКБ. Вв. – С. 180; ЗПГіКБ. Вв. – С. 179; пашпарт ВП № 4420.*

**Помнік у гонар 1-й штурмавой камсамольскай брыгады.** За 400 м на поўдзень ад вёскі каля шашы Віцебск – Орша. 1-я штурмавая інжынерна-сапёрная камсамольская брыгада рэзерву Вярхоўнага Галоўнакамандавання пачала баявы шлях з 1941 г. у Падмаскоўі, у 1944 г. удзельнічала ў вызваленні Віцебшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і панесла вялікія страты. У 1976 г. у гонар брыгады ўстаноўлена бетонная пліта. На пліце – карта баявога шляху брыгады, зверху – зорка і выява рук, якія трымаюць чашу з Вечным агнём. Помнік ўзведзены будаўнічым атрадам “Горящие сердца”.

**К: 55°06’18.4”N 30°17’02.2”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 180; 1-я штурмовая инженерно-саперная Смоленская бригада // http://safe-rgs.ru/1457-1-ya-shturmovaya-inzhenerno-sapernaya-smolenskaya-krasnoznamennaya-ordenov-suvorova-i-kutuzova-komsomolskaya-brigada.html.*



## в. ШУХВАСТЫ (не існуе), Мазалаўскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Шухвасты знаходзілася за 6 км на паўднёвы ўсход ад в. Шчучына. Перад вайной у ёй жылі 154 чалавекі. У жніўні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 61 жыхара в. Шухвасты, вёску (32 двары) спалілі. У кнізе "Памяць" у спісе загінуўшых жыхароў в. Шухвасты пазначаны 25 чалавек. Пасля вайны не адрадзілася. У 1975 г. на месцы былой вёскі пастаўлена стэла. На шыльдзе тэкст: "Товарищ, остановись. На этом месте находилась д. Шухвосты, сожженная фашистами в августе 1943 г. вместе с 70 жителями". Увекавечана ў мемарыяльным комплексе "Хатынь". На пач. XX ст. верагодна сваякамі ўсталяваны яшчэ адзін мемарыяльны знак з шыльдай.

**К.: 55°24'25.5"N 30°17'28.0"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 200; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 228.*






## в. ШЧУЧЫНА, Мазалаўскі сельсавет

**Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4425).** За 250 м на поўдзень ад вёскі. Пахаваны воіны, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, (43 СУВВЗ). У 1977 г. на магіле пастаўлены абеліск. Па сведчаннях мяцовых жыхароў, значная колькасць магіл знаходзілася каля дарогі, аднак перанесены не былі і заворваліся ў час палявых работ.

**К.: 55°22'31.4"N 30°13'42.2"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 200; пашпарт ВП № 4425.*



## в. ШЫЛЫ, Мазалаўскі сельсавет

**Магіла савецкага воіна (№ 5715).** На ўсходняй ускраіне вёскі, на беразе воз. Сосна. Савецкі воін загінуў у 1941 г. У 1960 г. на магіле пастаўлены металічны абеліск з зоркай наверсе.

**К.: 55°21'18.0"N 30°04'15.7"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 200; пашпарт ВП № 5715.*



## в. ШЫЦІКІ (не існуе), Запольскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Шыцікі знаходзілася за 5 км на поўдзень ад в. Дразды, у лесе. У маі 1942 г. нямецка-фашысцкія карнікі спалілі вёску разам з жыхарамі (84 чалавекі, 38 двароў). Пасля вайны не адрадзілася. У 1965 г. на месцы былой вёскі пастаўлена стэла. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь“.

**К: 55°33’52.9”N 30°54’10.2”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 200; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 228.*




Манумент в. Шыцікі ў на Могілках вёсак ў мемарыяльным комплексе“Хатынь”






Сучасны памятны знак






## г.п. ЯНАВІЧЫ, цэнтр сельсавета

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4446).** На могілках. Пахаваны 201 воін і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Па дадзеных СУВВЗ, у магіле пахаваны 131 савецкі салдат і афіцэр. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск: піраміда на кубе з зоркай наверсе. На адным з бакоў ордэн Айчыннай вайны і шыльда з тэкстам: “Вечная слава павшим в боях за Родину”. У 2015 г. быў праведзены рамонт, у 2017 г. абкладзены гранітнымі плітамі.

**К: 55°17’34.3”N 30°41’36.2”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 200; пашпарт ВП № 4446.*

**Помнік у гонар вучняў і настаўнікаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.** Каля Янавіцкай СШ. “Светлой памяти учителей и учеников Яновичской школы погибших в боях за Родину в 1941–1945 гг.”. Нижэй выява двух сцягоў, зоркі і лаўровых галінак. Усталяваны ў гонар настаўнікаў і вучняў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў 1975 г.

**К.: 55°17’40.1”N 30°41’54.4”E.**

*Літ. і К.: Осталась только память // Мое местечко [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://shtetle.com/Shtetls/janovichi/janovichi.html Дата доступу: 21.01. 2019 г.; і К.: Витебская энциклопедия: http://www.evitebsk.com/wiki/Яновичи#.D0.AF.D0.BD.D0.BE.D0.B2.D0.B8.D1.87.D1.81.D0.BA.D0.BE.D0.B5_.D0.B3.D0.B5.D1.82.D1.82.D0.BE.*





**Радзіма Гарфункіна Рыгора Саламонавіча.** Герой Савецкага Саюза Р.С. Гарфункін нарадзіўся 06.08.1920 г. у рабочай сям'і. Працаваў токарам у Віцебску. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з верасня 1941 г. Вызначыўся 22.09.1943 г. у баі за р. Дняпро на Украіне. Разам з групай разведчыкаў радавы Р.С. Гарфункін пераправіўся на правы бераг ракі ў тыл фашыстаў, разведаў іх сістэму абароны, размяшчэнне агнявых кропак. Калі разведчыкі вярталіся назад, іх заўважылі гітлераўцы і адкрылі ўраганны агонь. Р.С. Гарфункін, які аўтаматным агнём прыкрываў пераправу, загінуў у гэтым баі. 10.01.1944 г. Р.С. Гарфункіну прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем названа вуліца ў г.п. Янавічы. У 1960-я гг. помнік герою быў узведзены і размяшчаўся на тэрыторыі віцебскага прыборабудаўнічага завода, на якім да вайны працаваў Р.С. Гарфункін. У 2017 г. помнік быў перанесены ў Янавічы. Знаходзіцца ў цэнтры населенага пункта.



**К.: 55°17'40.6"N 30°41'49.7"E**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 200.*

**Месца гібелі яўрэяў.** За 1 км ад Янавіч, каля былой в. Ахруткі (з 1964 г. – в. Сцяпная), ва ўрочышчы Стрэлка, на беразе бязыменнага ручая, за зерняпокам. З канца чэрвеня па жнівень 1941 г. немцы расстралялі некалькі груп яўрэяў. Спачатку 30–40 мужчын. Потым каля 20 пажылых яўрэяў. У 1956 г. быў узведзены абеліск з надпісам: "Вечная память гражданам СССР, зверски расстрелянным гитлеровскими бандитами 10 сентября 1941 г.". На пачатку 2000 г. каля яго на сродкі нашчадкаў закатаваных былі пастаўлены новы помнік, на якім выява меноры і тэкст на беларускай, англійскай мовах і іўрыце: "Ахвярам нацызму. Тут у 1941–1942 гг. былі па-зверску закатаваны 230 яўрэяў – мясцовых жыхароў".

**К.: 55°16'40.6"N 30°43'13.1"E.**

*Літ. і К.: Шульман А.А. Место его уже не узнает. – Мн.: Медисонт, 2007. – С. 187.*



**Магіла невядомага савецкага лётчыка (№ 5727).** На грамадзянскіх могілках. У канцы кастрычніка 1943 г. у небе між вёскамі Валькі і Ахруткі (у наш час в. Сцяпная) і в. Купякі (зараз не існуе) завязаўся паветраны бой. Нямецкі самалёт упаў у балота за в. Валькі, а савецкі – каля в. Ахруткі. Савецкі лётчык прыгнуў з парашутам, але прызямліўся ўжо мёртвым. Невядомы жыхар вёскі забраў цела дадому, а ўначы пахаваў на грамадзянскіх могілках Янавічаў.

Пасля вайны на магіле быў пастаўлены металічны знак з зоркай. Яе даглядалі вучні Янавіцкай СШ, а потым сям'я Крывапускаў. 03.07.2019 г. на магіле ўстанавілі гранітны помнік. На ім выява збітага савецкага самалёта і лётчыка, які спускаецца на парашуце. Вышэй надпіс: "Неизвестному солдату, освобождавшему пос. Яновичи. От благодарных потомков".

**К.: 55°17'40.1"N 30°41'54.4"E.**

*Літ. і К.: Русланова Н. Подвиг летчика в граните // ЖП. – 2019. – 13 ліп. – С. 3; інфармацыя прадастаўлена А.А. Ізобавым, успаміны відавочцы бою – А.І. Сонавай, інфармацыя В.І. Баранава (успаміны маці).*



**Месца знішчэння вязняў Янавіцкага гета.** За 13 км на ўсход ад Янавіч, ва ўрочышчы Зайцава, між былых вёсак Зайцава і Ляшчова. У пачатку акупацыі ў м. Янавічы фашыстамі было ўтворана гета, у якое былі перамешчаны ўсе яўрэі мястэчка. На працягу лета немцы расстралялі некалькі груп яўрэяў, спачатку мужчын, потым юнакоў, некалькі груп жанчын і дзяўчат. 10.09.1941 г. нямецкімі фашыстамі былі расстраляны і пахаваны ў супрацьтанкавым рве яўрэі – вязні Янавіцкага гета. Усяго было 7 ям былога супрацьтанкавага рва.

02.11.1943 г. спецыяльнай камісіяй Чырвонай Арміі была праведзена судмедэкспертыза месца пахавання. Тры ямы памерамі 5 на 5 метраў, глыбінёй да 4 метраў былі запоўнены зваленымі ў беспарадку целамі людзей. Колькасць ахвяр ацэнена ў 1601 чалавек.

Адразу пасля вайны на месцы загубы быў пастаўлены сціплы драўляны помнік з таблічкай, на якой было напісана: “Гэта тут”. У 1955 г. тут быў узведзены каменны помнік. Новы помнік на сродкі сям’і Лазарусаў пастаўлены за 200 м ад магілы на развілцы дарог, адна з якіх ідзе на Рудню, другая – да месца пахавання.

**К.: 55°18’38.0”N 30°48’38.2”E.**

*Літ. і К.: Рывкин М.С., Шульманом А.Л. “Десятый круг ада” // Народнае слова. – 1994. – 19 мая; Шульман А.А. Место его уже не узнает. – Мн.: Медисонт, 2007. – С. 118–200; Осталась только память : очерки / сост. А.Л. Шульман. – Мн.: Медисонт, 2010. – С. 89–110.*



*Новы помнік (в. Ахруткі/Сцяпная)*





*Новы помнік ва ўр. Зайцава*



**СТРАЧАНЫЯ ПОМНІКІ**

**I дадатак**

## в. АРЖАВУХАВА (не існуе), Суражскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Аржавухава знаходзілася за 3 км на поўдзень ад в. Уласава. Перад вайной у ёй жылі 32 чалавекі. 11.12.1942 г. у час карнай экспедыцыі "Зімовы лес" нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 23 жыхароў, вёску (13 двароў) спалілі. Пасля вайны не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе "Хатынь".

**К.: 55°20'31.7"N 30°48'42.2"E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 180; Памяць: Віцебскі раён: ГДХГіРБ, 2004. – С. 227.*




*Месца не выяўлена*

## п. ВЯРХОЎЕ (РУБА-2)

**Помнік 1-й Віцебскай партызанскай брыгадзе.** На перакрыжаванні дарог ст. Лужасна – Руба і Вярхоўе – Сушчова. Разбураны ў выніку аўтамабільнай аварыі.

**К.: 55°17'23.3"N 30°15'02.9"E.**



*Помнік разбураны ў выніку аўтамабільнай аварыі на пач. 2000-х гг. Не адноўлены*

## в. ГАРКАВА, Курынскі сельсавет

**Месца баёў 1943 г.** У раёне былой вёскі Галевічы ў перыяд з 28 лютага па 4 сакавіка 1943 г. праходзілі баі партызан супраць нямецка-фашыскіх захопнікаў, у час якіх загінуў камандзір Багушэўскай партызанскай брыгады М.П. Крэсік. У 1960 г. на ўшанаванне памяці партызан і іх баявых дзеянняў на будынку сельскага клуба ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 185.*

*Шыльда не захавалася, няма і клуба. Трэба вызначыць, дзе знаходзіцца*

## в. МАРКАВІЧЫ, Мазалаўскі сельсавет (не існуе)

**Памятная шыльда “Месца баёў 1942–1943 гг.”** У раёне вёскі ў 1942–1943 гг. партызаны 1-й Віцебскай брыгады неаднаразова вялі баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1968 г. у памяць аб гэтым на доме № 7 устаноўлена мемарыяльная дошка.

*Літ.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 193–194.*

*Зараз вёскі не існуе. Дошка была знята, дзе знаходзіцца – невядома*

## в. МІХАЛКОВА, Курынскі сельсавет

**Месца расстрэлу савецкіх патрыётаў.** У чэрвені 1942 г. гітлераўцы расстралялі ў вёсцы 22 савецкіх патрыётаў. У 1965 г. на ўшанаванне іх памяці на будынку клуба ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Дзе зараз яна знаходзіцца, невядома.

14.07.1942 г. расстралялі 8 маладых дзяўчат. З кнігі “Памяць” вядомы імёны Кандраценкі Ганны Якаўлеўны, Райцавай Ганны Ігнацьеўна, Карнёвай Марыі Іванаўны.

**К.: 55°22’11.8”N 30°22’28.8”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194; Памяць: Віцебскі раён. – С. 226.*

*Шыльда страчана. Трэба выявіць прозвішчы загінуўшых і аднавіць мемарыяльную дошку*

## в. ПАДЗАРОДНЯ (не існуе), Запольскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Падзародня знаходзілася за 1 км на поўдзень ад в. Храпакі. Перад вайной у ёй жылі 82 чалавекі. У 1942 г. нямецка-фашысцкія карнікі загубілі 21 жыхара Падзародні, вёску (19 двароў) спалілі. Пасля вайны не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”.

Урочышча з такой назвай мясцовыя ўжо не ведаюць. Знаходзілася непадалёк ад спаленай вёскі Стэськава.

**К.: 55°27’50.4”N 30°41’18.2”E**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 194; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 227.*







*Месца не выяўлена*

## в. ПУНІШЧА, Запольскі сельсавет

**Радзіма Шмырова Міная Піліпавіча.** Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобл. у Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза М.П. Шмыроў нарадзіўся 23.12.1891 г. Памёр у 1964 г. Пахаваны на вайсковых могілках у Віцебску. У 1975 г. у вёсцы на радзіме М.П. Шмырова ўстаноўлены абеліск з мемарыяльнай дошкай.

**К: 55°28’34.8”N 30°43’38.7”.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195.*



*Ні абеліска, ні дошкі не захавалася*

## в. СТУКАЛЬНА (не існуе), Суражскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Стукальна знаходзілася за 1,5 км на паўночны ўсход ад в. Уласава. Перад вайной у ёй жылі 37 чалавек. 11.11.1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 30 жыхароў в. Стукальна, вёску (13 двароў) спалілі. Пасля вайны не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”.

**К.: 55°21’43.8”N 30°48’24.6”E**

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 520. Воп. 1. Спр. 269. Арк. 27. Населеныя пункты Віцескага раёна, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны разам з жыхарамі і не адноўленыя пасля вайны; ЗПГіКБ. Вв. – С. 187; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 228.*







*Не зразумела, ці захаваўся помнік*

## в. СТЭСЬКАВА (не існуе), Запольскі сельсавет

**Месца спаленай вёскі.** Вёска Стэськава знаходзілася за 1–2 км на поўдзень ад в. Храпакі. Перад вайной у ёй жылі 46 чалавек. У 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 20 жыхароў, вёску (11 двароў) спалілі. Пасля вайны не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”.

**К.: 55°26’57.8”N 30°39’52.8”E.**

*Літ. і К.: ДАВВ. – Ф. 520. Воп. 1. Спр. 269. Арк. 27. Населеныя пункты Віцескага раёна, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны разам з жыхарамі і не адноўленыя пасля вайны; ЗПГіКБ. Вв. – С. 187; Памяць: Віцебскі раён, 2004. – С. 228.*






*Помнік не захаваўся. Месца не выяўлена.*

## г.п. СУРАЖ, цэнтр сельсавета

**Помнік партызанам 1-й Беларускай партызанскай брыгады, якая дзейнічала ў гады Вялікай Айчыннай вайны.** Помнік узведзены ў 1987 г. У 1990 г. помніку нададзены статус помніка гісторыі і культуры. Зараз статусу не мае.

*Літ. і К.: Помнік партызанам Першай Беларускай партызанскай брыгады // Решение исполнительного комитета Витебского областного Совета народных депутатов от 27 декабря 1990 г. № 348 // О дополнении государственных списков недвижимых памятников истории и культуры местного значения.*

*Месца не выяўлена*

## в. ТАРАСЕНКІ, Запольскі сельсавет

**Месца баёў партызан.** У ваколіцах в. Тарасенкі базіравалася і вяла баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 1-я Беларуская партызанская брыгада (камандзіры – М.П. Шмыроў, Я.З. Захараў, камісары – Р.У. Шкрэда, Ц.Р. Кавалеўскі). У 1970 г. на ўсходняй ускраіне вёскі каля шашы Сураж – Веліж на ўспамін аб гэтых трагічных падзеях пастаўлена стэла.

**К.: 55°26’18.2”N 30°42’51.6”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 199.*

*Цагляны постамент з металічнай плітой стаяў каля крамы, потым каля канторы. У 2007 г. пры добраўпарадкаванні вёскі пастамент, які моцна быў разбураны, знеслі, пліту аддалі ў кантору. Помніка зараз няма. Неабходна аднавіць*



## II дадатак
## ВЯДОМЫЯ, АЛЕ ПА РОЗНЫХ АБСТАВІНАХ НЕ ВЫЯЎЛЕНЫЯ ПАХАВАННІ

У пошукавай практыцы сустракаюцца такія выпадкі, калі сведка ўказвае на месца пахавання салдат, але пры раскопках высвятляецца, што пахаваных там няма. Прычын гэтаму можа быць некалькі. За шмат гадоў моцна змяніўся ладншафт. Там, дзе раней быў лес – цяпер поле. Асушана балота, змяніў свой бег ручай, засохлі дрэвы, якія былі арыенцірамі пры пахаванні, поле ўзарана, перапахаванне было праведзена фармальна. Але загінуўшыя салдаты, найбольш верагодна, ляжаць там. Можа ў некалькім метрах, але пакуль мы іх не знайшлі. Лічым, што з часам прагрэс дазволіць нам выяўляць такія пахаванні. Біягеарадары ці выяўленне ступені сваяцтва па базе дадзеных ДНК могуць стаць звычайнай аперацыяй на працягу наступных 50 гадоў. На сённяшні дзень наша задача вызначыць, захаваць для нашчадкаў тыя месцы, якія пакуль не ўдалося дакладна адшукаць.

***

**в. БАРАВІНКА (не існуе). Магіла партызан Вінаградава і яшчэ двух невядомых.**

**К.(?): 55°20’02.4”N 30°10’41.4”E.**

***

**в. БАРАЎЛЯНЫ. Магіла сям’і Галуза.** У 1942 г. паліцаі за сувязь з партызанамі павесілі на ўласным падворку Марыю Галуза, яе маці, а маленькага сына расстралялі. Мясцовыя жыхары пахавалі іх непадалёк. У савецкія часы сваякамі была зроблена магіла, агароджана, пастаўлены помнік. У 2010-я магіла пры нівеліроўцы поля была разраўнана і зараз не існуе. Трэба выявіць месца і ці аднавіць магілу, ці перанесці астанкі ў іншае месца.

**К.(?): 55°19’04.7”N 30°06’01.1”E.**

*Літ. і К: Успаміны М.Х. Плавінскага, успаміны Ю.П. Ісачанка з в. Бараўляны; успаміны Галуза (сястры брата, чыю жонку павесілі, пражывае ў Мазалава).*

***

**в. БАРАЎЛЯНЫ. Месца гібелі яўрэяў.** Па звестках Галіны Хаванскай, у гады вайны ў Бараўлянскім возеры немцы тапілі яўрэяў.

**К.(?): 55°18’50.0”N 30°06’31.6”E.**

***

**в. ВЫСОКАЕ (не існуе). Магіла невядомага савецкага салдата** на беразе ручая, каля дарогі, што вядзе з ур. Талынава на месца былой в. Высокае. Месца вядома толькі прыблізна.

**К.(?): 55°19’54.4”N 30°10’29.8”E.**

***

**в. ГЕРАСІМАВА. Магіла савецкіх салдат.** На месцы, дзе стаяў дом № 36 па вул. Азёрнай, была магіла, у якой пахаваны савецкія салдаты, якія загінулі ў 1941 г. Пасля вайны тут быў пабудаваны дом. Пра пахаванне даведаліся, калі вырашылі паглыбіць склеп, але наткнуліся на косці, шынэлі. Чалавечыя косткі знаходзілі і пры ўзворванні агарода.

**К.(?): 55°21’59.4”N 30°04’08.1”E.**

*Літ. і К.: Паказанні П.П. Куксёнка, 1951 г.н.*

***

**в. ЛУЖАСНА. Магіла савецкіх салдат.** Некалькі салдат Чырвонай Арміі памерлі ад ран у палявым эвакуацыйным шпіталі летам 1944 г. і былі пахаваны побач. На жаль, месца невядома.

***

**в. ЛУЖАСНА. Магіла савецкіх салдат, загінуўшых 03–04.02.1942 г.** Фармальна перапахаваны на тэрыторыю саўгаса “Ціраспаль”. Зараз воінскае пахаванне № 2191.

**К.(?): 55°15’24.2”N 30°08’42.0”E.**

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195; Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984.*

***

**в. МАЗАЛАВА, была магіла партызана.** Каля дарогі, што вядзе ад школы да былога маёнтка “Мілае” (цяпер царква). Як толькі пачынаецца спуск з горкі, налева, першы дом, дзе жылі Курыленкі, а другі дом, у якім жылі Ганчаровы. Магіла была каля дарогі, на мяжы іх агародаў.

**К.(?): 55°16’41.8”N 30°08’20.4”E.**

***

**в. МАЗАЛАВА. Пахаванне ахвяр вайны каля сядзібнага дома “Мілае”.** Каля былой сядзібы І. Манькоўскага “Мілае” пасля вайны былі выяўлены астанкі целаў мірных грамадзян. Даследаванне не праводзілася.

**К.(?): 55°17’03.6”N 30°09’00.1”E.**

*Літ. і К.: Газін Д. Што адбылося [знаходка цел каля Мілага] // Ленінская праўда. – 1992. – 23 мая. – С. 2.*

***

**в. МАЗАЛАВА. Магіла камсамольца.** У так званым Старым Мазалава, сучасная назва “Зарэчкай”. Каля ручая, што ідзе з Калінава ў Лужаснянку. На горцы немцы злавілі камсамольца і расстралялі. Крыжа ніякага не было. Быў толькі магільны ўзгорачак.

***

**в. НІКАЛАЁВА. Магіла партызана Паўлючэнкава Мікіты.** На грамадзянскіх могілках. У маі 1943 г. М. Паўлючэнкава немецкія фашысты захапілі ў палон. Павялі на расправу. Па дарозе сустрэліся ягоныя дачкі – Ганна і Марыя. Ён паспеў падаць ім знак, каб яны яго не пазналі, бо расстралялі б як сваякоў партызана. Потым адзін немец ударыў яго кінжалам у спіну, другі стрэліў.

***

**г.п. СУРАЖ. У 1943–1944 гг. у раёне так званага Рыкавага ручая (раён вуліцы Кузнечнай) быў савецкі шпіталь.** Памерлых салдат хавалі па берагах ручая. Перапахавання не адбывалася.

***

**г.п. ЯНАВІЧЫ, цэнтр сельсавета. Месца загубы яўрэяў.** У сярэдзіне жніўня 1941 г. 150–200 мужчын былі расстраляны каля дарогі на в. Куракі. Месца магілы разраўняна і схавана. Зараз невядома.

*Літ. і К.: Шульман А.А. Место его уже не узнает. – Мн.: Медисонт, 2007. – С. 189.*



III дадатак

## ПОМНІКІ Ў НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ, ЯКІЯ ЎВАЙШЛІ Ў СКЛАД Г. ВІЦЕБСКА

**в. АРЭХАВА, Ноўкінскі сельсавет, з 2000 г. у межах г. Віцебска.** Помнік землякам, загінуўшым у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

***

**в. ПАЎЛАВІЧЫ, Ноўкінскі сельсавет.** Радзіма Даўбешкіна Пятра Лукіча. Герой Савецкага Саюза П.Л. Даўбешкін нарадзіўся 25.09.1912 г. у сялянскай сям'і. Член КПСС з 1931 г. У 1934 г. закончыў Віцебскі фінансава-эканамічны тэхнікум, у 1937 г. – Сумскую артылерыйскую школу. У Чырвонай Арміі з 1934 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Калінінскім, Бранскім, Цэнтральным і 1-м Украінскім франтах. Вызначыўся 22.09. 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра на паўднёвы захад ад Пераяслава-Хмяльніцкага. Мінамётны дывізіён на чале з гвардыі капітанам П.Л. Даўбешкіным першым дасягнуў правага берага і адкрыў агонь па ворагу. Было адбіта 8 варожых контратак, знішчана каля 5 рот гітлераўцаў. Загінуў 03.10.1943 г. ў баі. Пахаваны ў с. Тамань Кіеўскай вобл. 17.11.1943 г. П.Л. Даўбешкіну прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. На доме, дзе нарадзіўся П.Л. Даўбешкін, і на будынку школы ў в. Ноўка, у якой вучыўся, устаноўлены мемарыяльныя дошкі.

Будынак дома знішчаны ў 2012 г. разам з вёскай у сувязі з яе ліквідацыяй і ўключэннем у склад г. Віцебска. Лёс мемарыяльнай шыльды невядомы.

*Літ. і К.: ЗПГіКБ. Вв. – С. 195; Навечно в сердце народном. – 3 изд. – Мн., 1984.*

***

**в. ПАЎЛАВІЧЫ, Ноўкінскі сельсавет.** У вёсцы, каля дарогі знаходзілася магіла невядомага салдата, які загінуў у 1941 г. Знішчана ў 2012 г. у час руйнавання вёскі.

*Літ. і К.: Спачатку спалілі вёску, потым знішчылі магілу невядомага салдата // https://naviny.com/local/2015/06/16/320/index.html.*

# КАРТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

## З УКАЗАННЕМ АСНОЎНЫХ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ



# СПІС АБ'ЕКТАЎ, ЗАНЕСЕНЫХ У ЗБОР ПОМНІКАЎ, ПАХАВАННЯЎ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

**1. аг. Акцябрская, Акцябрскі с/с.** Мемарыяльны знак у гонар 293-га артылерыйскага палка Рэзерва Галоўнага камандавання.

**2. аг. Акцябрская.** Алея Памяці імя Героя Савецкага Саюза Пятра Васільевіча Шысцерава.

**3. в. Альгова, Бабініцкі с/с.** Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4389.)

**4. в. Аржавухава (не існуе), Суражскі с/с.** Месца спаленай вёскі.

**5. в. Арэхі.** Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4442).

**6. в. Арэшанкі, Задуброўскі с/с.** Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4405).

**7. в. Арэшанкі.** Магіла Таланава Мікалая Пятровіча (№ 4406).

**8. в. Асінаўка, Шапечынскі с/с.** Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 4444).

**9. в. Астраўскія, Курынскі с/с.** Брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму (№ 4415).

**10. в. Астраўскія.** Месца базіравання штаба 1-й Беларускай партызанскай брыгады.

**11. в. Астраўскія.** Помнік партызанам Вялікай Айчыннай вайны (ур. Паўлавічы).

**12. аг. Бабінічы, цэнтр с/с.** Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4388).

**13. аг. Бабінічы.** Індывідуальная магіла (№ 5716).

**14. аг. Бабінічы.** Помнік вучням і настаўнікам.

**15. аг. Бабінічы.** Памятны знак на месцы калодзежа, у які фашысты скідвалі закатаваных патрыётаў.

**16. аг. Бабінічы.** Радзіма Курыленкі Уладзіміра Цімафеевіча.

**17. аг. Бабінічы.** Радзіма Васілеўскага Ягора Васільевіча.

**18. аг. Бабінічы.** Сад Перамогі.

**19. в. Бальшухі, Вымнянскі с/с.** Вайсковыя могількі. Брацкая магіла (№ 4460).

**20. в. Бальшухі.** Магіла сям'і Кузьміных.

**21. в. Баранаўка, Мазалаўскі с/с.** Магіла Багданава Аляксея Герасімавіча (№ 7873).

**22. в. Бараўляны, Мазалаўскі с/с.** Месца гібелі савецкіх ваеннапалонных і месца былога фашысцкага канцлагера.

**23. в. Бараўляны.** Мемарыяльныя крыжы на месцы гібелі мірных жыхароў.

**24. в. Баронікі, Ноўкінскі с/с.** Доўгачасовыя агнявыя кропкі.

**25. в. Барышына, Акцябрскі с/с.** Брацкая магіла савецкіх воінаў (№ 5714).

**26. в. Будзіслава, Курынскі с/с.** Брацкая магіла (№ 6674).

**27. в. Будзянка, Суражскі с/с.** Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (№ 4440).

